№ 20 (330) 30 траўня 2003 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Бэрлінская опэра на вершы Быкава

А.Лукашэнка зноў даў асечку на культуры.

старонка 11

Тэрмінова ў нумар: шок

Міністэрства інфармацыі прыпыніла на тры месяцы выхад «Белорусской деловой газеты». Гэтае рашэньне было прынятае паводле прадстаўленьня Генэральнай пракуратуры, якая рэкамэндавала неадкладна спыніць публікацыю газэты. Міністэрства інфармацыі спасылаецца на артыкулы 5 і 16 Закону аб друку: у артыкулах «Панскі імідж» і «Дзе лявонаўскія мільёны» міністэрства ўбачыла абразу кіраўніка дзяржавы ў адным і публікацыю матэрыялаў сьледзтва і суду да сканчэньня справы ў другім. Выдавец «БДГ» Пятро Марцаў аспрэчвае вынесеныя газэце папярэджаньні і абяцае, што газэта ўсё ж выйдзе на наступным тыдні. Журналісты рыхтуюць аўторкавы нумар. Чацьвяргоўны нумар «БДГ» зьявіўся толькі ў Інтэрнэце (www.bdg.by). Мы будзем інфармаваць чытачоў пра разьвіцьцё сытуацыі.

Бульба выбухае

IREX-PROMEDIA

Палітычны расклад-2003 і пэрспэктывы-2006

Магчыма, разам з пытаньнем пра падаўжэньне прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў на плебісцыт будзе вынесенае пытаньне аб інтэграцыі Беларусі ў Эўразьвяз. Такі варыянт перастаў быць неймаверным з таго моманту, як стаў ясны правал гульняў з «канстытуцыйным актам саюзнай дзяржавы».

Хоць улада мае неабмежаваную колькасьць сцэнараў кіраваньня сытуацыяй, у доўгатэрміновай пэрспэктыве Беларусь непазьбежна чакае эпізод палітычнай і сацыяльнай нестабільнасьці, нават хаосу, бо цяперашняя сыстэма не гарантуе перадачы ўлады пераемніку і зьмены пакаленьняў.

Аналіз палітычнае сытуацыі ў артыкуле Віталя Сіліцкага «Палітычны расклад-2003 і пэрспэктывы-2006» на старонках 6—7, камэнтар Паўла Севярынца пра бягучы палітычны момант на старонцы 2, замежнапалітычны кантэкст у ацэнках Зьдзіслава Найдэра — старонка 4.

Пра нацыянальную выключнасьць беларусаў,

якая заключаецца ў тым, каб ня быць падобнымі ні на адзін нармальны народ сьвету, а найперш — каб ня быць падобнымі на сябе саміх

«Любі чужое аж да пакланеньня, сваё любі — да самазабыцьця», — сказаў паэт. Так яно ў нас і было за савецкім часам. Праўда, з усяго чужога пакланяліся мы толькі Расеі, яе *вялікай* культуры, яе *праўдзівай* гістарычнай дактрыне, яе *магутнай* мове. Але і сваё — любілі. Часам літаральна — да самазабыцьця, гэта значыць забываючы родную мову, гісторыю і культуру. Так было да 1995 году, да першага рэфэрэндуму, калі ўсё дзяржаўнае ў нас стала люстэркам прыватных густаў Аляксандра Лукашэнкі. Зь ягоным прыходам сваё любіць перасталі. Сваё нараклі чужым, нацыяналістычным, бээнэфаўскім і ўжо ніяк не дзяржаўным. Затое да самазабыцьця закахаліся ў Расею, яе культуру, яе гістарычную дактрыну, яе мову.

У нас як нацыі і ў нашай дзяржавы цяпер нічога свайго няма. Мы вызваліліся ад яго гэтаксама, як ад свайго навязьлівага вясковага паходжаньня вызваляліся нашы гараджане першага пакаленьня. Яны ўсімі сіламі імкнуліся «разгаварываць па-гарадзкому» і страшна саромеліся, калі ў іхнай гаворцы праскокваў беларусізм. Ці ня кожны беларус майго пакаленьня згадае, як цяжка пасьля летніх канікулаў, праведзеных у вёсцы, зь яго выбівалі гэтыя мілыя «г» і «ч», што імгненна прыставалі да языка, нібы пакліканыя аднекуль з глыбіні нашых дзіцячых душ.

Працяг артыкулу Сяргея Дубаўца на старонцы 2.

СКАНДАЛ

Коласа гоняць зь ліцэю Коласа

У Нацыянальным дзяржаўным гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа сумятня. 28 траўня намесьнік міністра адукацыі Казімер Фарына прадставіў выкладчыкам новую дырэктарку — Тамару Шчарбачэвіч. Паводле загаду міністэрства, яна распачынае працу з 29 траўня. Стваральнік і нязьменны кіраўнік ліцэю Ўладзімер Колас можа пакінуць ліцэй.

Фактычна У.Колас выконваў дырэктарскія абавязкі, але фармальна лічыўся намесьнікам дырэктара — такія былі ўмовы джэнтэльмэнскага пагадненьня між ліцэем і былым міністрам Стражавым, складзенага пад ціскам сумнапамятнага Замяталіна.

Паводле словаў К.Фарыны, агулам міністэрства разглядала 10 кандыдатураў на пасаду дырэктара. Была сярод іх і кандыдатура У.Коласа, але яна «не задаволіла кіраўніцтва». Т.Шчарбачэвіч нарадзілася ў Койданаве, мае дзьве вышэйшыя адукацыі: культасьветработніцы (БУК) і гісторыка (БДПУ імя Танка). Працавала настаўніцай, потым намесьніцай дырэктара СШ №68, кіравала СШ №172. Паўтара году таму стала начальніцай аддзелу прагназаваньня разьвіцьця адукацыі пры абласным мэтадычным кабінэце.

Новая кіраўнічка прыйшла ў ліцэй пад самае заканчэньне навучальнага году, што вялікая рэдкасьць. Праўдападобна, гэта вынік раздражненьня дзейнасьцю Ўладзімера Коласа, які за апошні час зладзіў Усебеларускі сход інтэлігенцыі і ўвайшоў у аргкамітэт руху «За годнае жыцьцё».

Канфлікт мае даўнія карані: яшчэ ў 1998 г. чыноўнікі хацелі забраць у навучальнай установы будынак і памяняць кіраўніцтва, але навучэнцы з бацькамі распачалі доўгую кампанію пратэсту і перамаглі. Пяць гадоў доўжылася замірэньне: улады не чапалі гэтай узорнай беларускамоўнай установы, што рыхтуе гуманітарную эліту, але пасада дырэктара заставалася вакантнай.

У сераду адбылася сустрэча новапрызначанай дырэктаркі з настаўнікамі. Т.Шчарбацэвіч паказала сябе ня самым прывабным чынам. Гаварыць па-беларуску ёй было складана — зьбівалася на расейскую, а на закіды адказвала: «У нас в государстве двуязычие, и его никто не отменял». Да гэтага візыту яна ні разу не была ў ліцэі й нават не азнаёмілася з статутам установы.

Адзін зь ліцэістаў сказаў мне: «Нам зьмены недаспадобы. Колас файны дзядзька. У чацьвер мы разьвесім па ўсім ліцэі лёзунгі «Чужая мачыха горшая за роднага бацьку». Для Міністэрства гэта можа стаць неспадзяванкай. Разьвязваючы пытаньне пры канцы траўня, яно яўна разьлічвала, што перад экзаменамі ліцэісты не заварушацца.

Выкладчыкі ўспрынялі ў штыхі прызначэньне чалавека, чужога нацыянальнай культуры і традыцыям, што складаюць зьмест навучаньня і дух ліцэю. На іх думку, Мінадукацыі дзеля нейкіх сваіх кабінэтных разборак правакуе зрыў выпуску элітнае нацыянальнае школы, сьведама падсылаючы кіраўніком неспэцыяліста ў гарачы экзамэнацыйны час.

Улады хацелі б падштурхнуць выкладчыкаў да арганізаванага групавога сыходу з установы, мяркуючы, што сьледам за імі сыдуць і вучні-завадатары. Такая задача спрашчаецца тым, што ў ліцэі ня больш за 15 штатных выкладчыкаў, астатнія 20 — сумяшчальнікі, выкладчыкі ўнівэрсытэтаў, супрацоўнікі Акадэміі навук, якія і складаюць галоўны навуковы патэнцыял ліцэю, але фінансава ад выкладаньня на Кірава, 21 ня дужа залежаць.

У цяперашняй сытуацыі, на думку У.Коласа, апошняе слова павінна быць за выкладчыцкім калектывам ліцэю. Сам заснавальнік кажа, што прыме волю калегаў. Але пры гвалтоўным прызначэньні новага дырэктара Колас сыдзе.

На бацькоўскім сходзе выраша на зьвярнуцца да прэм'ера Навіцкага з просьбай адмяніць загад Міністэрства. Бацькі мелі распачаць пратэсты ў чацьвер. А галоўнае слова, паводле Статуту, — за Радай ліцэю, у якую ўваходзяць і выкладчыкі, і бацькі, і вучні. Менавіта яна ў 1998 г. прыняла рашэньне аб масавым пратэсце.

Аркадзь Шанскі

Пра нацыянальную выключнасьць беларусаў

Працяг са старонкі 1.

Сёньня мы — самая ўнікальная нацыя ва ўсім цывілізаваным сьвеце. Мы з такой лёгкасьцю зьнішчаем уласную спадчыну, нібы тыя камсамольцы-бязбожнікі, што ў 30-я гады руйнавалі цэрквы і выкідалі з бацькоўскіх хат абразы. У параўнаньні з тымі ж расейцамі ці палякамі, латышамі, літоўцамі, украінцамі (усе — нашы суседзі) мы ўсё робім наадварот. Можа быць, гэткая ўнікальнасьць і дае нам падставы для гонару, але ці лепей мы ад гэтага жывём? Ці ясьней за тых жа суседзяў бачым будучыню — сваю і сваіх дзяцей? Ці пачуваемся багатымі — духоўна і матэрыяльна? Ці болей нас шануюць у сьвеце?

Свая мова, гісторыя і культура — у прынцыпе, толькі гэтым розьніцца цывілізаваны народ ад таго, які — не зусім. Гэта значыць, усе нашыя суседзі — ад нас. Можа быць, мы вылучаемся нейкай новай рэвалюцыйнай тэорыяй і заўтра ўвесь сьвет зразумее наша самаадрачэньне ды кінецца таксама заганяць свае мовы і культуры ў апазыцыю ды перапісваць свае гісторыі так, каб сабе самім там адводзілася самае ўбогае і непрывабнае месца? Тады — у нас вялікая місія. А мэсіям заўжды няпроста. І трэба цярпець. Наўрад ці нам пашчасьціць жыць у тым «сьветлым заўтра». Таму застаецца спадзявацца на ўнукаў, якія пабачаць... Зрэшты, што яны пабачаць пасьля нас, сваіх дзядоў, калі мы самі пасьля сваіх ва ўпор ня бачым нічога? Мы самаадракліся, закладаючы гэткі прынцып паводзінаў на ўсю будучую гісторыю, на ўсіх сваіх унукаў, якім нічога не застанецца, як самаадрачыся сьледам. А гэта значыць, што і яны жыць будуць ня лепей за нас — ані духоўна, ані матэрыяльна.

Вы скажаце — гэта ж тупік! Што нам замінае быць такімі, як усе, — нармальнымі, пасьпяховымі, багатымі і паважанымі, прынамсі сярод суседзяў? Нам замінае ўсенародны рэфэрэндум 1995 году, калі мы адракліся ад сваіх спадчынных каштоўнасьцяў — роднай мовы, самадастатковай гісторыі і культуры. Нам замінае дзяржаўная палітыка, што абапіраецца выключна на ірацыянальныя хоцькі-няхоцькі аднаго чалавека. Нам замінае акадэмічная навука, што тыя хоцькі-няхоцькі абгортвае ў форму навукападобных сэнтэнцыяў.

Апошні прыклад — артыкул акадэміка Падлужнага, дырэктара Інстытуту мовазнаўства, у часопісе «Беларуская думка», які менавіта такімі сэнтэнцыямі стракаціць: «Кожнаму з тых, хто зьяўляецца шчырым прыхільнікам беларускай мовы, неабходна абмежаваць свае жаданьні распаўсюдзіць яе ўжываньне ва ўсіх сфэрах, а толькі ў тых, дзе можна дасягнуць поспеху ўжо сёньня»...

Інакш кажучы, акадэмік прапануе «шчырым прыхільнікам» абмежаваць сваю «шчырую прыхільнасьць». Мне гэта нагадала колішнюю рэкамэндацыю А.Лукашэнкі беларускаму народу — устрымацца ад ужываньня мяса. А яшчэ я паспрабаваў уявіць сабе такую фразу, зьвернутую да любога з нашых суседзяў — латыша, літоўца, паляка, расейца, украінца. Рэакцыяў магло б быць толькі дзьве: чалавек нічога не зразумеў і паглядзеў на акадэміка як на дзівака; чалавек адказаў неакадэмічным словам, жэстам або рукам. У нас жа сэнтэнцыя надрукаваная ў прэзыдэнцкім часопісе і зьяўляецца настойлівай рэкамэндацыяй для тых, хто праводзіць дзяржаўную палітыку.

Ну, а што адказаў бы акадэміку беларус? Напрыклад я. Я — «шчыры прыхільнік», хоць мне зусім не падабаецца, што спадар Падлужны дае нейкую кваліфікацыю звычайнаму носьбіту беларускай мовы, які карыстаецца ёю дома, зь дзецьмі і ў дачыненьнях зь дзяржаўнымі службамі. Ёсьць, ведаеце, такія людзі, што не пайшлі на самаадрачэньне. І як гэта ні дзіўна, але пачуваюцца яны нармальнымі людзьмі. Тут акадэмік Падлужны нагадаў мне расейскага турыста ў Парыжы, які, пабачыўшы французкае дзіця, зьдзіўлена ўсклікнуў: «Такой маленький, а уже по-французски говорит!»

Нас, «таких маленьких», у Беларусі зусім нямала. І галоўная праблема наша — якраз у дачыненьнях зь дзяржаўнымі «сфэрамі». Калі беларускі службовец ня здольны на наш, грамадзянаў Беларусі, зварот па-беларуску адказаць на дзяржаўнай беларускай мове. Спадар Падлужны прапануе нам зь пэтэтам ставіцца да элемэнтарнага невуцтва выпускнікоў беларускіх школаў на дзяржаўных пасадах. Гэта як бы ў савецкія часы нам прапаноўвалі маліцца на папулярную таблічку «Ушла на базу». Па вялікім рахунку, менавіта чынавенскае невуцтва прычыняе нам, беларускамоўным, найбольш нязручнасьцяў ва ўласнай краіне. Астатняе — садкі і школы, кнігі і газэты — мы ствараем сабе самі, нават пры тым неверагодным ціску, які робяць на нас дзяржаўныя органы. Але Бог зь імі. Перажывём. Толькі ня трэба прымушаць нас самаабмежаўвацца. Мы на гэтай зямлі дома. Лягічна было б самаабмежавацца прадстаўнікам іншых моваў і культураў, у якіх ёсьць мэтраполіі. У беларусаў іншае мэтраполіі няма.

Зрэшты, я зусім не пра тых палякаў ды ўкраінцаў, што жывуць у Беларусі, і не пра расейцаў, якія ў нас — вышэй за ўсіх, самыя прывілеяваныя. Я нават не пра тое, што родную мову трэба было б неяк паважаць, прынамсі ў акадэмічным Інстытуце мовазнаўства. Я пра тое, што шлях нацыянальнае выключнасьці, якім Беларусь ідзе на чале з А.Лукашэнкам, прывёў нас у цывілізацыйны тупік. І ўсё болей людзей у Беларусі разумеюць, што наша краіна і дзяржава — стаяць на месцы. Каб рушыць далей, варта перастаць быць самымі разумнымі і пачаць жыць паводле агульнапрынятых законаў, прыярытэтаў і каштоўнасьцяў. Як гэта ні цяжка — жыць нармальна.

Сяргей Дубавец

(Пнэў)манія

SARS — ня проста хвароба, SARS — гэта палітыка. Пацярпеў Кітай: кітайскія тавары імкліва сталі губляць папулярнасьць. Межы з Кітаем перакрылі ўсе ягоныя суседзі. Апошняй на гэта наважылася Расея. Але ці могуць расейскія памежнікі рэальна кантраляваць тысячы кілямэтраў тайгі?

Пагроза атыповай пнэўманіі палохае ня толькі найбліжэйшых суседзяў Кітаю. Італія (дзе яна, а дзе Кітай? Глябалізацыя, што ні кажы) гатовая выйсьці з Шэнгенскага пагадненьня. Лідэр БНФ Вінцук Вячорка заклікаў узмацніць кантроль на мяжы з Расеяй: маўляў, адтуль да нас можа прыйсьці «зараза».

Пачалі зьяўлятца меркаваньні, што хваробу распрацавалі ў нейкіх сакрэтных лябараторыях нейкія сакрэтныя спэцслужбы. Во ўжо дзе ня трэба ніякага доказу — называй толькі краіну, якая табе асабіста найменш сымпатычная! Дзякаваць богу, ганконгаўскія навукоўцы высьветлілі: крыніца вірусу — зьвяркі зь сям'і вівэравых (кшталту мангуста). Кітайцы ядуць іх, як і сабак, зьмеяў, хоць санітарны закон гэта й забараняе. «Можна есьці ўсё, што мае чатыры нагі, акрамя сталоў», — кажа прымаўка з паўднёвакітайскай правінцыі Гуандун. Для лепшага смаку вівэраў кідаюць у чыгун жывымі. А гэта негігіенічна.

Эбала перайшла са зьедзеных малпаў, SARS — зь нейкіх невядомых нашай мове зьвяркоў. У глябальным сьвеце любая трасца зразу становіцца глябальнай пагрозай.

Але SARS — гэта ня толькі палітыка. Атыповая пнэўманія чарговы раз паставіла пад пытаньне лібэральныя каштоўнасьці заходняга (нашага!) сьвету. Ксэнафобія — спрэс! Ролю «ахвярнага казла», якую 15 гадоў таму выконвалі хворыя на СНІД, сёньня адыгралі кітайцы. І разумееш супрацоўніцу аднаго з студэнцкіх інтэрнатаў БДУ, якая скардзіцца на журналістаў: «Апанавалі, не давалі продыху ўвесь дзень. Усё распытвалі, ці правяраем мы тут пасылкі з Кітаю тым студэнтам, якія вучацца ва ўнівэрсытэце».

SARS — хвароба глябальная.

Адам Воршыч

Бульба выбухае

На Сяргея Скрабца завялі крымінальную справу, Уладзімера Парфяновіча публічна папярэдзілі, каб рыхтаваўся, а генэралу Фралову недвухсэнсоўна прыгадалі генэрала Захаранку. Апазыцыя сочыць за тым, як у палатцы цкуюць нязгодных, зь лёгкай грэблівасьцю й зласьлівасьцю. Між тым паспаліты люд прымае «новенькіх» у разрад «нашых» — цяпер толькі й гаворкі, што аб той «Рэспубліцы», новым руху ды прэзыдэнцкіх плянах дэпутатаў.

Гэта ж колькі намэнклятурнікаў рэжым, высільваючыся, ужо перакаваў у зацятых апазыцыянэраў і нацыяналістаў! Дырэктары прадпрыемстваў і калгасаў, міністры й дыпляматы. Мечыслаў Грыб, Сямён Домаш, Уладзімер Ганчарык, Васіль Лявонаў. Кляська — Сямён Шарэцкі. Позьні Шарэцкі выдаваў такое, на што не рашаўся й Пазьняк. Чыгіроў «мачылі» доўга й мэтадычна — самога, жонку, сына — і зрабілі з былога прэм'ера героя-пакутніка. Цяпер вось — Скрабец, Парфяновіч, Фралоў.

Калі ўлада дзяўбе канкрэтнага беларуса, да нацыянальнае сьвядомасьці й асабістае годнасьці даходзіць па меры болю. Увогуле, ціск на беларусаў выяўляе строгую заканамернасьць. Калі цясьніць, шчаміць патроху — беларус церпіць, сьціскаецца й сядзіць сабе ціха. Але калі душаць зьнянацку, сякуць сходу, калі заганяюць у глыбіню душы ды там яшчэ й топчуць — вы маеце ўсе шанцы пабачыць грымоты й маланкі, што разгортваюцца з навальнічнай хуткасьцю. Беларус, якога дасталі, — страшнае відовішча. Кшталту магілёўскага паўстаньня 1661 г., партызанкі або сутычак дэманстрантаў і амонаўцаў, якія аднолькава зьвярэюць падчас Дня Волі.

«Беларусы падымуцца? Кінь — бульба не выбухае!» — у роспачы казаў мне калісьці гарадзенец Андрусь Мялешка. Так, пакуль варыцца на малым агні, толькі булькае й не выбухае. Эканоміка дохне паволі, інтэграцыя паўзучая, апазыцыя ніякая. Безнаяўны рубель? Ды яго нават ніхто ня бачыў. Палатка прымае закон, каб беларусы маглі ваяваць за мяжой? Што яна такое, тая палатка… Кагосьці зноў забаранілі ці забілі? Бач, выткнуўся адзін і атрымаў — ведаў, на што ідзе.

Што можа змусіць беларусаў да масавага выбуху, як у 1991-м, 1994-м? Халодная зіма бяз Чаркі ды Скваркі, затое з новымі камунальнымі тарыфамі? Акрэсьціна, Валадарка, Курапаты? Рэфэрэндум аб трэцім тэрміне? Яшчэ цікавей, што такое павінны зрабіць у Крамлі, каб дастаць беларускага нацыяналіста ў Лукашэнку. Мухаў, катлетаў і газавае атакі аказалася недастаткова, хаця некаторы прагрэс, пагадзіцеся, заўважны.

Выглядае, што галоўным супернікам Аляксандра Рыгоравіча й бясспрэчным лідэрам апазыцыі стане той беларус, якога дастануць да дна. Уяўляеце сабе ў гэтае ролі, напрыклад, аліміпійскага чэмпіёна па веславаньні? Тут і клюшка, бадай, не дапаможа.

...Дарэчы, наконт бульбы. Калі яе моцна высушыць і сьцерці ў парашок да крухмальнага пылу — выбухне проста ў сумесі з паветрам. Ад аднае іскры.

Павал Севярынец

Расейская пагроза Гомелю

Лятальныя талеркі па-ранейшаму атакуюць украіны Гомелю. «Беларусь сегодня» ня грэбуе гарачанькай зьвесткаю пра тое, што ў паўночным крыле палацу Румянцавых-Паскевічаў жыве (губа ня дура) «астральная істота з космасу». Ня ведаю, ці вядуць касьмічныя засланцы вайну за Гомель. Але штодня адчуваецца змаганьне за родны горад іншых, зусім зямных, сілаў. Увесь час здаецца, што расейцы хочуць адарваць першай менавіта нашую частку Беларусі.

У цэнтральных газэтах апошнім часам модным стала *любіць Беларусь*. У тутэйшых жа пэрыёдыках спрэс і побач — *русский, российский, московский, отечественный...* З нумару ў нумар. Апэратарскі пэйджынгавых станцыяў, спасылаючыся на суровы наказ начальства, ня хочуць прымаць паведамленьні ў беларускай. Мясцовыя FM-станцыі самазабыўна малпуюць адлучаныя кагадзе маскоўскія. На адной зь іх адсутнасьць у этэры беларускай мовы тлумачаць «жаданьнем спонсара». На другой ніяк не маглі дапяць, чаму гэта заганна круціць песьню пра Пуціна, калі яна «нават нам самім падабаецца». Па горадзе разьвешваюць расейскамоўныя шыльды.

Улады чамусь не «асаджаюць пугаўём» гэтае паставойцтва, хаця самі спрабуюць фармаваць нейкую гарадзкую традыцыю. Навобмацак рухаюцца ў цямрэчы, бо мала што пра гісторыю і «так называемую спадчыну» ведаюць.

Грамадзкія арганізацыі другі год ці то ня могуць ачомацца ад *9.09.01,* ці проста здаліся перад расейскім патопам. Прынамсі, дзейнасьць многіх зь іх заўважыць надта праблематычна. Міжволі згадваюцца 1998—99 г., як апатэоз іх актыўнасьці — ня толькі кулюарна-сэмінарскай, але й публічнай, якая запомнілася правядзеньнем разнастайных канцэртаў ды вечарын. Сёньня гэта чамусь (мабыць, грошай няма) запрапала. Выняткі (канцэрт «Старога Ольсы», вечарына да ўгодкаў БНР) вельмі рэдкія і расхістаць цяперашні расейскі фармат Гомелю няздатныя. Неабходная сыстэматычнасьць. Хай гэта будзе кропля, але яна мусіць ці не штодня тачыць той закляты камень. У гэтым пляне аптымальнай выглядае пазыцыя гомельскай «Талакі». Арганізацыя рэгулярна ўказвае сваю прысутнасьць у гарадзкім жыцьці, у партнэрскіх дачыненьнях зь мясцовымі ўладамі па канкрэтных справах, важных для ўключэньня Гомелю ў беларускі кантэкст. Гэтае кантактаванае ані не зьмяняе прынцыпова беларускіх пазыцыяў талакоўцаў.

Гомелю не стае сваёй нармальнай беларускай газэты. Недзяржаўным арганізацыям па-ранейшаму выгодна разьменьвацца на бюлетэньчыкі *«дзьвесьце дзевяноста дзявяткі»* зь няпэўнай аўдыторыяй і накладам 299 ас. Ранейшыя цікавыя праекты зьніклі, не атрымаўшы разьвіцьця. Няма цяперака ў Гомелі выданьня, якое б распавядала па-беларуску пра панкаў, кіслотнікаў, рэпэраў, пра сэкс урэшце, што ў 1999—2001 г. рабіў «Undergroўnd». Адкуль чакаць прыходу новых сілаў, амаладжэньня, калі дзеці сталеюць у горадзе, дзе нават візуальна адсутнічае Беларушчына? Спадзявацца на такіх апантанцаў-настаўнікаў, як ваш пакорлівы слуга, наўрад ці выпадае. Мукі бо з таго зерня, што спрабуем змалоць на жорнах Беларушчыны, вобмаль. Спрацоўваюць фактары адчужэньня, дый бацькоўскія стэрэатыпы палымнеюць у глуздох малых. Як у дрэнным фільме, застаюцца спадзевы на дзяржаву, на яе новы ідэалягічны нахіл, з каторага трэба няшчадна карыстаць у працы для Беларусі цэлай і для Гомелю ў прыватнасьці.

Сяргей Балахонаў, Гомель

Дыялёг па-расейску

26 траўня ў Менску на нэўтральнай тэрыторыі, па-за судовай заляй, сустрэліся прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі і няўрадавых арганізацыяў. Тэма арганізаваных імі Грамадзкіх слуханьняў — ліквідацыя шэрагу ГА, распачатая Мінюстам. Абмеркаваньне было эмацыйнае. Ня ў прыклад выніковай рэзалюцыі.

IREX-PROMEDIA

Міхал Сухінін упэўнены, што ніхто ня можа яго абвінаваціць у хлусьні.

Мінюст знайшоў парушэньні ў дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў «Ратуша» (Горадня), «Грамадзянскія ініцыятывы» (Гомель), «Варута» (Баранавічы) і «Моладзевы хрысьціянска-сацыяльны саюз». У траўні суды пачалі разглядаць справы па іх ліквідацыі (акрамя МХСС, дата суда якога яшчэ ня вызначана), ды ўсе былі паадкладаныя. У часе «перадышкі» ініцыятыва «Наша салідарнасьць» і правяла Грамадзкія слуханьні, каб наладзіць дыялёг паміж Мінюстам ды «трэцім сэктарам» і ўратаваць ад ліквідацыі найбуйнейшыя грамадзкія аб'яднаньні Беларусі.

Дыялёг той вёўся ў асноўным па-расейску. «Другой дзяржаўнай» гаварыла Алена Танкачова, старшынька праўленьня ГА «Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў», што вяла слуханьні. Ня ў прыклад ёй, начальнік упраўленьня грамадзкіх аб'яднаньняў Мінюсту Міхал Сухінін на беларускамоўныя пытаньні адказваў па-беларуску. Зьяўленьне гэтага ўрадоўцы падвысіла статус мерапрыемства і дадало яму жывасьці. Астатнія запрошаныя чыноўнікі слуханьні праігнаравалі.

Сухінін спрабаваў пераканаць прысутных, што дзеяньні адразу супраць чатырох грамадзкіх аб'яднаньняў — «гэта зьбег абставінаў». Чыноўнік прыводзіў пераканаўчы аргумэнт: «Вы ведаеце мяне не адзін год, і ніхто ня можа мяне абвінаваціць у хлусьні». Толькі большасьць слухачоў у шчырасьць М.Сухініна не паверылі. Кіраўнік «Вясны» Алесь Бяляцкі тлумачыў сёлетнюю «зачыстку» жаданьнем дзяржавы «ўзяць пад кантроль гэты грамадзкі сэктар жыцьця», паслабіць або раскалоць яго напярэдадні прыняцьця Кангрэсам ЗША Акту пра дэмакратыю ў Беларусі.

«Пэўныя таварышы бачаць у нас крыважэрнага зьвера, які нікому ў рэспубліцы не дае жыць», — крыўдаваў М.Сухінін. Паводле ягоных словаў, Мінюст дасьць грамадзкім аб'яднаньням палёгку падчас рэгістрацыі, а замест ліквідацыі пачне практыкавацца прыпыненьне дзейнасьці арганізацыі — зноў жа праз суд. Але калі тое будзе — невядома. А пакуль Мінюст не шкадуе пісьмовых папярэджаньняў і сёлета зрабіў іх аж 33.

Тым ня менш, аптымісты з ініцыятывы «Наша салідарнасьць» разглядаюць Грамадзкія слуханьні як «першы публічны крок да дыялёгу з уладамі». Імкненьне да «сталага дыялёгу паміж няўрадавымі арганізацыямі і дзяржаўнымі органамі» было адлюстравана і ў прынятай рэзалюцыі.

Алег Тачоны

Баўгарская прэса пра візыт Шэймана

Генэральны пракурор Віктар Шэйман з 19 да 23 траўня знаходзіўся з афіцыйным візытам у Баўгарыі. Адзін з самых уплывовых людзей рэжыму наведаў краіну, якая ўступае ў NATO і Эўразьвяз. Апошнім часам кантакты між прадстаўнікамі беларускай адміністрацыі і краінамі Захаду пачасьціліся.

Шэймана запрасіў у Сафію баўгарскі калега Мікола Філчаў. Досьвед Шэймана, відаць, уразіў гаспадароў. Як піша «Пари», адразу ж пасьля перамоваў у баўгарскай пракуратуры пачаліся пераўтварэньні «на беларускі ўзор». Там зьявіўся новы аддзел, што мае займацца выключна карупцыяй сярод вышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў. Аддзел барацьбы з карупцыяй існаваў у пракуратуры і раней, але яго «кліентамі» былі ўсе грамадзяне краіны, а ня толькі ўладцы. «Віктар Шэйман падвёў свайго калегу да гэтай ідэі. Беларуская пракуратура даўно стварыла такі аддзел. Летась быў арыштаваны дэпутат, што быў адначасова міністрам чыгуначнага транспарту. Сёлета распачатыя крымінальныя справы супраць двух дэпутатаў, распавёў Шэйман. Генэральны пракурор Беларусі мае права санкцыяваць арышт народных дэпутатаў, нават не зьвяртаючыся да парлямэнту», — адзначае інтэрнэт-выданьне «Сэга».

IREX-PROMEDIA

Стварэньнем аддзелу баўгарскі пракурор не абмежаваўся. М.Філчаў прапанаваў унесьці зьмены ў судовае заканадаўства Баўгарыі, якія б пашырылі паўнамоцтвы пракуратуры дзеля «барацьбы са злачыннасьцю» і «інфармаваньня грамадзкасьці пра дзейнасьць пракуратуры». Баўгарская прэса і ў гэтым бачыць беларускі сьлед. «Гэта ў каго ж мы вучымся дэмакратыі!!!» — лямантуе камэнтатарка тыднёвіка «Струма». У адказ у інтэрнэт-гасьцёўні тыднёвіка нейкі чытач адзначае: а што хацець ад Філчава і кампаніі, таварышамі якіх зьяўляюцца «cherveni drugari i lainari» ўсяго сьвету.

Сяргей Радштэйн

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Стандарты жыцьця

Саўмін зацьвердзіў сьпіс з 44 дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў — арыенціраў, на якія будзе трымаць курс урад. Гэтак, выдаткі на жыльлё мусяць складаць 25% сямейнага бюджэту. 80% вуліцаў павінны быць асьветленыя. Выдаткі на ахову здароўя на чалавека ў сярэднім мусяць складаць 171 тыс. рублёў. Спачатку стандарты будуць ажыцьцёўленыя ў адным раёне на кожную вобласьць, потым — па ўсёй краіне. Пашчасьціць сьпярша жыхарам Верхнядзьвінскага, Пружанскага, Нараўлянскага, Клецкага, Карэліцкага ды Асіповіцкага раёнаў.

Кувэйцкі крэдыт для ЦЭЦ

Менская ЦЭЦ-3, што ацяпляе чвэрць гораду, зьбіраецца да 2007 г. цалкам памяняць сваё абсталяваньне, што ад 1951 г. адпрацавала ўжо тры нормы. Мадэрнізацыя будзе каштаваць 150 млн даляраў. Палову гэтай сумы пакрые крэдыт, атрыманы ад Кувэйцкага фонду арабскага эканамічнага разьвіцьця.

Альпы ў Лошыцы

На замову Беларускай асацыяцыі гарналыжнага спорту ды снаўборду ля Лошыцкага вадасховішча ў Менску пачалі будаваць спартовы цэнтар у альпійскім стылі. У Аўстрыі ўжо набылі абсталяваньне для спускавых трасаў. Яны будуць ня дужа доўгія — ад 100 да 150 м. Летам у цэнтры будуць даваць напракат гідрацыклы ды лодкі для адпачынку на вадасховішчы.

Аўстрыйцы кантралююць «Прыёрбанк»

Аўстрыйская банкаўская група «Raiffeisen» заявіла, што мае ўжо 58,5% акцыяў «Прыёрбанку». Пасьля атрыманьня 50% акцыяў у студзені яна здолела набыць яшчэ 8,5% у акцыянэраў, атрымаўшы такім чынам кантрольны пакет акцыяў.

Бярвеньне безь ліцэнзіі

Саўмін дазволіў экспартаваць і імпартаваць бярвеньне ўсіх памераў ды дробнатаварную драўніну (накшталт дошак для скрыняў) дыямэтрам да 13 см безь ліцэнзіяў. Адзіным абмежаваньнем будуць мінімальныя кошты на гэты від драўніны. Прывядзе гэта да таго, што драўніны будуць гнаць за мяжу значна больш, аднак і працоўных месцаў у дрэваапрацоўцы паболее.

МАЗы ў Санкт-Пецярбургу

Перад сьвяткаваньнем юбілею Санкт-Пецярбургу там абнавілі і аўтобусны парк. Зрабілі гэта з дапамогай МАЗу, які паставіў у Санкт-Пецярбург 100 новых аўтобусаў. Налета колькасьць МАЗаў у былой сталіцы імпэрыі павялічыцца да тысячы.

АК

АСОБЫ ТЫДНЯ

УЛАДЗІМЕР ЦІЛАПАК

Міхаіл Падгайны раздаў за тры дні пяць папярэджаньняў незалежным газэтам і прыпыніў выхад «Белорусской деловой газеты». Журналісты вінавацяць міністра інфармацыі, што, нібыта, гэткім чынам ён спрабуе адвесьці ад сябе пагрозу адстаўкі, што навісла пасьля пракурорскай праверкі ў міністэрстве.

Рамуальд Улан, заснавальнік «Новой газеты Сморгони», аднавіў выпуск сваёй газэты. Функцыю выдаўца ўзяў на сябе ТБМ. Цяпер палова матэрыялаў газэты, раней расейскамоўнай, будзе друкавацца па-беларуску.

Сяргей Антусевіч, дэпутат Гарадзенскага гарсавету (БНФ), узьняў пытаньне аб ушанаваньні памяці Кастуся Каліноўскага ў Горадні. Прэцэдэнтам быў калектыўны ліст ад гарадзкое інтэлігенцыі, які падпісалі Юрась Пацюпа, Уладзімер Хільмановіч, Віктар Сазонаў і інш. Ідэя паставіць у Горадні помнік Каліноўскаму блукае калідорамі выканкаму ўжо 15 гадоў.

Сяргей Калякін пераабраны першым сакратаром ЦК ПКБ. Камуністы на сваім VII зьезьдзе прынялі новую праграму «Праз дэмакратыю да сацыялізму». Задача партыі — «вяртаньне Беларусі на сацыялістычны шлях разьвіцьця». Дзеля гэтага трэба надаць роўнасьць усім формам уласнасьці, падтрымліваць малы і сярэдні бізнэс — словам, стварыць сучасны аналяг НЭПу.

IREX-PROMEDIA

Васіль Бургун, старшыня Барысаўскага гарвыканкаму, можа спаць спакойна. З 1 чэрвеня ў дзяржаўных крамах Барысава забаронена прадаваць незалежныя газэты «без спэцыяльнае ліцэнзіі». Каб яе аформіць, трэба сабраць 20 візаў у гарвыканкамаўскіх чыноўнікаў.

Зьміцер Малочка, беларускі тэхнік, загінуў у Турцыі разам з шасьцю дзясяткамі гішпанскіх жаўнераў, што вярталіся зь місіі ў Аўганістане, і экіпажам украінскага самалёта Як-42. Налета яму мусіла споўніцца 40 гадоў. У Менску ў Зьмітра засталіся жонка і двое дзяцей.

Прэзыдэнт — гэтак у Беларусі будзе мець права называць сябе толькі кіраўнік дзяржавы. Адпаведная папраўка ў заканадаўстве мусіць зьявіцца да 1 жніўня. Усе іншыя прэзыдэнты (кампаніяў, асацыяцыяў, фірмаў) змушаныя будуць шукаць іншыя назовы для сваёй пасады. Тады ўжо ніводзін паэт-крыўдзіцель не адкруціцца словамі, што меў на ўвазе «не канкрэтнага» прэзыдэнта.

Аляксандар Вешнякоў, старшыня Цэнтравыбаркаму Расеі, агучыў пазыцыю Крамля: рэфэрэндум па канстытуцыйным акце саюзнай дзяржавы сёлета не адбудзецца.

Тоні Блэр, прэм'ер-міністар Вялікай Брытаніі, настояў на тым, каб Эўразьвяз не пераназывалі ў Злучаныя Штаты Эўропы. Таксама ён параіў выкінуць з праекту ўсе згадкі пра «фэдэратыўную» Эўропу.

Башар аль-Асад, прэзыдэнт Сырыі, выказаў сумнеў у існаваньні «Аль-Каіды». Маўляў, бэн Ладэн ня можа карыстацца ні тэлефонам, ні Інтэрнэтам, а загады па ўсім сьвеце рассылае — дык ці не прыдуманы ён амэрыканскімі спэцслужбамі?

Вітаўтас Ландсбэргіс сышоў з пасады лідэра літоўскай партыі кансэрватараў «Саюз Айчыны», якую сам заснаваў. Месца 70-гадовага Ландсбэргіса заняў 46-гадовы Андрус Кубілюс.

Невядомы амэрыканскі жаўнер затрымаў на іракска-сырыйскай мяжы транспарт зь дзьвюма тысячамі 18-кіляграмовых залатых зьліткаў. Іх кошт — да 500 млн даляраў. І ніводнага сабе ня ўзяў.

СМ

Зьдзіслаў Найдэр: «Беларусь можа ўвайсьці ў Эўразьвяз хутка»

На запрашэньне Шуманаўскага таварыства Менск наведаў Зьдзіслаў Найдэр. Ягоныя «рэгаліі» можна пералічваць доўга: сябар Нацыянальнай рады эўрапейскай інтэграцыі Польшчы, былы дарадца прэзыдэнта Леха Валэнсы, былы кіраўнік Польскай службы радыё «Свабодная Эўропа», адзін зь лідэраў антыкамуністычнай дэмакратычнай апазыцыі, дасьледчык творчасьці Джозэфа Конрада, прафэсар Апольскага ўнівэрсытэту…

У Менск ён трапіў амаль на свае... угодкі: 23 траўня 1983 г. вайсковы трыбунал Польшчы завочна вынес яму сьмяротны вырак. «Я жыву пасьля гэтага прысуду ўжо дваццаць гадоў, і гэта надае мне аптымізм», — пасьміхаецца прафэсар.

Падчас свайго побыту ў Менску сп.Найдэр выступіў зь лекцыямі на тэму польскай і агульнаэўрапейскай усходняй палітыкі. Вось ягоныя асноўныя думкі ў сьціслым пераказе «НН».

Тры ўсходнія палітыкі

Пасьля пашырэньня Эўразьвязу ён будзе суседзіць зь Беларусяй, Украінай, Расеяй і Малдовай. Гэта чатыры дзяржавы ў трох катэгорыях. Адна дзяржава — Расея — ня можа быць і ня будзе кандыдаткай у Эўразьвяз. Ёсьць дзьве дзяржавы, якія хочуць быць кандыдаткамі: Малдова і Украіна. І ёсьць Беларусь, якая сур'ёзна не выказвалася наконт свайго сяброўства ў Эўразьвязе.

Паміж Польшчай і Эўразьвязам точыцца дыскусія наконт таго, колькі ўсходніх палітык павінна быць — адна, дзьве ці тры. Чэхі, славакі і вугорцы лічаць, што хутчэй павінна быць адна палітыка. І многія іншыя краіны Эўразьвязу лічаць таксама. Здаецца, такая палітыка мае падтрымку сёньня і ў Злучаных Штатах.

У Польшчы пераважае меркаваньне, што павінна быць дзьве альбо тры ўсходнія палітыкі. Дзьве: адна — у дачыненьні да Расеі, другая — да трох астатніх дзяржаваў. І другая палітыка мусіць мець 2 пункты, бо нельга аднолькава ставіцца да тых, хто дэкляруе сваю ахвоту да Эўразьвязу, і тых, хто нічога не дэкляруе.

Некаторыя палітыкі кажуць пра пашырэньне ЭЗ аж да ўлучэньня Расеі, як нядаўна заявіў Бэрлюсконі. Але гэта несур'ёзна, гэта нерэальна. Расея ня можа быць сябрам Эўразьвязу, яна проста завялікая.

Ці ў Эўропу, ці ў Саюз з Расеяй

Беларусь — не такая вялікая дзяржава, як Украіна, і таму яна магла б хутчэй увайсьці ў Эўразьвяз. Але ці можа Беларусь прэтэндаваць на кандыдацтва ў Эўразьвязе, адначасова ўваходзячы ў саюзную дзяржаву з Расеяй? Адно выключае другое. Ані Польшча, ані ЭЗ ня хочуць умешвацца ва ўнутраныя справы Беларусі. Але Рада Эўропы не прызнае тых «саюзных» дамоваў — лічыцца, што беларусы яшчэ ня мелі гістарычнага шанцу свабодна выказаць сваю волю.

Ёсьць і іншае меркаваньне, менш пашыранае: калі нешта адбываецца ў Беларусі, трэба хуценька націснуць на Маскву, каб ужо тая паўплывала на беларускія працэсы. Падобная палітыка азначае, што ўсё ўжо загадзя вырашана і можна гаварыць толькі з адной дзяржавай, а другой ня браць пад увагу.

Візавы рэжым

Палякі зацікаўленыя ў тым, каб у Беларусь можна было лёгка прыяжджаць. Тут, пад Наваградкам, нарадзіўся Міцкевіч… Але выглядае, што беларускі ўрад не зацікаўлены ў тым, каб беларускія візы было лёгка атрымаць. Добра, што лягчэй за іншых можна праехаць навукоўцам, студэнтам. Але ж каб ня здарылася так, як у Польшчы да 1989 г.: заходнія ўрады прызначалі стыпэндыі, а польскі ўрад не даваў людзям замежных пашпартоў.

Апаратчыкі могуць думаць

На Захадзе пашыраная думка, што пасьля зьмены рэжыму ў Беларусі ўладу пяроймуць не прадстаўнікі апазыцыі, а тыя, хто сёньня круціцца ля ўлады. У іх ёсьць галава на плячах, і яны ведаюць, дзе мёдам намазана. Памятаю, 11 гадоў таму, падчас візыту прэм'ера Кебіча ў Варшаву, зайшла гаворка пра адкрыцьцё консульства. Мы думалі, што ён хоча мець консульства ў Беластоку, а ён папрасіў — у Гданьску, бо хацеў мець акно ў сьвет. Гэта быў для мяне сыгнал, што апаратчыкі таксама могуць думаць.

Найлепш — суседзкае радыё

Што варта разьвіваць дзеля дэмакратызацыі грамадзтва: радыё альбо тэлевізію? Тэлевізія каштуе значна болей, чым радыё. Але хто будзе працаваць на такім радыё? Гэта вельмі вялікае пытаньне. Я маю досьвед, бо працаваў на радыё «Свабодная Эўропа». Ці многа людзей рызыкне працаваць на такую станцыю, каб тут іх успрымалі як шпіёнаў?

Я маю іншую ідэю — узмацніць сыгнал польскіх рэгіянальных тэлестанцыяў (Ольштын, Беласток), каб іх можна было прымаць у Беларусі. Хай бы беларусы глядзелі і параўноўвалі сваё жыцьцё з польскім. Гэта палітычна й эканамічна няцяжка зрабіць. Гэта было б бліжэй вашым гледачам, чым праграмы Бі-Бі-Сі ці французкага пятага тэлеканалу, якія паказваюць жыцьцё далейшых краінаў. У Польшчы таксама паўсюдна можна глядзець, напрыклад, галяндзкія ці ангельскія праграмы і ўяўляць, як выглядаюць іншыя краі. Радыёстанцыя «Вольная Беларусь» мелася ўзьнікнуць, але зьявіліся палітычныя перашкоды: яна будзе ўспрымацца як агрэсія.

Эўразьвяз — супольнасьць розных

І польская правыя каталікі, зьвязаныя з радыё «Марыя», і левыя з «Самаабароны» выказваюць аднолькавыя аргумэнты супраць уваходу краіны ў Эўразьвяз, кажа Найдэр. Маўляў, у Эўразьвязе мы страцім саматоеснасьць. Але гэта абсурдны аргумэнт. У аб'яднанай Эўропе галяндцы не зрабіліся больш падобнымі да бэльгійцаў, французы — да італьянцаў, гішпанцы — да партугальцаў. Больш за тое, народы Эўропы чакаюць, што і ў будучыні будуць розьніцца міжсобку. У Эўрапейскай камісіі ёсьць нават спэцыяльныя фонды для падтрымкі моваў мяншыняў.

Паасобныя народы і нават рэгіёны могуць разьвівацца самастойна. Паколькі вайна паміж краінамі Эўразьвязу немагчымая, рэгіянальныя адрозьненьні будуць квітнець. Гэтак, каталёнцы могуць мець аўтаномію ў рамках Гішпаніі, бо гэта нікому нічым не пагражае. Тыя самыя бэльгійцы, напрыклад, ужо практычна падзяліліся напалам: валёнцы — сабе, фляманцы — сабе.

Хто такі эўрапеец?

Няма эўрапейскай тоеснасьці паза нацыянальнымі тоеснасьцямі. Эўрапейскасьць існуе толькі ў нацыянальных культурах. Няма «эўрапейскіх калыханак» і «эўрапейскіх пахавальных звычаяў».

Калі ў мяне пытаюцца, пачуваецца чалавек больш эўрапейцам ці галяндцам, я кажу: гэта пытаньне кшталту таго, ці пачуваецца ён больш мужчынам ці самцом.

Усходняй палітыцы зашкодзіў Ірак

Вялікая праблема польскай усходняй палітыкі ў тым, што ў яе вельмі слабыя інструмэнты. Наш уплыў на эўрапейскую палітыку апошнім часам зьменшыўся дзеля пазыцыі, якую Польшча заняла ў вайне з Іракам. Нашая ўсходняя палітыка стала ахвярай заангажаванасьці ў іракцкія справы. Мне проста шкада грошай, выдаткаваных на спэцыяльныя трапічныя мундыры для нашых вайскоўцаў. Замест таго мы маглі запрасіць некалькі тысяч студэнтаў зь Беларусі ці Украіны альбо паслаць некалькі дзён таму абвясьціла БелТА. Калі б нашая краіна трымалася ў гэтым пытаньні тае ж пазыцыі, што й ЗША, гэта прывяло б да зьмяншэньня зацікаўленасьці польскага ўраду ў праблемах усходніх суседзяў. Эўрапейцаў — французаў, фінаў, немцаў — яшчэ можна ўгаварыць падтрымаць супрацоўніцтва паміж Польшчай і Украінай, Польшчай і Беларусяй без удзелу Расеі, але амэрыканцаў на гэта ўгаварыць цяжка. Вялікія зьвяры любяць размаўляць зь вялікімі зьвярамі. Палітыка Вашынгтону заўжды будзе арыентавацца на дыялёг з Масквой.

Якія краіны маглі б падтрымаць Польшчу ў яе ўсходняй палітыцы? Думаю, нам трэба найперш працаваць зь Нямеччынай і Францыяй. Праўда, яны маюць традыцыю сваёй спэцыфічнай палітыкі што да Расеі, і я ня ведаю, ці ўдасца іх пераканаць у неабходнасьці шматузроўневай усходняй палітыкі. Разам з тым, краіны Эўропы вельмі хваравіта сочаць за захаваньнем правоў чалавека, і тут Расея выявілася ня дужа добрай вучаніцаю. Яна далёка ня ўзор. Гэта дае магчымасьць патлумачыць краінам Эўразьвязу, што нельга ва ўсходняй палітыцы арыентавацца толькі на яе.

Занатаваў АШ

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Эўразьвяз можна параўнаць з калёніяй хамякоў, якія самі на сабе ставяць экспэрымэнт. Сярод іх ёсьць хамякі невялікія, ёсьць малюпасенькія, ёсьць сярэднія. Ёсьць адзін вялікі хамяк — Нямеччына, але ён сьцяўся ды ўдае, што ня большы за іншых. Але ва ўсёй гэтай калёніі няма супэрхамяка. Вось у НАТО ёсьць такі супэрхамяк: адзін дыктуе сваю волю ўсім астатнім. А ў Эўразьвязе такога супэрхамяка няма й быць ня можа. Вось чаму Расея ніколі ня ўвойдзе ў ЭЗ.»

Хто найбольш забруджвае паветра ў Менску?

Вызначаныя гарвыканкамам ліміты дапушчальных выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфэру ад стацыянарных крыніц

Прадпрыемства	тонаў за 2003 год
Менскэнэрга (Менская ЦЭЦ-4, Менская ЦЭЦ-3, Менскія цепласеткі)	12645,1
Менскі трактарны завод	5551,9
Менскі аўтамабільны завод	3100,8
Менскі завод ацяпляльнага абсталяваньня	2510,9
Менскі завод будматэрыялаў	2154,8
ААТ «Керамін»	1228,2
Менсккамунцепласетка	656,6
ЗАТ «Атлянт»	630,0
Менскі маторны завод	542,2
ААТ «Макрадор»	331,8
Менскі авіярамонтны завод	265,9
Менская кватэрна-эксплюатацыйная часьць	255,2
ААТ Беларуска-амэрыканскае СП «Уніфлекс»	241,2
Менскхлебпрам	209,6
АП «Менскі падшыпнікавы завод»	208,5
Менскі электратэхнічны завод імя Казлова	194,8
ААТ «Мотавэля»	160,1
СП «Флексфорс» ЗАТ	155,4
Вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Плутас-Маркет»	154,1
ААТ «Беларускія шпалеры»	148,6
Завод «Гарызонт»	145,8
Менскі мясакамбінат	143,0
Завод паўправадніковых прыбораў імя Дзяржынскага	141,1
ААТ «Менскпраектмэбля»	117,9
ААТ «КамВоль»	108,1
Прамысловая база «Ўручча», вайсковая часьць	106,9
АП «Менскі камбінат сілікатных вырабаў»	105,3
Лякаматыўнае дэпо Менск	104,2
Менскі мэханічны завод імя Вавілава	96,8
Менскі вагонарамонтны завод	92,5

ВАСІЛЬ МАЗАЕЎ

Хто ў Менску болей за ўсіх сьмеціць?

Вызначаныя гарвыканкамам ліміты звозу адкідаў

Прадпрыемства	тонаў за 2003 год
Менскі аўтамабільны завод	66740,0
Сэцыялізаванае будаўнічае ўпраўленьне №1 УСМУ Менгарвыканкаму	40000,0
Менскі Камароўскі рынак	21351,8
Менскі завод ацяпляльнага абсталяваньня	20707,5
УСМУіБ Менгарвыканкаму	18066,3
Упраўленьне мэханізацыі 70 трэсту №15	16020,0
ЖРЭА Першамайскага раёну	15000,0
Менскі трактарны завод	13320,0
Менскі мясакамбінат	13221,8
Менскмэтрабуд	13045,0
ААТ «Керамін»	13000,0
ААТ «Грандбуд»	12000,0
УП «Цепласеткі»	10815,0
ЗП «Сан лайн»	10010,0
СБУ-4 УСМУіБ Менгарвыканкаму	9040,0
СБУ-5 УСМУіБ Менгарвыканкаму	9000,0
ЗАТ «Атлянт»	8950,0
ЗАТ «Будэнэрга»	8015,0
Менскі домабудаўнічы камбінат	8000,0
Сэцыялізаванае арэндная прадпрыемства «Менскзелянбуд»	8000,0

Jubilej biez ulanaŭ

Minuła 140 hadoŭ z dnia Miłavidzkaj bitvy. Tady pad Miłavidami (Baranaviččyna) syšlisia biełaruskija paŭstancy i rasiejskija karnyja vojski. Kryvavy boj doŭžyŭsia da viečaru. Rasiejcy paniešli ciažkija straty dy, nia zdoleŭšy pahnać paŭstancaŭ, čakali na dapamohu jašče niekalki pałkoŭ. Paŭstancy nočču padzialilisia na drabniejšyja addzieły j adyšli. U 70-ja hady XX st. Miłavidzkaja bitva jašče raz nahadała pra siabie. Śpiłavaŭšy staroje dreva, ludzi znajšli ŭ im čałaviečyja pareštki i strelbu. Adzin z paranienych paŭstancaŭ, mahčyma, źbiraŭsia pieranačavać u duple, dy tak i pamior u hłybini dreva.

Bieraściejski abłvykankam svajoj dyrektyvaj nahadaŭ baranavickim vertykalščykam pra hadavinu bitvy i rekamendavaŭ jaje ŭračysta adznačyć. Rajonnyja ŭłady sapchnuli mierapryjemstva na Miłavidzkuju škołku dy Baranavickuju haradzkuju biblijateku. Dałučyłasia j TBM.

22 traŭnia ŭ Miłavidach adbylisia ŭračystaści. Dzietki pačytali vieršyki, vystupili staršynia sielvykankamu, nastaŭniki, staršynia filiji TBM. Miascovyja babulki ŭspaminali śviatkavańnie za polskim časam: tady ładzilisia festy i parady konnych ułanaŭ. Ciapieraka, havaryli, nia toje śviata. Baciuška adsłužyŭ panichidu «pa ŭbijennych pravasłaŭnych voinach». Vyšvianciŭ kryž rasiejskim sałdatam, pastaŭleny ŭ 1913 h. la darohi, kaplicu nasuprać, pabudavanuju za palakami ŭ 30-ch, dy pamiatny kamień, ustalavany ŭ 90-ch.

Ulady tym časam rychtavalisia da aficyjnaha haradzkoha śviata «Baranavickaja viasna-2003», što j adbyłosia 24—25 traŭnia. Padčas jaho ŭ kramach zabaranili handlavać harełkaj. Źviazana heta nia z tym, što miascovyja ŭłady vyrašyli nia spojvać narod. Paprostu ciapier prybytak ad prodažu harełki jdzie ŭ respublikanski, a nie ŭ miascovy biudžet. Samo ž śviata adbyłosia pa starym šmathadovym scenaru. Na płoščy Lenina, nasuprać pomnika jamu ž, chutkimi tempami zbudavali scenu. Akramia svajich artystaŭ i načnoj dyskateki, pryjaždžali Iryna Darafiejeva i «Mirskija muzyki».

Rusłan Raviaka, Baranavičy

Абяцанка-цацанка

У пачатку траўня намесьнік старшыні Рэчыцкага райвыканкаму (а па сумяшчальніцтве й намесьнік старшыні Рэчыцкага райсавету) наведаў СШ №4 Рэчыцы. На сустрэчы ён паабяцаў, што ўсе настаўнікі гораду будуць атрымліваць заробак раней за мэдыкаў і ў тэрмін да 14-га дня. Узрадаваная такою навіною дырэктарка школы («па сумяшчальніцтве» цешча старшыні райвыканкаму) расказала ўсё і іншым настаўнікам, якія не прысутнічалі на сустрэчы. Але вось ужо прайшоў амаль тыдзень ад тэрміну атрыманьня заробку, а грошыкаў усё нямашака. Настаўнікі ў роспачы — ці можна так падманваць любімую цешчу?

Перакулілася вахтоўка

У вёсцы Падмосьце Рэчыцкага раёну 19 траўня а 9-й адбылося сутыкненьне вахтавага аўтобуса з 15 нафтавікамі ды «Жыгулёў» намесьніка старшыні Рэчыцкага райвыканкаму Шостака. У выніку аварыі аўтобус нафтавікоў перакуліўся дагары й адзін з пасажыраў у цяжкім стане быў дастаўлены ў Рэчыцкую больніцу. Кіроўца «Жыгулёў» не пацярпеў (самога намесьніка ў той момант у машыне не было). Ходзяць чуткі, што кіроўца вахтоўкі хворы на эпілепсію і ў той момант у яго здарыўся прыступ.

Валеры Пуціцкі, Рэчыца

Плітка ляціць

Умовы, у якіх існуюць установы культуры Глушчыны, пакідаюць жадаць лепшага: дзіравыя драўляныя сьцены цэнтральнай бібліятэкі ў Глуску, пачарнелая столь танцавальнай залі раённага Дому культуры… А ў вёсцы Бярозаўцы глядзельная заля ДК ў такім стане, што на нядаўнім канцэрце, які давалі самадзейныя артысты з суседніх Завалочыц, ад столі адвалілася плітка і параніла ў галаву адну з артыстак.

Камэнданцкая гадзіна

У адпаведнасьці з рашэньнем райвыканкаму абмежаваны час працы шэрагу прыватных крамаў Глуску. Цяпер «Прэстыж», крамы Габруся і Гуля, што гандлююць, сярод іншага, гарэлкай і півам, мусяць сканчаць сваю працу не пазьней за 22-ю гадзіну. У апошні час павялічылася колькасьць нецьвярозых кіроўцаў і п'яных пешаходаў на вуліцах, пачасьціліся выпадкі затрыманьня непаўналетніх у нецьвярозым стане. Улады разьлічваюць скарачэньнем часу працы крамаў зьменшыць спажываньне алькаголю глушчанамі, што ня ведаюць меры. У той жа час вышэйназваныя крамы часьцяком былі адзінымі крыніцамі сьвятла на цёмных глускіх вулках увечары.

Ігар Кірын, Глуск

Не пускаюць па пэнсію

Неспадзяваную рэакцыю выклікаў апошні нумар грамадзка-палітычнай газэты «Шклоўскія навіны», якая ў Шклове ўважаецца за надзвычай скандальнае выданьне. Рэдактару газэты сп.Шчарбаку забаранілі ўвайсьці ў памяшканьне мясцовага аддзелу пэнсійнага забесьпячэньня. Начальнік аддзелу пэнсіянэру Шчарбаку прычынаў не тлумачыў, але даў зразумець, што пісаць трэба менш. Тое ж паўтарылася і ў памяшканьні мясцовай раёнкі «Ўдарны фронт». Як мяркуе сп.Шчарбак, гэткая рэакцыя выкліканая вострымі артыкуламі, аўтары якіх даводзяць уласнае меркаваньне што да побыту мясцовага чынавенства і іхнага дабрабыту. Матэрыялы поўняцца канкрэтнымі фактамі. Сп.Шчарбак кажа, што дырэктар камунальнай гаспадаркі Шклова мае намер падаць на яго ў суд.

Алесь Асіпцоў, Магілёў

«Лоша» на замку

Жыхар Смургоняў хацеў разбагацець на аўтазапчастках і вёз іх праз пункт памежнага кантролю «Лоша». Каб не плаціць мыта, схаваў іх пад капотам свайго аўтамабіля. «Нумар» разгадалі памежнікі, а суд сканфіскаваў у даход дзяржавы запчасткі. У выніку смургонец аказаўся ў мінусе больш чым на мільён рублёў.

А ў машыне жыхара Астраўцу памежны нарад знайшоў 80 літраў сьпірту. Перавозіў ён яго ў прыстасаваным для гэтых мэтаў бэнзабаку. Парушальнік пакараны штрафам на 133 тысячы рублёў.

Мар'ян Вянгроўскі, Астравец

Маршрутныя войны

У Воршы працуе каля 500 прыватных маршрутных таксовак. Цана праезду ў іх адносна невялікая — 250—300 руб., ды ходзяць яны часта. Але ў найбліжэйшы час карціна зьменіцца. Мясцовыя ўлады вырашылі пакінуць на патрэбы гораду толькі 180 таксовак, а астатнія накіраваць на прыгарадныя маршруты. Перад выездам на лінію кіроўцы будуць абавязаныя праходзіць мэдычны, а машыны (збольшага зношаныя іншамаркі) — тэхнічны агляд. Узмоцняцца патрабаваньні да маршрутак з боку ДАІ, бо за апошні час некалькі кіроўцаў былі затрыманыя выпіўшы, а адзін нават ня меў правоў. Дарэчы, між уладальнікамі маршрутак няма згоды. На стаянках таксовак часта знаходзяць мэталёвыя «вожыкі» ды цьвікі, якімі спрабуюць сапсаваць колы канкурэнтаў.

Віктар Лютынскі, Ворша

Выстава Міколы Купавы

У Сьветлагорскай галерэі «Традыцыя» адкрылася пэрсанальная выстава Міколы Купавы. Экспазыцыя складаецца з акварэляў ды аўталітаграфіяў мастака: партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Каліноўскага, Вітаўта, акварэлі з маляўнічымі краявідамі. У цэнтры экспазыцыі — трыптых, прысьвечаны паўстанцам Касьцюшкі. Уражвае левая частка — «Інтэграцыя»: на стромкім пагорку старажытны замак, побач плошча з ратушай, іншыя мураванкі. Усё сьветлае, жыцьцесьцьвярджальнае. І над гэтай прыгажосьцю ў шэрым небе раскінуў крылы чорна-брунатны дзьвюхгаловы драпежнік. На радзіме Купавы, у Воршы, выставіць гэтую карціну ўлады не дазволілі.

Вадзім Болбас, Сьветлагорск

ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

Далей скарачаць няма куды

У школах пайшлі чуткі, што з 1 верасьня асобныя школьныя прадметы «мова» й «літаратура» зводзяцца ў адзін «новы» — «мова і літаратура». Галоўная інспэктарка Міністэрства адукацыі Тамара Саўчук не пацьвердзіла інфармацыі: «Папросту раней у нас у навучальным пляне гэтыя прадметы стаялі асобнымі пазыцыямі. Але гэта тычыцца толькі навучальнага пляну — самі прадметы інтэграваныя ня будуць». Не плянуецца таксама і скарачэньня гадзінаў на вывучэньне беларускай мовы й літаратуры ў школе: «У нас некалькі гадоў у 10-й і 11-й клясах было па тры гадзіны на тыдзень на гэтыя прадметы, цяпер — па дзьве. Але гэта адзінае скарачэньне, якое ўжо ёсьць, і новых ня будзе».

АШ

Віталь Сіліцкі

Палітычны расклад–2003

Хоць выбары пры аўтарытарных рэжымах часьцяком праводзяцца ва ўмовах шматпартыйнай сыстэмы і на альтэрнатыўнай аснове, іх нельга назваць мэханізмам, праз які адбываецца ратацыя ўлады. Гэта хутчэй сродак наданьня легітымнасьці існай уладзе і дэмаралізацыі апазыцыі шляхам перакананьня грамадзтва ў значнай перавазе рэжыму над яго апанэнтамі. Выключэньне складаюць так званыя «шокавыя выбары», праз якія апазыцыя альбо прыходзіць да ўлады, альбо набывае палітычную вагу і зьмяняе расклад сілаў унутры рэжыму. Неабходны чыньнік посьпеху — здольнасьць апазыцыі абараніць вынікі выбараў шляхам вулічных акцыяў.

Адметнасьць шокавых выбараў — іх нечаканасьць як для рэжыму, так часта і для грамадзтва. Да іх прыводзіць самаўпэўненасьць дыктатарскіх уладаў, якія не дапускаюць нават магчымасьці паразы. Аднак вонкавая рэвалюцыйнасьць такіх выбараў — насамрэч вынік доўгай сацыяльнай і палітычнай эвалюцыі грамадзтва, што прыводзіць да карэннай зьмены раскладу сілаў. Галасаваньне толькі робіць гэтыя зьмены відавочнымі.

Мясцовыя выбары ў сакавіку 2003 г. ня сталі шокавымі. Іх вынік ня ўнёс істотных зьменаў у палітычны статус-кво. Дый тактыка кожнага з бакоў не была нечаканаю для назіральнікаў. Выбары ўскосна пацьвердзілі факт паступовага размываньня сацыяльнай базы рэжыму і ў той жа час адлюстравалі ўзмацненьне яго рэпрэсіўных магчымасьцяў. Яны — чарговы крок у эвалюцыі беларускай палітычнай сцэны. Каб вызначыць вэктар далейшага палітычнага разьвіцьця краіны, неабходна адзначыць зьмены, што адбыліся ў стане і статусе асноўных палітычных гульцоў.

Улады: заканчэньне раману з электаратам

Выбары-2003 былі адносна пасьпяховыя для існага рэжыму. Улады запабеглі стварэньню «сыстэмнай апазыцыі» ў мясцовых саветах. Апазыцыя забясьпечыла сабе хіба дэкаратыўны ўдзел у дэкаратыўных органах улады. Зрэшты, яны ў беларускіх умовах граюць такую фармальную ролю, што нават шырокае прадстаўніцтва апазыцыі ў саветах не наблізіла б яе да рычагоў уплыву на палітычныя працэсы. Але трыюмфу апазыцыі нельга было чакаць нават пры «найчысьцейшым» падліку галасоў, бо ў 90% округаў выбары былі безальтэрнатыўнымі, а ўдзел у кампаніі палітычных партыяў — мізэрны.

Перамога на мясцовых выбарах магла б надаць апанэнтам рэжыму псыхалягічную перавагу ў наступных кампаніях і падвысіць ступень даверу да іх з боку грамадзтва і замежных гульцоў. Вынік барацьбы ў тых некалькіх сотнях округаў, дзе выбары можна было назваць выбарамі, мусіў высьветліць, ці можна ўвогуле ў беларускіх умовах зьвязваць з галасаваньнем спадзеў на перамены. На выбарах-2003 быў прадэманстраваны альгарытм паводзінаў улады ва ўмовах паступовага размываньня яе сацыяльнай базы (і зьнікненьня квазідэмакратычнай легітымнасьці) ды трансфармацыі палітычнага рэжыму ў выразна султанісцкі.

Па-першае, **улады былі зусім абыякавыя да забесьпячэньня сваёй легітымнасьці як за мяжой, так і ў краіне**. Улады ня сталі рызыкаваць, не дазволіўшы нават абмежаванай рэальнай канкурэнтнасьці выбараў, «зафіксаваўшы» іх вынікі яшчэ на этапе рэгістрацыі кандыдатаў.

Па-другое, **жорстка блякавалася рэальная канкурэнцыя ў буйных гарадох**, у першую чаргу ў Менску. Паказальны факт: каб заблякаваць кандыдата «ад улады» па адзінай акрузе ў сталіцы, спатрэбілася ўмяшальніцтва адразу трох дэпутатаў парлямэнту ў якасьці назіральнікаў. Прычым абраньне альтэрнатыўнага кандыдата было таксама заблякаванае, бо 600 галасоў згубіліся па дарозе з участковых камісій у округовую. У буйных гарадох старанна мацуюцца асяродкі адміністрацыйнай рэакцыі.

> Дэпутатам, што прэтэндавалі на незалежнасьць ад уладаў, паказалі, што іх можа чакаць на выбарах.

Па-трэцяе, **рэзка вырас адсотак фальсыфікацыі выбараў**, які дасягаў максымуму ў Менску. Калі ў папярэдніх кампаніях доля сфальсыфікаваных галасоў, паводле незалежных ацэнак, складала 15—20%, дык гэтым разам павялічылася ці не ўдвая. Так, у акрузе №8 у Менску, дзе балятаваліся незалежны кандыдат Сяргей Казлоўскі і камандзір аддзелу САХР Сяргей Хаменка, на двух участках вынікі былі адпаведна 688 на 487 і 874 на 271 голас на карысьць Казлоўскага (па галасаваньні 2 сакавіка) і 56 на 685 ды 54 на 570 на карысьць Хаменкі (па папярэднім галасаваньні). Згодна з падлікамі НІСЭПД, рэальная колькасьць выбарцаў, што ўзялі ўдзел у першым туры галасаваньня, меншая за афіцыйную лічбу на 7,2% (65,8% супраць 73%), амаль на столькі сама меншы і працэнт тых, хто ўзяў удзел у датэрміновым галасаваньні (12,5% супраць 20%, заяўленых уладамі). Толькі 21,6% апытаных заявілі, што галасавалі за кандыдатаў ад улады. Праўладныя кандыдаты зьбіралі галасы пераважна коштам свайго беспартыйнага статусу (больш за палову выбарцаў ня мелі дастатковай інфармацыі ад тым, за каго яны галасуюць).

Па-чацьвертае, **зьмянілася тактыка кааптацыі мясцовых элітаў**. Апрача ўласнай намэнклятуры, на выбарах-2003 улады зрабілі стаўку выключна на настаўнікаў і дактароў, чыя ляяльнасьць гарантуецца залежнасьцю ад дзяржавы. У гэтым мясцовыя выбары кантрастуюць з парлямэнцкімі выбарамі-2000, калі быў даволі высокі працэнт прадстаўнікоў «вольных» прафэсіяў (прадпрымальнікі складаюць каля 10% цяперашняй палаты прадстаўнікоў).

Нарэшце, сябры выбаркамаў канчаткова пераўтварыліся ў апарат дасягненьня неабходнага палітычнага выніку, што мацавала іх ляяльнасьць да дзяржаўнага апарату, паколькі тым самым павышаецца імавернасьць іх перасьледу ў выпадку зьмяненьня рэжыму.

Іншая прычына, што дазваляе разглядаць мясцовыя выбары як пасьпяховую для ўладаў кампанію, гэта канчатковае спыненьне «ўнутрырэжымнага плюралізму», якім вызначаліся, напрыклад, выбары ў ПП 2000 г. Гэтым разам улада дамаглася таго, каб на адну выбарчую округу амаль паўсюдна прыпадаў адзін кандыдат ад улады. Ва ўнутраным плюралізьме, нават калі яго наступствы абмяжоўваюцца актывізацыяй лабісцкай дзейнасьці асобных груповак, улады бачылі патэнцыйную небясьпеку, як і ў пэрспэктыве прасоўваньня «пазасыстэмнай» апазыцыі ў інстытуты ўлады.

Нарэшце, трэба вызначыць і посьпех улады ў стварэньні атмасфэры сацыяльнай апатыі і абыякавасьці грамадзтва да палітычных працэсаў увогуле і выбараў у прыватнасьці. Гэтаму паспрыяла фактычнае замоўчваньне перадвыбарнай тэматыкі афіцыйнымі СМІ ды ўжо традыцыйныя абмежаваньні на выкарыстаньне мэдыяў кандыдатамі дзеля перадвыбарнай агітацыі.

«Прадказальнасьць» вынікаў выбараў зьніжае да мінімуму грамадзкія спадзяваньні на тое, што ў іх выніку нешта зьменіцца. Выбары ператвараюцца для выбарцаў у рытуал, што нагадвае працэдуры савецкіх часоў.

Пераўтварэньне выбараў у тэатралізаванае дзеяньне з загадзя вядомым вынікам пераходзіць у абыякавасьць да самой працэдуры. У адрозьненьне ад папярэдніх часоў, калі перамога на выбарах ці рэфэрэндуме падвышала рэйтынг улады на 8—15%, мясцовыя выбары сталі першай буйной палітычнай кампаніяй, пасьля якой Лукашэнка страціў прыхільнікаў у грамадзтве. Яго рэйтынг зьнізіўся з 30,5% (сьнежань 2002 г.) да 26,2%, што ёсьць рэкордна нізкім паказьнікам за ўсе часы прэзыдэнцтва.

Яшчэ больш уражвае імківасьць фармаваньня антылукашэнкаўскай сацыяльнай бальшыні. Ажно 64% выбарцаў жадалі ў красавіку 2003 г. абраньня новага прэзыдэнта, і толькі 23% згодныя абраць Лукашэнку яшчэ на адзін тэрмін. (А яшчэ два гады таму суадносіны тых, хто жадаў і не жадаў абраньня Лукашэнкі на другі тэрмін, былі 36% на 41%!). Значыць, колькасьць сацыяльных апанэнтаў рэжыму павялічвалася з хуткасьцю 1% за месяц, а сярэдняя хуткасьць скарачэньня базы яго паплечнікаў складала прыкладна 0,5% у месяц. Можна меркаваць, што фармаваньне антылукашэнкаўскай бальшыні адбываецца ў першую чаргу за кошт г.зв. «балота», ці выбарцаў, якія дагэтуль ня вызначыліся. Размываньне балота, у сваю чаргу, азначае абмежаваньне магчымасьцяў для аднаўленьня сацыяльнай базы рэжыму.

Такое падзеньне папулярнасьці падштурхоўвае ўладу да пошуку больш жорсткіх мэтадаў кантролю за грамадзтвам. Гэта і было прадэманстравана кампаніяй па выпрацоўцы новай «дзяржаўнай ідэалёгіі». Дарма што аўтарытарны рэжым паводле сваёй прыроды ня здольны легітымізаваць самога сябе ідэалягічнымі сродкамі, дадзеная кампанія заслугоўвае ўвагі. Падчас яе асаблівы націск робіцца на калектывізм, традыцыяналізм і нават (амаль згодна з канонамі чучхе) імкненьне да самаізаляцыі, мэсіянскае вызначэньне ролі беларусаў як «духоўных лідэраў» Усходняй Эўропы. У ранг дзяржаўнага ідэалу ўзводзяцца таталітарныя вартасьці, якія апраўдваюць неабмежаванае выкарыстаньне рэпрэсіўнага апарату. Аднак гэта тыя вартасьці, што губляюць глебу ў палітычнай культуры грамадзтва. Трэба адзначыць, што сам Лукашэнка ў пэўнай ступені разгублены, ён усьведамляе штучнасьць уласных ідэалягічных пошукаў. У прамове перад нацыянальным сходам 16 красавіка ён прызнаўся, што сам ня мае ўяўленьня аб тым, якой павінна быць новая дзяржаўная дактрына. Кволыя спробы паднавіць мэханізм «прамываньня мазгоў» сьведчаць толькі аб тым, што раман Лукашэнкі з электаратам амаль вычарпаўся. Выжываньне рэжыму залежыць ад здольнасьці падтрымліваць адзінства ўладнага апарату ды апэратыўна вынішчаць палітычныя альтэрнатывы. Але рабіць апошняе зь цягам часу будзе ўсё цяжэй.

> «Фронда» ад апазыцыі розьніцца тым, што яна арыентаваная на рашэньне дробных праблем, а не на глябальнае зьмяненьне статус-кво.

Апазыцыя: вяртаньне надзеі

Выбары адбываліся ў значна больш спрыяльным для дэмакратаў сацыяльным кантэксьце, чым прэзыдэнцкія пазалетась. Паводле дадзеных аксіямэтрычнай лябараторыі «Новак» за лістапад 2002 г., упершыню з 1994 г. перавага была на баку тых, што хацеў бы прагаласаваць на мясцовых выбарах за кандыдата-супраціўніка Лукашэнкі. Згодна з дадзенымі «Новака», найбольшыя электаральныя сымпатыі мелі незалежныя кандыдаты — 27% па ўсёй краіне і 28% у Менску, за імі ішлі кандыдаты ад улады — адпаведна 21 і 24%; потым — кандыдаты ад шырокага блёку грамадзянскіх сілаў (калі б такі ўзьнік) — 17 і 19%; нарэшце — кандыдаты ад палітычнай апазыцыі — 9% і 10%.

Чаго ж рэальна магла дамагчыся апазыцыя на гэтых выбарах, калі адміністрацыйны рэсурс быў цалкам манапалізаваны ўладамі?

Любая выбарчая кампанія нават пры такіх варунках пашырае базу падтрымкі палітычнай контрэліты, што ў пэрспэктыве паспрыяе пераходу да дэмакратыі. Стратэгічная мэта апазыцыі (забесьпячэньне ўласнага ўплыву ў «сыстэмнай» палітыцы) не была дасягнута. Аднак можна вызначыць некалькі тактычных посьпехаў, пераважна псыхалягічнага пляну. Па-першае, апазыцыя пачала пазбаўляцца комплексу ўласнай непаўнавартасьці, што стараўся раней існай перавагай сымпатыяў электарату на карысьць Лукашэнкі. Многія апазыцыйныя кандыдаты выдатна «адпрацавалі» кампанію, здолелі стварыць пра сябе пазытыўнае меркаваньне сярод выбарцаў, і, калі б фальсыфікацыя вынікаў не была настолькі нахабнай, шмат хто прайшоў бы. Там, дзе апазыцыя ўсё ж трапіла ў выбарчыя бюлетэні, за яе прагаласавала пераважная большасьць выбарцаў!

Па-другое, выбары выявілі адсутнасьць адмоўнага ўспрыняцьця партыйных брэндаў. Плыні нэгатыўнай, часам скандальнай інфармацыі аб дзейнасьці апазыцыі мелі абмежаваны ўплыў на грамадзкую думку. Партыі атрымалі магчымасьць «ляпіць» сваё сацыяльнае аблічча з чыстага аркуша. Нарэшце, мясцовыя выбары паказалі наяўнасьць сацыяльнай базы для апазыцыі на пэрыфэрыі і нават у вёсцы, аб чым сьвед-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Віталь Сіліцкі — палітоляг. Дацэнт катэдры эканомікі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. У 2001 г. працаваў дарадцам місіі АБСЭ ў Беларусі.

Скарочаная, газэтная вэрсія артыкулу «Зьмяненьне палітычнага раскладу пасьля мясцовых выбараў і пэрспэктывы наступных выбарчых кампаній», што будзе цалкам надрукаваны ў жніўні на старонках кнігі «Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі».

і пэрспэктывы–2006

чаць асобныя пераканаўчыя перамогі яе прадстаўнікоў там, дзе адміністрацыйны рэсурс усё ж такі ўдалося «зламаць». Напрыклад, Алесь Міхалевіч з партыі БНФ, які стаў дэпутатам Пухавіцкай раённай рады з вынікам больш за 70% галасоў, зазначыў, што яго перамога стала магчымай дзякуючы пэрыяду «міжуладзьдзя» ў раёне, калі наноўпрызначаны старшыня адміністрацыі яшчэ не пасьпеў адрэгуляваць адміністрацыйнай машыны.

Апазыцыя зрабіла істотны крок для выхаду з сацыяльнай ізаляцыі. Аднак каб прарваць ізаляцыю палітычную, у беларускіх варунках мала проста заваяваць сымпатыі выбарцаў. Апазыцыя пакуль няздольная бараніць палітычныя посьпехі неінстытуцыйнымі сродкамі. Дый грамадзтва не імкнецца да абароны ўласнай волі, выказанай праз выбарчыя бюлетэні, на вуліцах.

Мабілізацыя грамадзтва на абарону вынікаў выбараў патрабуе ад апазыцыі іншага стылю перадвыбарнай кампаніі. Такая кампанія павінна не нагадваць руцінную акцыю, якая тычыцца толькі асобных кандыдатаў, а прыцягваць да сябе ўвагу ўсяго грамадзтва. Яна мусіць весьціся ня толькі ад імя адзінай сілы, зь якой грамадзтва магло б сябе атаясаміць. У адваротным выпадку, апазыцыйная кампанія ператвараецца ў «конкурс прыгажосьці» з удзелам асобных кандыдатаў. Таксама, каб на што-небудзь разьлічваць у гарадох, трэ было ствараць вялізарную перавагу ў дзясяткі адсоткаў над кандыдатамі ад улады.

Асноўная слабасьць палітычнай стратэгіі апазыцыі падчас выбарчай кампаніі — гэта праца партый у аўтаномным рэжыме. Сытуацыя ж патрабуе аб'яднаньня ўсіх дэмакратычных сілаў вакол супольнай ідэі і адзінага сцэнару. Прамоцыя партыйных брэндаў не ўраўнаважвалася прамоцыяй брэнду дэмакратычнай апазыцыі.

Гэтыя два недахопы і стварылі сытуацыю, пры якой у кампаніі адсутнічаў агульнанацыянальны элемэнт, а значыць, нягледзячы на ўдзел асобных кандыдатаў, апазыцыя, як палітычны фактар, была слаба ў ёй прадстаўленая. Гэта не дазваляла апазыцыі прыцягнуць увагу да атакаў улады на яе, рабіла мабілізацыю грамадзтва на супрацьстаяньне парушэньням загадзя немагчымай. Да таго ж, апазыцыя зацыклілася на буйных гарадох і не «апрацоўвала» сельскага электарату, на чым можна было б дасягнуць больш спрыяльнага для яе выніку.

Выкарыстаньне выбараў дзеля вырашэньня вузкапартыйных, карпаратыўных ці пэрсанальных задачаў у Беларусі беспэрспэктыўнае. Барацьба пры той тактыцы, якую абрала ўлада (а яна была цалкам прадказальная) — паводле прынцыпу «кожны сам за сябе», — была абсалютна бессэнсоўная. Безумоўна, магчымасьці дзеля пасьпяховай рэалізацыі іншай тактыкі існуюць. У адрозьненьне ад часоў трох-чатырохгадовай даўніны, калі само азначэньне «апазыцыя» было блага прадавальным палітычным брэндам, беларускае грамадзтва паступова пазбаўляецца ад нэгатыўных стэрэатыпаў што да яе. Так, у красавіку 2003 г. сукупны рэйтынг сямі асноўных апазыцыйных партыяў (ПКБ, АГП, БСДГ, БНФ, КХП-БНФ, БСДП, Партыя працы) упершыню перавысіў рэйтынг самога Лукашэнкі, падняўшыся да адзнакі ў 27%. Аднак той факт, што рэйтынг аніводнай з гэтых партыяў не перавышае ўзроўню статыстычнай памылкі, сьведчыць аб тым, што посьпеху можна будзе дасягнуць толькі пры адзінстве дзеяньняў.

Трэцяя сіла: больш міт, чым рэчаіснасьць

Размовы аб магчымасьці зьяўленьня новых суб'ектаў палітычнага працэсу ў альтэрнатыўным афіцыйнаму палітычным лягеры (пераважна з былых знакавых асобаў рэжыму, што перайшлі да больш незалежнага вызначэньня ўласнай палітычнай ролі) пачаліся яшчэ некалькі гадоў таму. Унутраны крызыс апазыцыі пасьля паразы 2001 г. толькі стымуляваў пошук такіх фігураў. «Традыцыйная» апазыцыя бачыла ў «трэцяй сіле» хіба што «пятую калёну» ўладаў ва ўласным лягеры. Аднак «нажніцы» паміж патэнцыйным і рэальным апазыцыйным электаратам у грамадзтве стваралі для яе ўзьнікненьня спрыяльную глебу. Абсалютным лідэрам у прэтэнзіях на стварэньне «трэцяй сілы» стала дэпутацкая група «Рэспубліка» ў палаце прадстаўнікоў, якая зь цягам часу ператвараецца ва ўсё больш заўважнага крытыка ўладаў.

- «Пераемнік» не ўтрымаецца перад спакусай выкарыстаць былога прэзыдэнта як «ахвярнага казла».

Меркаваньні, што «трэцяя сіла» можа ператварыцца ў пятую калёну ўладаў, былі абвергнутыя дзеяньнямі апошніх падчас мясцовых выбараў. Выціскаліся незалежныя кандыдаты, але ня менш рэзалі і патэнцыйную «фронду» — карпаратыўных лабістаў, прадпрымальнікаў, вылучэнцаў найбольш лібэральных дэпутатаў ПП. Так, не былі зарэгістраваныя кандыдатамі памочнікі дэпутатаў Кірылы Халопіка, Васіля Хрола, Аляксея Ваганава. Ня трапілі ў сьпіс прэтэндэнтаў у Менгарсавет Зьміцер Вус і Юры Данькоў — найбольш энэргічныя дэпутаты ранейшага скліканьня. Улады ўзброіліся тактыкай «Хто ня з намі (дакладней, не ад нас) — той супраць нас». У выніку ў Менску з 55 акругаў у 37 прысутнічаў толькі адзін беспартыйны кандыдат, і магчымасьць прасунуць патэнцыйна альтэрнатыўнага палітычнага гульца была зьведзеная на нішто. Выбарчыя камісіі атрымалі выразную ўстаноўку наконт таго, хто менавіта з кандыдатаў ішоў «ад улады». Гэткім чынам прэзыдэнцкая адміністрацыя імкнулася забясьпечыць фармальную легітымнасьць выбараў, разьлічваючы на высокі ўзровень грамадзкай антыпатыі да палітычных партыяў акурат у сталіцы, дзе 81% рэспандэнтаў дэкларавалі імкненьне прагаласаваць менавіта за беспартыйнага кандыдата, у адрозьненьне ад 73% па краіне.

Дэпутатам, што прэтэндавалі на незалежнасьць ад уладаў, было паказана, які сцэнар можа быць рэалізаваны да іх на парлямэнцкіх выбарах налета, калі яны ня выкажуць ляяльнасьці. Наступным крокам іх дэмаралізацыі стала распаўсюджваньне чутак аб тым, што на наступныя выбары рыхтуецца стоадсоткавая замена складу палаты. Дэпутаты-«франдзёры» сталі перад выбарам: ці адмовіцца ад незалежнай ролі, ці нейкім чынам арганізавацца і ўступіць у палітычную гульню. «Рэспубліка» апошнім часам ідзе па другім шляху. Яе зблiжэньню з палітычнымі партыямі спрыяла правядзеньне круглага стала зь іх удзелам у сьценах палаты прадстаўнікоў у лютым 2003 г. Сама тэма, «Незалежная Беларусь яднае нас», сьведчыць аб імкненьні да пошуку пэўнага палітычнага мінімуму, які б стаў асновай для мацаваньня кансэнсусу паміж усімі дэмакратычнымі і незалежніцкімі сіламі краіны. Зблiжэньне сьветапогляду зародкаў сыстэмнай і існай пазасыстэмнай апазыцыі відавочнае. Нарэшце, група «Рэспубліка» ў красавіку 2003 г. выступіла і з ініцыятывай аб стварэньні новай апазыцыйнай партыі.

Але ці значыць гэта, што на базе «фронды» ў ПП і ў мясцовых саветах узьнікае новая сыстэмная апазыцыя? Такі сцэнар разьвіцьця падзеяў выглядае малаімаверным зь некалькіх прычынаў.

«Фронда» ад апазыцыі розьніцца тым, што яна арыентаваная на рашэньне дробных праблем, а не на глябальнае зьмяненьне статус-кво. Яна можа сутыкнуцца зь яшчэ вастрэйшай праблемай адсутнасьці ўласнай палітычнай стратэгіі, чым «традыцыйная» апазыцыя. Па-другое, **у «фрондзе» будзе пераважаць намэнклятура**, якая ў беларускіх умовах адрозьніваецца асьцярожнасьцю, што мяжуе зь бяззубасьцю. Яе пераход у стан апазыцыі немагчымы, пакуль на здарыцца заўважнага аслабленьня пазыцыяў улады. Каб стаць рэальнай палітычнай сілай, ёй спатрэбяцца палітычныя структуры і пэўная ідэалёгія, якія яна можа пазычыць толькі ў дзейнай пазасыстэмнай апазыцыі. Аднак у ідэалягічным пляне існая **беларуская апазыцыя выразна структурызаваная, што робіць узьнікненьне новага брэнду малаімаверным** (аб чым ускосна кажа і папярэдняя назва партыі, якую плянуюць утварыць дэпутаты групы «Рэспубліка», — «За лепшае жыцьцё»). У апазыцыі прысутнічаюць усе магчымыя палітычныя плыні (кансэрватары, лібэралы, сацыял-дэмакраты, нават камуністы). Узьнікненьне новай сілы будзе азначаць пачатак барацьбы за існыя палітычныя брэнды. Дый **чалавечы патэнцыял апазыцыйнага асяродзьдзя і няўрадавага сэктару выключна абмежаваны**. Таму фармаваньне новых структураў можа вырасьці і ў канкурэнцыю за чалавечыя рэсурсы. Што тычыцца пэрспэктываў зьліцьця сыстэмнай і пазасыстэмнай апазыцыі, то гэтаму працэсу можа быць выстаўлены жорсткі супраціў сёньняшніх партыйных лідэраў у выпадку, калі ён будзе пагражаць зьменай улады ў палітычных партыях.

Нарэшце, паступовае размываньне сацыяльнага «балота» пазбаўляе патэнцыйную «трэцюю сілу» электаральных рэсурсаў, бо **ўзьніклай антылукашэнкаўскай электаральнай бальшыні занадта «мяккая» апазыцыя можа быць чужая**. А выбары-2003 паказалі, што і інсайдэрскія рэсурсы ўнутранай «фронды» былі перабольшаныя — гэтаксама, як два гады таму перабольшваліся рэсурсы «намэнклятуры».

Таму найбольш рэальны шлях узмацненьня апазыцыі — гэта кааліцыйная праца і яе якаснае ўмацаваньне ў рамках існых структураў (магчыма, з абнаўленьнем складу галоўных палітычных актораў у іх шэрагах), а не стварэньне новых, якія, дарэчы, могуць быць проста зьліквідаваныя «ў зародку» — яшчэ на этапе іх рэгістрацыі. Але ўзмацненьне апазыцыі немагчымае без пашырэньня яе кадравага складу і выпрацоўкі трывалых прынцыпаў ды мэханізмаў каардынацыі і аб'яднаньня замест тых, што не перажылі палітычнага сэзону-2001.

Пэрспэктывы разьвіцьця палітычнай сытуацыі

Ва ўмовах страты папулярнасьці ўладам не застаецца іншага выйсьця, як пераўтварыць і парлямэнцкія, і прэзыдэнцкія выбары ў рытуальную працэдуру з запраграмаваным вынікам. Вельмі імаверна, што гэта адбудзецца па ўжо вядомым сцэнары: адсячэньне найбольш рэальных кандыдатаў і палітычных структураў на стадыі рэгістрацыі і давяршэньне справы падчас галасаваньня сродкамі абсалютнага кантролю над выбарчымі камісіямі і падлікам галасоў. Абсалютная манапалізацыя кантролю за выбарчым працэсам пакуль што робіць пэрспэктыву шокавых выбараў у Беларусі малаімавернай. Як трапна заўважыў Валер Карбалевіч, апазыцыя можа ніколі не даведацца аб уласнай перамозе. У той жа час, калі працягнецца заўважнае апошнія паўтара году зьмяненьне балянсу сілаў паміж прыхільнікамі і апанэнтамі рэжыму на карысьць апошніх, будзе расьці і імавернасьць таго, што мэханізмы адміністрацыйнага рэсурсу рана ці позна не спрацуюць. Застаецца толькі даведацца, адбудзецца гэта да ці пасьля 2006 г.

- Барацьба пойдзе на выжываньне, а стаўкай будзе не прэзыдэнцкі фатэль, а лёс палітычнага рэжыму.

Пэрспэктывы палітычнага разьвіцьця краіны, таксама і як ход найбліжэйшых выбарчых кампаній, вызначацца пасьля таго, як вырашыцца галоўнае ў 2003 г. палітычнае пытаньне: ці адбудзецца рэфэрэндум па працягу прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў?

Стварыўшы пэрсаналізаваную сыстэму ўлады, у якой адзін чалавек увасабляе ўвесь палітычны рэжым, Лукашэнка фактычна ня можа дазволіць сабе мець пераемніка. Пераемнік выконвае дзьве функцыі. Першая — гэта захаваньне ўсталяваных правілаў палітычнай гульні. Другая — гэта захаваньне балянсу сілаў, які склаўся ў рамах папярэдняга кіраваньня. Парадокс беларускай сытуацыі, дзе прэзыдэнт — аднаасобны ўладар дзяржавы, у тым, што акурат кансэрвацыя правілаў гульні, іншымі словамі, палітычных інстытутаў, пры любым новым прэзыдэнту карэнным чынам зьмяняе палітычны расклад. Калі Лукашэнка перадае пераемніку нічым не абмежаваную ўладу, ён сам і яго атачэньне робяцца бездапаможнымі перад гэтай уладай. Нельга выключаць, што «пераемнік» не ўтрымаецца перад спакусай выкарыстаць былога прэзыдэнта як «ахвярнага казла» за тыя цяжкасьці, зь якімі сутыкнецца краіна ў постлукашэнкаўскую эпоху.

Вынік рэфэрэндуму, калі ён усё ж адбудзецца, ня можа выклікаць ілюзіяў, нягледзячы нават на непрыманьне гэтай ідэі беларускім грамадзтвам. У беларускіх умовах галоўны чыньнік перамогі на выбарах і рэфэрэндумах — не галасаваньне, а падлік галасоў. Пры любым выніку рэфэрэндуму (і гэтым ён адрозьніваецца ад выбараў) кіраўнік дзяржавы застаецца на сваёй пасадзе пасьля яго правядзеньня як мінімум да канца свайго тэрміну паўнамоцтваў. А значыць, што на любога прадстаўніка ўлады, які не забясьпечыў спадзяванага выніку, з боку прэзыдэнцкіх структур адразу абрынуцца рэпрэсіі. Таму фармат магчымага рэфэрэндуму-2003 ня будзе кардынальна розьніцца ад усенароднага галасаваньня ў лістападзе 1996 г.

Гіпатэтычна перашкодзіць правядзеньню рэфэрэндуму могуць наступныя акалічнасьці. Першая — гэта рэзкі рост сацыяльнай напружанасьці ў грамадзтве. Малапапулярная палітычная кампанія можа справакаваць пераўтварэньне пасіўнай, падсподнай сацыяльнай апазыцыі ў актыўную і яўную. Але вельмі малаімаверна, што чыньнікі для такога разьвіцьця падзеяў складуцца за кароткі адрэзак часу. Больш імаверным уяўляецца сцэнар, пры якім Лукашэнка не рызыкне пайсьці на рэфэрэндум, калі ня здолее атрымаць замежнай палітычнай і фінансавай падтрымкі, у першую чаргу — з боку Расеі.

Аднак нават і без блаславеньня расейскай палітычнай эліты Лукашэнка ўсё ж можа наважыцца правесьці рэфэрэндум. Ідучы на гэта ўва ўмовах ужо поўнай ізаляцыі, ён сур'ёзна рызыкуе. Тры гады могуць аказацца дастатковым тэрмінам, каб змабілізаваць намаганьні ўнутранай апазыцыі і замежных гульцоў, зацікаўленых у зьмене палітычнага рэжыму ў Беларусі. Таму ня выключаны і варыянт датэрміновых прэзыдэнцкіх выбараў пасьля рэфэрэндуму, шанцы прайграць якія ў Лукашэнкі мінімальныя. Бо апазыцыю і замежных актораў такое разьвіцьцё падзеяў можа засьпець зьнянацку. Калі ажыцьцявіцца гэты сцэнар, канфрантацыя паміж прыхільнікамі і апанэнтамі існага рэжыму надоўга пяройдзе ў поле пазасыстэмнай палітыкі.

Калі ж абмежаваньне тэрмінаў прэзыдэнцтва ня будзе скасавана, Лукашэнку не застанецца нічога іншага, як прызначыць умоўнага пераемніка і дачакаць канца ўласных паўнамоцтваў у 2006 г. Тады Беларусь найхутчэй чакае палітычная стагнацыя, пры якой сыстэма ўлады перажыве толькі касмэтычныя зьмяненьні, а базавы расклад сілаў паміж дзяржбюракратыяй з аднаго боку і дэмакратычнай апазыцыяй ды грамадзтвам зь іншага застанецца нязьмененым. Улада пяройдзе да лукашэнкаўскай намэнклятуры.

Працяг на старонцы 14.

30 траўня пятніца

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Паварот ключа». Сэрыял.
9.10, 17.00 «72 гадзіны». Дэтэктыўны сэрыял.
10.00 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Кухня КВК.
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 А.Абдулаў у экранізацыі апавяданьня А.П.Чэхава «Пацалунак». («Масфільм»).
15.20 Сэрыял «Прыгадай пра будучыню».
15.45 5 цудаў.
15.55 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял.
16.20 5х5.
19.05 Маст. фільм «Рэпэтытар». («Беларусьфільм»).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Дэтэктыў «Макс і бляхары» (Францыя).

● СТВ

5.30 Музычны канал.
6.00 «Вялікія грошы».
6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.25 «24 гадзіны».
7.50, 19.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 23.45 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Паліцэйская гісторыя».
9.55 «Турпаход».
10.05 «Беларусь на перакрыжаваньні стагодзьдзяў». Дак. фільм, 2-я частка.
10.55, 20.40 «Аўтапанарама».
11.10 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста на жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Правінцыялы». Тэлесэрыял.
14.40 «Біттлборгі». Тэлесэрыял.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: кінараман «Вечны покліч», 1-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: камэдыя «Паштоўкі з краю бездані». ЗША, 1990.
23.55 «Навіны СНД».
23.10 Праект «Адлюстраваньне»: «Вяртаньне ў Норд-Ост». Дак. фільм.
23.55 Кіно: камэдыя «Сэкс-клён».

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.оній».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Камэдыйны баявік «Забойная сіла: Роля другога плану».
10.45 Прэм'ера АНТ: «Бяз зэрміну даўнасьці». «Брудныя танцы». Дак. дэтэктыў.
11.10 Камэдыйны баявік «Забойная сіла: Крадзьт даверу».
12.05, 22.05 «Фабрыка зорак-2».
12.35 Сэрыял «Твінісы».
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
16.55 Вялікае мыцьцё.
18.10 Дак. дэтэктыў. «Адмычка для кашалькоў». Справа 2003 г.
18.35 Гумарыстычная праграма «Самі з вусамі».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.45 Камэдыя «Апэрацыя «З Новым годам!».

● РТР

7.45 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40 Тэлесэрыял «Людзі і цені-2».
9.40 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 18.50 Весткі.
17.50 «Аншлаг».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Маст. фільм «Тайны палацавых пераваротаў. Расея, стагодзьдзе XVIII...». «Я — імпэратар». 2000 г.
21.25 300-годзьдзе Санкт-Пецярбургу. Гала-канцэрт у Марыінскім тэатры.

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Найноўшая гісторыя. Санкт-Пецярбург. Пасьведчаньне на права жыхарства».
10.15 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Каманда.ru».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «І цэлага сьвету мала».
22.35 Прэм'ера. Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. Праект Л.Парфёнава «Расейская імпэрыя. Мікалай II», 3-я частка.

● Культура

15.10 «Урокі расейскай». М.Лермантаў. «Герой нашага часу». Чытае К.Лаўроў.
15.45 Э.Элгар. Інтрадукцыя і алегра.
16.00 «Парыскі часопіс».
16.25 «Людзі і ролі. Гендэрны фармат». «Жанчыны-падзёншчыцы» (Узбэкістан, 2002). «Заўтра будзе лепш?» (Літва, 2003). Дак. фільмы.
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Паўдзённыя сны».
18.25 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.05 «Дапамажыце Тэлеку».
19.10 «Бабуля ўдава». Мультфільм.
19.20 45 гадоў з дня нараджэньня актрысы. «Успамін пра Лену Маёраву».
19.50 «Парад плянэт». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Флярко́ўскім.
23.25 «Хто там...».

● Эўраспорт

9.30 Горны вэлясыпэд. Сант Вэндэль.
10.00 Гольф. US PGA. Паўтор.
11.00 Тэніс. Легенды Ралян Гаросу. Граф-Санчэс.
12.00, 17.30 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 5-ы. Жывая трансьляцыя.
15.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 19-ы этап. Жывая трансьляцыя.
22.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 5-ы. Агляд.
23.00 Формула. Аўтаспартовы часопіс.
23.30 Супэргоначны ўікэнд. Часопіс.
0.00 Баявыя адзінаборствы. Баі. Паўтор.
1.15 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

31 траўня субота

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.35 Экран індыйскага кіно. «Чацьвёра адчайных». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.30 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Менскага раёну.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Жупраны. Край зуброў».
12.55 Сола для дэбютанта. Вікторыя Трэнас (паэтка).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 Дак. сэрыял «Пары і дуэты». 1-я сэрыя.
14.00 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія).
15.15 «Жывы тавар. Нядорага...». Відэафільм АТН.
15.35 Кухня КВК.
15.50 «Містэр Бін». Сэрыял.
16.15 КВК. 1/8 фіналу Эўралігі.
17.50 «Маршрут №...».
17.55 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Касірка», «Стол і кроў» (Вялікабрытанія).
18.35 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.00 Прэм'ера. Драма «Прыкаваны» («Беларусьфільм»).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.05 Драма «Дурняў няма» (ЗША).
23.55 Начны музычны этэр.

● СТВ

7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00, 15.55 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50, 19.50 СТВ-спорт.
9.00 «Рэактыўны бокс».
9.20 «Адпачывай».
9.30 Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай.
9.55 Кіно: казка «Падзямельле дракона», частка1-я. ЗША, 2000.
10.55 «Разам».
11.20 «Рамонт».
11.35 «Філярманічны тыдзень».
11.40, 20.10 Тэлесэрыял: «Месца сустрэчы зьмяніць нельга».
12.50 «Плянэта людзей».
13.05 «Кіно»: камэдыя «Беражыце мужчын!».
14.55 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.25 «Усё для цябе».
17.00 «Запрашаем паскардзіцца».
17.10 «Аўтапанарама».
17.30 Кіно: камэдыя «Паміж анёлам і бесам».
19.30 «24 гадзіны».
21.25 Кіно: драма «Краіна глухіх».
23.25 «Навіны СНД».
23.40 Кіно: трылер «Памятай». ЗША, 2000.

● Першы музычны канал

8.00, 12.30 Рухач.
12.00 «Сіла цягі».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 12.00 Навіны.
8.10 Аркадзю Райкіну прысьвячаецца.
9.00, 10.15 «Добрай раніцы, Санкт-Пецярбург!».
10.00, 15.00 Навіны (з субтытрамі).
11.15 Пакуль усе дома.
12.15 «Сканэр».
12.45 Трагікамэдыя «Восеньскі маратон».
14.30 «Куміры».
15.15 Прэм'ера. Дак. фільм «Дэкарацыі для жыцьця».
15.45 «Сьмехапанарама» Пецярбургу.
16.30 Камэдыя «Неймаверныя прыгоды італьянцаў у Расеі».
18.25 Прэм'ера. «Бурштынавы прывід».
19.15 «Піцерскія жартуюць».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?». Спэцвыпуск.
21.55 Што? Дзе? Калі?
23.20 Вялікая прэм'ера. Фільм Аляксандра Сакурава «Расейскі каўчэг».
1.00 Маст. фільм «Піцерскі рок».

● РТР

8.25 «Ранішняя пошта».
9.00, 17.00, 20.15, 20.15 300-годзьдзе Санкт-Пецярбургу. Трансьляцыя юбілейных урачыстасьцяў.
9.30 «Гарадок». Дайджэст.
10.00 «Сто да аднаго».
11.00 «Сам сабе рэжысэр».
11.55 «У пошуках прыгод».
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Лецішча».
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Крылы Саветаў» (Самара) — ЦСКА. Жывая трансьляцыя з Самары.
18.00 «Аншлаг».
19.00 Весткі.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.55 Сусьветнае кіно. Крымінальная драма «Таорыя змовы» (ЗША). 1997 г.

● НТВ

9.05 «Кулінарны паядынак».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00 «Сёньня».
11.15 Прафэсія — рэпарцёр.
11.40 «Служба выратаваньня».
12.15 Дэтэктыў «Бінт».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.00 «Сёньня».
15.20 Спорт. «Лято 6 з 49».
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Камэдыя «Дзень бацькі».
18.00 Прэм'ера. «Злачынства ў стылі «мадэрн». Першае замоўленае».
18.45 Дэтэктыў «Сышчыкі-2. Тайна восеньскага лесу».
20.00 «Асабісты ўклад».
21.00 Баявік «Уцекачы».
23.05 Супэрбокс. Заб Джуда супраць Рэджы Грына.

● Культура

11.10 Пецярбург-300. «Рыбны дзень». Дак. фільм.
11.25 ГЭГ.
11.40 «Графаман».
12.10 Дзіцячы сэанс. «Казка пра страчаны час». Маст. фільм.
13.25 «Дар даждждоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 9-ы. «Лімпапо. Рака гігантаў».
13.55 130 гадоў з дня нараджэньня С.Сабашнікава. «Стрэл у Арбацкім завулку».
14.35 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. Ф.Гарэнштэйн. «Казаньне пра цара Салтана ды цара Пятра і забітага сына яго Аляксея». Прэм'ера тэлевэрсіі спэктаклю.
16.25 Магія кіно.
16.50 «У вашым доме».
17.30 «Сфэры».
18.10 70-гадоў з дня нараджэньня Г.Буркова. «Астравы».
18.50 «Гараж». Маст. фільм.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Амэрыканская рапсодыя». Маст. фільм (ЗША, 1997).
23.05 «Сага францускага шансону». Жыльбэр Бэко.

● Эўраспорт

10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Чвэрцьфіналы. Паўтор.
12.00, 18.30 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 6-ы. Жывая трансьляцыя.
16.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 20-ы этап. Жывая трансьляцыя.
21.00 Формула—3000. Монтэ-Карла.
22.00 Футбол. Кубак нацый. Кубак Францыі. Фінал. Жывая трансьляцыя.
0.45 Экстрэмальныя віды спорту.
1.45 Бокс. Паўтор.

IREX-PROMEDIA

31 траўня ў Міры адбудзецца навукова-практычная канфэрэнцыя на тэму «Матэрыяльная й духоўная культура замкаў Беларусі» і выстава партрэтаў князёў з роду Радзівілаў. У аднадзённым фэсьце возьмуць удзел прадстаўнікі рыцарскіх клюбаў, камэрныя калектывы Дзяржаўнага канцэртнага аркестру пад кіраўніцтвам Міхала Фінбэрга, фальклёрныя калектывы і інш.

1 чэрвеня нядзеля

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.05 Альхімія слова.
9.10 «Суэор'е надзеі». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. «Чацьвёра адчайных». 2-я сэрыя.
11.10 Сад мары.
11.45 Музэюм. «Жырандоль П.Багрыма».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 Сьвятыні Беларусі. «Крыж Эўфрасіньні Полацкай».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія).
15.15 «Лёс чалавека».
15.45 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.40 Маст. фільм для дзяцей «Маленькі баец». («Беларусьфільм»).
18.10 Кліп-абойма.
18.50 Камэдыя «Сэрцаедкі» (ЗША).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.15 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Антоніё Тарвэр — Мантэл Грыфін. Трансьляцыя з ЗША.
23.10 Камэдыя «Некалькі дзён са мной» (Францыя).

● СТВ

7.30, 16.00 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00, 16.25 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.05 «Менск і менчукі».
9.15 «Партрэт у інтэр'еры».
9.30 «Аўтапанарама».
9.50 Кіно: казка «Падзямельле дракона», частка 2-я. ЗША, 2000.
10.45 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
11.10 «Добры дзень, доктар!».
11.25 «Сьвецкая хроніка».
11.35, 20.35 Тэлесэрыял «Месца сустрэчы зьмяніць нельга». СССР,1979.
12.50 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.05 «Кіно»: прыгодніцкі фільм «Галава Гаргоны».
15.00 «Дружная сямейка». Сэрыял.
17.00 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «Усё для цябе».
18.45 «168 гадзін».
19.30 «Пакуль гарыць сьвечка».
20.00 «Асабісты інтэрас».
21.50 «24 гадзіны».
22.10 «Турпаход».
22.20 Кіно: камэдыя «Рабаваньне». Францыя, 1985.
0.10 «Навіны СНД».
0.25 Канцэрт «Сусьветныя зоркі».

● Першы музычны канал

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў».
13.00 «Пра Fashion».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 «Ералаш».
8.30 Армейскі магазын.
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
12.00 «Гойка Міціч — сапраўдны індзець».
12.25 «Клюб падарожнікаў».
13.05 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Валадар смаку».
15.15 Ток-шоў «Выбар».
15.55 АНТ прадстаўляе. Дабрачынны канцэрт да Дня абароны дзяцей.
17.30 АНТ прадстаўляе. Фінал этапу Кубку сьвету па конным спорце.
18.15 КВК-2003. Вышэйшая ліга.
20.30 Контуры.
21.10 Прэм'ера АНТ: «Беларусы ў Афрыцы. Ралі па Сахары». Частка 3-я.
21.35 Арнольд Шварцэнэгер у камэдыйным баевіку «Дзэтсадаўскі паліцэйскі».
23.35 Прэм'ера. Тэатар лялек зь Міхаілам Лявонцьевым.
0.00 Часы.

● РТР

9.15 «Гарадок». Дайджэст.
9.50 300-годзьдзе Санкт-Пецярбургу. Трансьляцыя юбілейных урачыстасьцяў.
10.20 Камэдыя «Прага золата» (Францыя). 1993 г.
12.10 «Парлямэнцкая гадзіна».
13.00 Весткі.
13.20 «Вакол сьвету».
14.15 «Дыялёгі пра жывёл».
15.20 «Сьвет на мяжы».
15.50 «Пакой сьмеху».
16.50 Вялікі сьвяточны канцэрт «Дарослыя і дзеці».
18.50 «У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 «Спэцыяльны карэспандэнт».
20.35 Сусьветнае кіно. Маст. фільм «Адвакат д'ябла» (ЗША). 1997 г.
23.25 300-годзьдзе Санкт-Пецярбургу. Канцэрт Аляксандра Разенбаўма на Дварцовай плошчы.
0.15 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Манака. Трансьляцыя з Монтэ-Карла.

● НТВ

8.55 Сэрыял «Каханьне ўдаўца».
9.50 «Вы будзеце сьмяяцца!».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Уплыў».
12.05 Камэдыя «Нікчэмная мітусьня».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 Гуляем у «Кено».
15.20 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.35 Дэтэктыў «Насуперак усяму!».
18.00 Прэм'ера. «Злачынства ў стылі «мадэрн». Забойства праз пярсьцёнак».
18.45 Дэтэктыў «Сышчыкі-2. Ангельскі імпэт».
20.00 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
21.30 Фільм тыдня. Прэм'ера. Прыгодніцкі фільм «Роб Рой».
0.10 Сэрыял «Клан Сапрана».

● Культура

11.05 «Рыцары сьмеху». «Камічнае трыё».
11.35 Нядоўгія гісторыі.
11.50 Дзіцячы сэанс. «Прыгоды чароўнага глёбуса, ці Хітрыкі ведзьмы». Мультфільм.
12.55 Міжнародны дзень абароны дзяцей. Заключны гала-канцэрт фэстывалю дзіцячай творчасьці «Надзея».
13.25 «Дар даждждоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 10-ы. «Руфіджы. Вечная рака».
13.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
15.15 Міжнародны дзень абароны дзяцей. «Маці Ўладзімерская». Дак. фільм.
15.45 Зорныя гады «Ленфільму».
16.25 «У агні броду няма». Маст. фільм.
18.00 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. Трансьляцыя гала-канцэрту Акадэмічнага сымфанічнага аркестру Санкт-Пецярбурскай філярмоніі.
20.45 «Кішэнь». Кароткамэтражны маст. фільм.
21.00 «Болей чым каханьне».
21.40 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
22.05 «Культ кіно». «Два капітаны-2». Маст. фільм.
23.25 «Джазафрэнія».

● Эўраспорт

9.30 Аўтагонкі сэрыі КАРТ. Вэст-Аліс.
10.30 Футбол. Кубак нацый. Кубак Францыі. Фінал. Паўтор.
12.00, 18.15 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 7-ы. Жывая трансьляцыя.
16.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 21-ы этап. Жывая трансьляцыя.
21.30 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Шарлот.
22.30 Бокс. Паўтор.
23.45, 0.45 Супэрбайк. Нямеччына. Спэцагляд.
0.15 Супэрспорт. Нямеччына. Спэцагляд.
1.15 Матакрос. Чэмпіянат сьвету. Італія.

2 чэрвеня панядзелак

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
9.10, 17.05 «72 гадзіны». Сэрыял.
10.05 Плянэта АРТ.
10.30 Кліп-абойма.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15 Панарама: падзеі тыдня.
13.05 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
13.20 Мэлядрама «Фруза» («Беларусьфільм»).
14.50 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Як дзед па дождж хадзіў». Мультфільм («Беларусьфільм»).
15.20 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
15.45 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
16.10 Мультыклюб.
16.50 5 цудаў.
18.25 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Менск) — «Шахцёр» (Салігорск). Жывая трансьляцыя.
20.30 З дакладных крыніц.
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начная размова.
0.15 Драма «Свой крыж».
2.55 Хакей. Кубак Стэнлі. Фінал. Жывая трансьляцыя з ЗША.
5.35 Дак. фільм «Вяртаньне ў рай».

СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20 «168 гадзін».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.55 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: камэдыя «Паштоўкі з краю прорвы». ЗША, 1990.
10.00 «Турпаход».
10.10 «Асабісты інтэрас».
10.45 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
11.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.30, 16.00, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
13.50, 18.35 «Правінцыялы». Тэлесэрыял.
14.40 «Дзятлоw's». Мультсэрыял.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: кінараман «Вечны покліч».
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Партрэт у інтэр'еры».
18.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
19.50 «СТВ-спорт».
20.10 «Гульнявы рэфлекс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 Кіно: Джон Траволта ў фантастычным баевіку «Поле бітвы — Зямля». ЗША, 2000.
23.05 «Навіны СНД».
23.20 «Сталічны футбол зь Сяргеем Сафар'янавым».
23.40 Кіно: фільм жахаў «Я ўсё яшчэ ведаю, што вы зрабілі мінулым летам». ЗША, 1998.

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 22.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
18.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.50 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.45 Камэдыйны баявік «Дзетсадаўскі паліцэйскі». ЗША, 1990 г.
11.35. 23.50 «Фабрыка зорак-2».
12.05 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Чалавек і закон.
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.45 Маст. фільм «Па той бок ваўкоў».
23.05 Тайны стагодзьдзя. «Зьніклая экспэдыцыя Ракфэлера».

РТР

7.45 Камэдыя «Самалётам, цягніком, аўтамабілем» (ЗША). 1987 г.
9.30 «Экспэртыза».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.0. 19.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
20.55 Прэм'ера. «Пані Перамога».
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.
23.20 Вячэрні сэанс. Баявік «Ідэальная зброя» (ЗША). 1991 г.

Культура

17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Улада факту.
18.25 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Час сабору». Дак. сэрыял. Фільм 7-ы. «Ісаакіеўскі сабор».
18.55 «Дапамажыце Тэлеку».
19.05 «Маленькая вядзьмарка». Мультфільм.
19.30 Час музыкі.
20.10 А.Пушкін. «Завіруха». Тэлеспэктакль.
21.25 «Тым часам».
22.05 Ток-шоў «Школа зласлоўя».
23.00 Навіны культуры.
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 «Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Жаночы погляд».
17.10 «Увага. Вышук!».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Скарбы мёртвых».
19.45 «Дальнабойнікі. Расейскі канвой».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе» (ЗША).
22.20 «Жывы Пушкін». Праграма Л.Парфёнава. Частка першая.
23.25 «Сёньня».

Эўраспорт

9.30 Футбол. Кубак нацый. Кубак Францыі. Фінал. Паўтор.
11.00 Тэніс. Легенды Ралян Гароса. Сэлеш-Граф. Паўтор.
12.00 Тэніс. Легенды Ралян Гароса. Граф-Хінгіс.
13.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 8-ы. Жывая трансьляцыя.
21.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 8-ы.
22.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 8-ы. Спэцыяльны агляд.
23.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
0.45 Футбол. Спэцыяльны агляд.
1.15 Веславаньне. Чэмпіянат сьвету. Мілян.

3 чэрвеня аўторак

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 «Паварот ключа». Сэрыял.
9.10, 17.10 «72 гадзіны». Сэрыял.
10.05 Існасьць. Духоўная праграма.
10.30 «Пары і дуэты». Дак. сэрыял.
10.55 З дакладных крыніц.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.30 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Сацыяльная драма «Сын старшыні». («Беларусьфільм»).
15.15 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял.
15.40 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Каму чорт дзетак люляе», «Ліса, мядзьведзь і мужык». Мультфільмы («Беларусьфільм»).
16.00 Прыгодніцкі фільм «Корцік». («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
18.20 Хакей. Кубак Стэнлі. Фінал. Трансьляцыя з ЗША.
20.50 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Конны спорт. Міжнародныя спаборніцтвы па трохбор'і.
0.05 Начны этэр.

СТВ

7.20 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.50 «СТВ-спорт».
8.10 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: фантастычны баявік «Поле бітвы — Зямля». ЗША, 2000.
10.15 «Гульнявы рэфлекс».
10.25 «Сталічны футбол зь Сяргеем Сафар'янавым».
10.45 «Пакуль гарыць сьвечка».
11.15, 23.15 Праект «Адлюстраваньне»: «Звалка». Дак. фільм.
12.00, 12.45 «Віно каханьня». Тэленавэла.
13.50, 18.35 «Правінцыялы». Тэлесэрыял.
14.40 «Дзятлоw's». Мультсэрыял.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
16.15 «Кіно»: кінараман «Вечны покліч».
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Добры дзень, доктар!».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Закон і крымінал».
20.50 Кіно: баявік «Пацукі, ці Начная мафія».
23.00 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: трылер «Па сьледзе маньяка». Канада—ЗША, 1997.

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00 «120/80».
9.10 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
16.00 «20-ка Першых».
17.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.35 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.30 Шматсэрыйны фільм «Па той бок ваўкоў».
10.45, 23.50 «Фабрыка зорак-2».
11.15 Дыснэй-клюб: «Лойд у космасе».
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Дак. сэрыял «Спэцназ». «Браняпоезд XXI стагодзьдзя».
20.00 Час.
21.00 «Ня толькі пра футбол». Спартовы агляд.
21.25 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
0.10 «На футболе».

РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40, 20.55 Тэлесэрыял «Пані Перамога».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 Весткі — Спорт.
22.40 Вячэрні сэанс. Мэлядрама «Польская прыгажуня» (ЗША). 1997 г.

Культура

15.10 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя».
15.40 «Ляціце, галубы, ляціце». Канцэрт.
16.30 «У пошуках Траянскай вайны». Дак. сэрыял. 2-я сэрыя. «Легенды, схаваныя за аблогай Троі».
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
18.00, 19.05, 20.10, 20.55 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. Дж.Вэрдзі. «Травіята». Трансьляцыя з Марыінскага тэатру.
18.45 «Дапамажыце Тэлеку».
19.50 «Тэатар аднаго мастака». «Род». Рыгор Аасроўскі.
20.40 «Pro memoria». «Хоку».
21.35 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Віват, Пецяргоф!»
22.05 «Што рабіць?».
23.00 Навіны культуры.
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Злачынства ў стылі «Мадэрн». Першае заказное».
10.10 «Расьліннае жыцьцё».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога» (ЗША).
17.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Скарбы мёртвых».
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Хімія і жыцьцё».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».
22.25 «Жывы Пушкін». Праграма Л.Парфёнава. Частка другая.
23.15 «Сёньня».

Эўраспорт

9.30 Веславаньне. Чэмпіянат сьвету. Мілян. Паўтор.
10.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
12.00 Тэніс. Легенды Ралян Гаросу. Куэртэн-Мустэр.
13.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 9-ы. Жывая трансьляцыя.
21.00 Тэніс. Адкрыты Чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 9-ы.
22.00 Тэніс. Адкрыты Чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 9-ы. Спэцыяльны агляд.
23.00 Бокс. TBA.
1.15 Гонкі на матацыклах. Асэн.
1.45 Супэргоначны ўік-энд. Часопіс. Паўтор.

4 чэрвеня серада

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 «Рабі дабро». Дак. фільм.
9.10, 17.10 «72 гадзіны». Сэрыял.
10.05 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Менскага раёну.
10.30 Здароўе. Тэлечасопіс.
10.55 Сола для дэбютанта. Андрэй Карэлін (драматург).
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.20 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Кінааповесьць «Зімародак» («Беларусьфільм»).
14.45 «Масква — Менск».
15.15 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял.
15.40 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Рэактыўнае парася». Мультфільм («Беларусьфільм»).
15.55 Прыгодніцкі фільм «Корцік» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
18.15 «Паварот ключа». Сэрыял.
19.05 Баявік «Праект «Альфа».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 19.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 23.05 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Пацукі, ці Начная мафія».
10.00 «Запрашаем паскардзіцца».
10.10, 23.30 Праект «Адлюстраваньне»: «Кругасьветка». Дак. фільм.
10.55, 20.30 «Аўтапанарама».
11.10 «Закон і крымінал».
11.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Правінцыялы». Тэлесэрыял.
14.40 «Дзятлоw's». Мультсэрыял.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 «Кіно»: кінараман «Вечны покліч».
18.05 «Плянэта людей».
18.20 «Дзед Бухаркін». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
20.05 «Турпаход».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Шчасьлівыя выпадкі». ЗША, 2000.
23.15 «Навіны СНД».
0.15 «Ілюзіён»: прыгодніцкі фільм «Марскі ястраб». ЗША, 1940.

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «Пра Fashion». Модная праграма.
23.15, 1.00 МэгаМікс.
0.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Ня толькі пра футбол». Спартовы агляд.
10.10, 22.05 Шматсэрыйны фільм «Па той бок ваўкоў».
11.05, 23.25 «Фабрыка зорак-2».
11.35 Дыснэй-клюб: «Лойд у космасе».
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Беларусы ў Афрыцы. Ралі па Сахары». Частка 3-я.
18.35 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.00 «Слабае зьвяно».
23.45 Прэм'ера. Дак. фільм «Асаблівасьці нацыянальнага футболу».

РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40, 20.55 Тэлесэрыял «Пані Перамога».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 Весткі — Спорт.
22.40 Вячэрні сэанс. Маст. фільм «Гадзіньнікі бяз стрэлак». 2001 г.

Культура

15.10 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя».
15.40 Грае В.Фэльцман (фартэпіяна, ЗША).
16.05 «Арт-панарама».
16.30 «У пошуках Траянскай вайны». Дак. сэрыял. «Пясьняр казаньняў».
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Айчына й лёсы».
18.25 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Час сабору». Дак. сэрыял. «Сабор сьвятых апосталаў Пятра і Паўла».
18.50 100 гадоў з дня нараджэньня Яўгена Мравінскага. Д.Шастаковіч. Сымфонія №8. Выконвае Акадэмічны сымфанічны аркестар Ленінградскай філярмоніі.
19.55 «Злачынства і пакараньне». Маст. фільм.
21.25 100 гадоў з дня нараджэньня маэстра. «Валадар аркестру. Яўген Мравінскі». Дак. фільм.
22.20 Навіны культуры.
22.45 XIV Адкрыты расейскі кінафэстываль «Кінатаўр».

НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00 «Кулінарны паядынак. Пецярбург — Самара».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Шчырае прызнаньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Прыгодніцкі сэрыял «Скарбы мёртвых».
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Экспэдытар».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».
22.20 «Жывы Пушкін». Праграма Л.Парфёнава. Частка трэцяя.
23.10 «Сёньня».

Эўраспорт

9.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
11.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
12.00 Тэніс. Легенды Ралян Гаросу. Агасі—Мядзьведзьеў.
13.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 10-ы. Жывая трансьляцыя.
21.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 10-ы.
22.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Дзень 10-ы. Спэцыяльны агляд.
23.15 Конны спорт. Кубак нацый. Сэн-Гален.
0.15 Гольф. US PGA.
1.15 Ветразевы спорт. Гонкі на яхтах.

5 чэрвеня чацьвер

БТ

6.00, 7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00, 18.15 «Паварот ключа». Сэрыял.
8.45 Віншаваньне міністра адукацыі Рэспублікі Беларусі П.Брыгадзіна ў сувязі з заканчэньнем школьных заняткаў і пачаткам выпускных іспытаў.
8.50 Выпускны экзамэн па матэматыцы за курс сярэдняй школы ў агульнаадукацыйных і спэцыяльных установах.
9.10, 17.10 «72 гадзіны». Сэрыял.
10.05 Сьвятыні Беларусі. «Крыж Эўфрасіньні Полацкай».
10.30 Лёс чалавека. «Аркадзь Корбут».
10.55 Музэюм. «Жырандоль П.Багрыма».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.35 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Драма «Рэйнджэр з атамной зоны». («Беларусьфільм»).
14.50 Слова мітрапаліта Філарэта на сьвята Ўзьнясеньня Гасподняга.
15.15 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял.
15.40 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Сьвяточныя аповеды», «Дзяўчынка з запалкамі». Мультфільмы («Беларусьфільм»).
16.00 Прыгодніцкі фільм «Корцік» («Беларусьфільм»). Заключная сэрыя.
19.05 Мэлядрама «Сад» («Беларусьфільм»).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Тэма дня».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: мэлядрама «Шчасьлівыя выпадкі». ЗША, 2000.
10.20, 20.05 «Турпаход».
10.30 «Адзінота ў натоўпе». Дак. фільм.
10.55 «Партрэт у інтэр'еры».
11.10 «Фільм, фільм, фільм».
11.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50 «Правінцыялы». Тэлесэрыял.
14.40 «Дзятлоw's». Мультсэрыял.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 «Кіно»: кінараман «Вечны покліч».
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Рамонт».
18.35 «Тайны знак». Тэлесэрыял.
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Фільм, фільм, фільм».
20.50 Кіно: баявік «Паліцэйская гісторыя-2».
23.00 «Навіны СНД».
23.15 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
23.45 Кіно: баявік «Жывы тавар». ЗША, 2000.

Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «Сіла цягі».
22.30 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Па той бок ваўкоў».
10.45, 23.25 «Фабрыка зорак-2».
11.15 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Жарт за жартам».
18.40 Дак. дэтэктыў «Бяз тэрміну даўнасьці». «У пошуках згубленага мангальф'ера».
20.00 Час.
21.00 «Асноўны інстынкт».
22.05 Шматсэрыйны фільм «Па той бок ваўкоў» (заключная сэрыя).
23.45 Трылер «Чарапы». ЗША, 2000.

РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40, 20.55 Тэлесэрыял «Пані Перамога».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 20.55 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.00 Весткі.
22.15 Цырымонія ўручэньня 1-й нацыянальнай спартыўнай прэміі «Слава».

Культура

15.10 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя».
16.05 «Пецярбург: Час і месца». «Музэй гісторыі Санкт-Пецярбургу».
16.35 «Погляды. Фэнамэналёгія». Дак. фільм.
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Хто мы?». «Хроніка смутнага часу».
18.25 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Час сабору». Дак. сэрыял. Фільм 9-ы. «Храм Узьнясеньня Хрыстовага».
18.55 Білет у Вялікі.
19.35 «Дапамажыце Тэлеку».
19.55 «Злачынства і пакараньне». Маст. фільм.
21.25 «Культурная рэвалюцыя».
22.20 «Эпізоды».
23.00 Навіны культуры.
23.25 «Начны палёт».

НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Шчырае прызнаньне».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Вочная стаўка».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Скарбы мёртвых», 6-я сэрыя, заключная.
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Кіно».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».
22.25 «Жывы Пушкін». Праграма Л.Парфёнава. Частка чацьвёртая.
23.10 «Сёньня».

Эўраспорт

9.30 Гольф. US PGA. Паўтор.
10.30 Конны спорт. Кубак нацый. Сэн-Гален. Паўтор.
11.30 Футбол. Эўра-2004. Таварыскі матч.
12.30, 13.15 Футбол. Эўра-2004.
14.00 Тэніс. Легенды Ралян Гаросу. Капрыяці—Кляйстэрс.
15.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Паўфінал. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
19.30 Футбол. Эўра-2004. Таварыскі матч. Паўтор.
20.30 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Паўфінал. Першы матч.
22.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Паўфінал. Жанчыны. Спэцыяльны агляд.
23.00 Бокс. TBA.
1.30 Ралі рэйд.
1.45 Ралі Акропаліс.

6 чэрвеня пятніца

● БТ
6.00, 7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 17.35, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00 «Паварот ключа». Сэрыял. Заключная сэрыя.
8.50 Выпускны экзамэн па беларускай і расейскай мовах за курс базавай школы ў агульнаадукацыйных і спэцыяльных установах.
9.10, 16.45 «72 гадзіны». Сэрыял.
10.00 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Жупраны. Край зуброў».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.45 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Маст. фільм «Высакародны разбойнік Уладзімер Дуброўскі» («Беларусьфільм»).
15.15 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял.
15.40 Прыгодніцкі фільм «Бронзавая птушка» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
17.55 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Моладзевыя каманды. Адборачны матч. Беларусь—Галяндыя. Жывая трансьляцыя з Барысава.
20.05 Трэці тайм.
20.20 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Свой мэтад».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 «Сола для саксафона». Канцэрт Аляксандра Сярова.
0.10 Камэдыя «Пісталет з глушыцелем».

● СТВ
6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.5, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 22.55 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Паліцэйская гісторыя-2».
10.00 «Турпаход».
10.10, 23.20 Праект «Адлюстраваньне»: «Бамонд». Дак. фільм.
10.55, 20.30 «Аўтапанарама».
11.10 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Тайны знак». Тэлесэрыял.
14.40 «Малыш і Карлсан». Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: кінараман «Вечны покліч».
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Пераключаючы каналы». ЗША, 1988.
23.05 «Навіны СНД».
23.20 «Аблічча новага стагоддзя». Конкурс прыгажосьці-2002.
0.30 Кіно: баявік «Мёртвая хватка». ЗША, 2001.

● Першы музычны канал
7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.35 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Па той бок ваўкоў». Заключная сэрыя.
10.45 Дак. дэтэктыў «Бяз тэрміну даўнасьці». «У пошуках згубленага мангальф'ера».
11.10, 22.10 «Фабрыка зорак-2».
11.40 Сэрыял «Твінісы».
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага». Заключная сэрыя.
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Дак. фільм. «Танец з шаблямі». Да 100-годзьдзя Арама Хачатурана.
18.35 «Самі з вусамі».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.50 Драма «Іголка».

● РТР
7.45 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40 Прэм'ера. Тэлесэрыял «Пані Перамога».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Аншляг».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Клюб «Тэатар + ТБ».
21.55 Прэм'ера. Маст. фільм «Крымінальныя сувязі» (ЗША). 2001 г.

● Культура
15.10 Наталі. Тры жыцьці Натальлі Ганчаровай.
16.05 «Са сталі».
16.35 «Я Вас кахаю», «Медная бабуля». Дак. фільмы.
17.30 Навіны культуры.
17.50 100 гадоў з дня нараджэньня Арама Хачатурана. Гала-канцэрт Акадэмічнага вялікага сымфанічнага аркестру імя П.Чайкоўскага.
18.45 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Час сабору». Дак. сэрыял. Фільм 10-ы. «Феадораўскі Гасудараў сабор».
19.10 Ток-шоў «Аркестравая яма»..
19.50 «Паненка-сялянка». Маст. фільм.
21.40 100 гадоў з дня нараджэньня кампазытара. «Стагодзьдзе Арама Хачатурана».
22.20 Блеф-клюб.
23.00 Навіны культуры.
23.25 «Хто там...».

● НТВ
9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Злачынства ў стылі «Мадэрн». Забойства дзеля пярсьцёнка».
10.10 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Нацыянальная бясьпека. Кіна ня будзе?».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Залатая калекцыя. Баявік «Законьнік».
22.00 «Усё адразу!».
22.40 «Жывы Пушкін». Праграма Л.Парфёнава. Частка пятая, заключная.

● Эўраспорт
9.30 Горны вэлясыпэд.
10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Паўфінал. Першы матч. Паўтор.
11.30, 21.00 Футбол. Эўра-2004. Таварыскі матч. Паўтор.
12.30 Ралі Акропаліс. Паўтор.
13.00 Тэніс. Легенды Ралян Гаросу. Куэртэн—Расэл.
14.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Паўфінал. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
22.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Паўфінал. Мужчыны.
23.15 «Формула». Часопіс.
23.30 Гонкі «Легенды 24 гадзін Ле Ману».
0.30 Гонкі. Мані-Кур.
1.00 Ралі-рэйд.
1.15 Ралі Акропаліс.
1.45 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

7 чэрвеня субота

● БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «Сонечная дынастыя». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 Тэлевізійны Дом кіно. «Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі». 1-я частка.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Нароўля. Духоўная спадчына палешукоў».
13.00 Сола для дэбютанта. Кацярына Сумарава (мастачка).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Знайсьці самога сябе». Відэафільм АТН.
15.35 Казка Л.Керала «Аліса ў краіне цудаў» (ЗША—Вялікабрытанія). 1-я і 2-я сэрыі.
17.05 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Лёгкі ўдар». (ЗША).
17.20 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
17.50 Мэлядрама «Джэфэрсан у Парыжы». (ЗША).
20.10 Панарама. Інфармацыйны канал.
20.55 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Адборачны матч. Беларусь—Галяндыя. Жывая трансьляцыя.
23.05 Трэці тайм.
23.20 Начны музычны этэр.

● СТВ
7.30, 15.50 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00, 16.15 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял.
8.25 «СТВ-спорт».
8.35 «Рэактыўны бокс».
8.50 «Сьвецкая хроніка».
9.05 «Плянэта людзей».
9.20 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.45 «Кіно — дзецям»: казка «Пра Чырвоную Шапачку», 1-я сэрыя.
10.50 «Разам».
11.20 «Рамонт».
11.35, 20.10 Тэлесэрыял: «Месца сустрэчы зьмяніць нельга».
13.05 Кіно: прыгодніцкі фільм «Бармэн з «Залатога якара».
14.45 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.40 «Усё для цябе».
17.10 Кіно: камэдыя «Афрыканец». Францыя, 1982.
19.30 «24 гадзіны».
19.50 «СТВ-спорт».
21.50 Кіно: трылер «Прыватны дэтэктыў». Францыя, 1976.
23.35 «Навіны СНД».
23.50 Кіно: драма «Сука-любоў». Мэксыка, 2000.

● Першы музычны канал
8.00, 12.30 Рухач.
12.00 «Сіла цягі».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 Крэмль-9. «Сьвятлана Сталіна. Уцёкі зь сям'і». Фільм 3-і.
11.10 Прэм'ера. «Праваднік».
11.40 Сьмехапанарама.
12.20 «Падарожжы натураліста».
12.50 «Срэбраны шар». Аляксандр Блок.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Расейская рулетка».
15.05 Дак. дэтэктыў. «Хроніка аднаго забойства».
15.35 «Андрэй Вазьнясенскі-2003».
16.55 Дэтэктыў «Забіць прытворшчыка».
18.25 Песьня году. Лета.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.05 Футбол. Адборачны матч.Чэмпіянат Эўропы-2004. Зборная Швайцарыі — Зборная Расеі. Жывы этэр са Швайцарыі.
23.05 Што? Дзе? Калі? Фінал летніх гульняў.
0.30 Камэдыйны трылер «Забойства на радыё» (ЗША).

● РТР
8.45 «Ранішняя пошта».
9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 «Сам сабе рэжысэр».
11.15 «У пошуках прыгод».
12.10 «Клюб сэнатараў».
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Запасны гулец». 1954 г.
15.00 Прэм'ера. Камэдыя «Ідэальны муж» (ЗША). 1999 г.
17.00 «Мая сям'я».
18.00 «Аншляг».
19.00 Весткі.
19.25 «Люстра».
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Сусьветнае кіно. Прэм'ера. Мэл Гібсан у ваеннай драме «Мы былі салдатамі» (ЗША). 2002 г.
23.00 Прыгодніцкі фільм «Прыбыцьцё» (ЗША). 1996 г.

● Культура
10.50 Пецярбург-300. «Пра казу...». Дак. фільм.
11.05 ГЭГ.
11.20 «Графаман».
11.45 Дзіцячы сэанс. «На залатым ганку сядзелі...». Маст. фільм.
12.50 «Муха-цакатуха». Мультфільм.
13.00 «Дар дажджоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 11-ы. «Аліфантэ. Рака скарбаў».
13.30 «Мэгрэ вагаецца». Тэлеспэктакль.
16.25 Магія кіно.
16.50 «Рамантыка рамансу».
17.30 «Гігант». Маст. фільм.
19.10 «Сфэры».
19.50 70 гадоў Аркадзю Арканаву. «Мой гадзіньнік сьпяшаецца...».
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Беражы мяне, мой талісман». Маст. фільм.
22.30 «Фрак народу». Пра тэатар і ня толькі.
23.20 «Перавал». Мультфільм для дарослых.

● НТВ
9.05 «Кулінарны паядынак».
9.55 «Кватэрнае пытаньне».
10.50 Спорт. «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Удовы». Прафэсія — рэпарцёр.
11.40 «Служба выратаваньня».
12.10 Камэдыя «Нечакана-неспадзявана».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 Баявік «Нікіта».
18.05 «Зусім сакрэтна. Апошняя таямніца канкорда».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Сьвятло праўды».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Дэтэктыў «Басэйн».
23.30 Супэрбокс. Арсэліна Фрэйта супраць Джаэля Касамаёра.

● Эўраспорт
9.30, 15.00, 2.30 Ралі Акропаліс.
10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Паўфінал. Першы матч. Паўтор.
11.30, 12.15, 13.00, 18.14 Футбол. Эўра-2004. Паўтор.
13.45 Мота Гран-пры. Італія. Жывая трансьляцыя.
15.30 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Фінал. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
20.00 Спідвэй. Гран-пры. Швэцыя.
21.30 Экстрэмальныя віды спорту.
22.00 Кік-боксынг. Жывая трансьляцыя.
0.15 Ралі рэйд.
0.30 Футбол. Эўра-2004. Адборачныя матчы. Спэцыяльны агляд.

8 чэрвеня нядзеля

● БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Альхімія слова.
9.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. «Сонечная дынастыя». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.40 Музэюм. «Урэцка-Налібоцкае шкло».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лята».
13.40 Сьвятыні Беларусі. Старадаўнія манастыры Турава.
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Лёс чалавека».
15.40 «Барацьба за выжываньне».
16.35 «Аліса ў краіне цудаў». Маст. фільм. Заключная сэрыя.
17.20 Кліп-абойма.
18.00 Кінараман «Рока і яго браты» (Італія—Францыя). 1-я і 2-я сэрыі.
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Эрык Маралез—Бобі Вэлардэ. Трансьляцыя з ЗША.
23.05 Трагікамэдыя «Добры чалавек у Афрыцы».

● СТВ
7.30, 15.50 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00, 16.20 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял. Заключная сэрыя.
8.25 «СТВ-спорт».
8.40 «Філярманічны тыдзень».
8.45 «Менск і менчукі».
8.50 «Партрэт у інтэр'еры».
9.05 «Добры дзень, доктар!».
9.20 «Аўтапанарама».
9.45 «Кіно — дзецям»: казка «Пра Чырвоную Шапачку», 2-я сэрыя.
10.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.10 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.35, 20.40 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга».
13.05 Кіно: прыгодніцкі фільм «Ня стаўце Лесуну капканаў...».
14.45 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.45 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
17.15 «Мэтафізыка Пецярбургу».
18.15 «168 гадзін».
19.00 «Запрашаем паскардзіцца».
19.15 «Аўтапанарама».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.05 «Асабісты інтэрас».
22.00 «24 гадзіны».
22.15 «Гульнявы рэфлекс».
22.25 Кіно: камэдыя «Мае пяць жонак». ЗША, 2000.
0.05 «Навіны СНД».
0.25 «Робі Ўільямз у Альбэрт-Холе».

● Першы музычны канал
8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 «Ералаш».
8.30 Служу Айчыне!
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
12.00 Тайны забытых перамог. «Яго ракетная вялікасьць».
12.25 «Клюб падарожнікаў».
13.05 Разумніцы і разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Валадар смаку».
15.10 Ток-шоў «Выбар».
15.55 Камэдыя «Кітайскі сэрвіз».
17.45 Жывая прырода. «Прагулкі з дыназаўрамі», «Страўс-маратонец».
18.50 Баявік «Гарачыя галовы». ЗША, 1991 г.
20.30 Контуры.
21.10 «Беларусы ў Афрыцы. Ралі па Сахары». Частка 4-я, заключная.
21.35 Прэм'ера. Баявік «Пад'ём з глыбіні».
23.35 Часы.
0.35 Рэальная музыка.

● РТР
9.15 «Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым».
9.45 «У Гарадку». Справаздача за травень».
10.20 Парад камэдый. «Боінг-Боінг» (ЗША). 1965 г.
12.10 «Парлямэнцкая гадзіна».
13.00 Весткі.
13.20 «Вакол сьвету».
14.15 «Дыялёгі пра жывёл».
15.20 «Сьвет на мяжы».
15.55 «Пакой сьмеху».
16.50 Камэдыя «Клюб першых жонак» (ЗША). 1996 г.
19.00 Весткі тыдня.
20.10 «Спэцыяльны карэспандэнт».
20.35 Сусьветнае кіно. Авантурны фільм «Пастка» (ЗША). 1999 г.

● Культура
11.00 Пецярбург-300. «Воднае жыцьцё». Дак. фільм.
11.15 «Рыцары сьмеху». Галівудскія насьмешнікі.
11.40 Нядоўгія гісторыі.
11.55 Прагулкі па Брадвэі.
12.20 «Тайна Трэцяй плянэты». Мультфільм.
13.10 «Дар дажджоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 12-ы. «Пангола. Шчодрая рака».
13.40 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
14.10 «У сьвеце танцу». А.Хачатуран. «Спартак». Фільм-балет.
16.20 «Гісторыі з прывідамі». Мультфільм.
17.10 «Глядзіце на захад». Дак. фільм.
17.45 «Гігант». Маст. фільм (ЗША, 1956).
19.20 «Дом актора». «Цуд па імені Шлез!»
20.00 Сьмехапанастальгія.
20.30 «Болей чым каханьне».
21.10 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял. Фільм 13-ы. «Вязьні».
21.35 «Культ кіно». «Каханьне юнай Нак». Маст. фільм (Тайланд, 1999).
23.25 Джэм-5.

● НТВ
9.10 Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца», 10-я сэрыя.
10.05 «Вы будзеце сьмяяцца!».
10.15 «Расьлінная жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Уплыў».
12.05 Дэтэктыў «Круг».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Экстрэмальны кантакт. Лімонная акула».
15.50 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.10 Камэдыя «Хто такі Гары Крамб?».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Скрыпка Страдывары».
20.00 «Надоечы» зь Ленаідам Парфёнавым.
21.30 Стужка тыдня. Прэм'ера. Маст. фільм «Штонядзелі» (ЗША).
0.30 Сэрыял «Клан Сапрана».

● Эўраспорт
9.30, 1.30 Ралі Акропаліс.
10.00, 19.00 Футбол. Эўра-2004. Адборачныя матчы.
11.00 Мота Гран-пры. Італія. Жывая трансьляцыя.
16.15 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Фінал. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
23.00 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Дуўр.
0.15 Ралі рэйд.
0.30 Матакрос. Чэмпіянат сьвету. Баўгарыя.

Бэрлінская опэра на вершы Быкава

15 траўня Аляксандар Лукашэнка з гонарам паведаміў студэнтам Беларускай акадэміі мастацтваў, што ў Беларусі 27 тэатраў, ніводзін зь якіх не зачыніўся цягам апошніх гадоў, 130 музэяў і болей за 4000 клюбаў. Але пералікам дасягненьняў кіраўнік дзяржавы не абмежаваўся. У стылі старой савецкай прапаганды ён намаляваў перад студэнтамі жудасную карціну заняпаду, што пануе ў Эўропе: «Возьмем, напрыклад, Прыбалтыку. У Рызе зачыненыя многія тэатры. Некаторыя акторы трымаюць піўніцы, большасьць папросту ня мае за што жыць. У Заходняй Эўропе таксама скарачаецца тэатральная прастора. Нямеччына пасьля аб'яднаньня ня можа ўтрымліваць у Бэрліне тры славутыя раней опэрныя тэатры. У Францыі з чатырох опэрных тэатраў Парыжу працуе ўсяго адзін. Рымская, Фларэнтыйская, Лісабонская опэры даюць толькі шэсьць спэктакляў у месяц. Гэта сусьветныя жамчужыны!»

Факты добрыя тым, што іх заўжды можна праверыць: дастаткова наведаць інтэрнэт-сайты адпаведных тэатраў і паглядзець, што там напраўдзе адбываецца. Як выявілася, ніводзін дзяржаўны тэатар у Рызе не зачыніўся! «Дайлес», Рыскі моладзевы тэатар, Дзяржаўны тэатар лялек, Тэатар расейскай драмы — усе працуюць.

Або вось Нацыянальная опэра. Латыская дзяржава атрымала ў спадчыну ад саветаў напаўразбураны будынак і трупу ў стане пэрманэнтнага разброду. Спэктаклі на галоўнай сцэне ня граліся, найлепшыя артысты зьехалі на Захад (латыская вакальная школа, у адрозьненьне ад беларускай, цанілася высока), рэпэртуар зьбяднеў ды знасіўся. Аднак новы дырэктар Андрэй Жагарс (рыскі бізнэсовец, а ў мінулым — папулярны актор) здолеў аднавіць Опэру ды ўзьняць яе на новы ўзровень. Ён звольніў частку трупы (вось хто, мабыць, трымае піўніцы) і набраў новых людзей. Маладыя сьпевакоў выправіў вучыцца ў Мілян ды Лёндан, запрасіў італьянскіх пэдагогаў ды канцэртмайстраў. Дзяржава дала грошы на рамонт будынку і абсталяваньне камэрнай залі. У СМІ рэклямавалася акцыя «Купі сабе месца ў Опэры», як вынік — у партэры зьявіліся крэслы, упрыгожаныя бронзавымі шыльдачкамі з імёнамі самых шчодрых ахвярадаўцаў.

Сёньня эўрапейская опэрная пастаноўка каштуе 600—800 тыс. даляраў (а «Хаваншчына» ці «Барыс Гадуноў» пацягнуць на мільён). У Рызе робяць пастаноўкі эўрапейскага ўзроўню, не шкадуючы ані грошай, ані творчых рэсурсаў. Цяпер у рэпэртуары тэатру 23 опэры. Збольшага тыя ж назвы, што і ў Менску. Зь фірмовых «далікатэсаў» — традыцыйны для Рыгі «Лятучы Галяндзец» Вагнэра (маэстра ў маладосьці быў капэльмайстрам рыскае Опэры), «Арфэй і Эўрыдыка» Глюка, барочная «Альцына» Гендэля, Моцартава «Cosi fan tutte» («Гэтак робяць усе кабеты») — опэра даволі фрывольная ды занадта вытанчаная для вакалістаў старое маскоўскае школы. Захавалася ў рэпэртуары і «Салямэя» Штраўса, якую за савецкім часам можна было пачуць толькі ў Рызе.

Цікавы і даступны рэпэртуар ды якаснае выкананьне прываблiваюць у Рыгу «культурных» турыстаў з замежжа. Опэрны турызм цяпер вельмі папулярны, асабліва сярод амэрыканцаў, хоць у ЗША таксама багата высакаклясных тэатраў. Галоўныя цэнтры прыцягненьня — моцартаўскі фэст у Зальцбургу і вагнэраўскі ў Байрэйце, славуты ангельскі фэстываль у маёнтку Глінднэбурн ды тэатры Італіі — ад Палерма да Міляну. Але й цэны там адпаведныя. Так, «опэрны тур» (12 ночаў у гатэлі, харчаваньне, чатыры спэктаклі ў Лёндане і два ў Парыжы, плюс адзін спэктакль-«сюрпрыз», плюс экскурсія за кулісы лёнданскага «Covent Garden», плюс сустрэча з артыстамі) каштуе 4450 даляраў. Адно месца ў партэры «Covent Garden» пацягне за 200 даляраў.

У Рызе ж, дзе з 1998-га ладзяць свой опэрны фэст, цэны ніжэйшыя (ад 5 да 25 даляраў), а якасьць зусім нядрэнная. У 2001 г. колькасьць турыстаў там была рэкордная, бо Рыгу абвясьцілі «культурнай сталіцай Эўропы». Нацыянальная опэра падрыхтавала «Аіду» Вэрдзі з удзелам Вольгі Барадзіной і Сяргея Ларына. Посьпех быў агромністы. Зусім нядаўна латвійская «Аіда» прайшла ў маскоўскім Вялікім тэатры і таксама была высока ацэненая маскоўскай крытыкай.

Няма зьвестак і пра закрыцьцё бэрлінскіх альбо парыскіх опэрных тэатраў. У Бэрліне, праўда, сытуацыя няпростая: на тры з паловай мільёны чалавек — чатыры опэрныя тэатры. Самы малады і экстравагантны зь іх, «Zeitgenossische Oper», заснаваны шэсьць гадоў таму. Яго рэпэртуар складаюць опэры, што паўсталі пасьля 1945 г. Астатнія тры тэатры маюць доўгую гісторыю.

Самы салідны — «Deutsche Staatsoper Unter der Linden» (Нямецкая дзяржаўная опэра) — быў заснаваны ў пачатку 1740-х і да 1918-га меў статус Каралеўскай опэры. Пасьля другой сусьветнай вайны ён апынуўся ва Ўсходнім Бэрліне. У 1992-м, праз тры гады пасьля разбурэньня Бэрлінскага муру, тэатар узначаліў адзін з найславутых музыкаў сучаснасьці Даніэль Барэнбойм. Месца ў партэры цяпер тутака каштуе 68 эўра. Сёньня рэпэртуар «Deutsche Staatsoper Unter der Linden» налічвае 24 опэры, у тым ліку пяць — Моцарта, чатыры — Штраўса і тры — Вагнэра.

«Komische Oper» («Камэдыйная опэра») таксама месьціцца ва ўсходняй частцы Бэрліна. Гэты тэатар канцэптуальна дэмакратычны, хоць квіткі і там дарагія. Усе творы выконваюцца па-нямецку, пэўную частку рэпэртуару складаюць венскія апэрэты і нямецкія зынгшпілі. Аднак на афішы «Komische Oper» ёсьць і назвы, якія зрабілі б гонар любому тэатру Эўропы: «Тамэрлан» Гендэля, «Фідэлія» Бэтховэна, «Любоў да трох апэльсынаў» Пракоф'ева і інш.

І Дзяржаўная опэра, і «Komische Oper» некалькі дзесяцігодзьдзяў жылі на дзярждатацыях. Зрэшты, адзіны опэрны тэатар у Заходнім Бэрліне — «Deutche Oper» — дагэтуль утрымлівае дзяржава. Яго рэпэртуару пазайздросьціць любы тэатар сьвету: 38 опэраў, у тым ліку дзевяць — Вагнэра. Сюды прыяжджаюць з канцэртамі славутыя опэрныя пяюльлі. 5 ліпеня немцы чакаюць Рэнэ Флемінг — элегантную прымадонну нью-ёрскай «Metropolitan Opera», якая займае другое месца ў сусьветным рэйтынгу; 26 верасьня ў «Deutche Oper» засьпявае легендарная афраамэрыканская мэцца-сапрана Грэйс Бамбры. А на 12 сьнежня прызначаны выступ беларускай супэрзоркі Марыі Гулегінай. Квіткоў на гэтыя канцэрты ўжо няма. У красавіку «Deutche Oper» займела новы фэшэнэбэльны сайт, дзе можна замовіць квіткі аж да 19 красавіка 2004 г. Аднак гэта сытуацыі не палепшыла: на «Аіду» на 11 лістапада вольных месцаў няма, хоць ніякіх зорак у гэты вечар не абяцаюць.

Парыская «Opera Bastille» штомесяц дае 14 спэктакляў з удзелам найлепшых сьпевакоў Эўропы.

- Бюджэт бэрлінскіх опэрных тэатраў, якія так шкадуе Лукашэнка, складае 112,5 млн. Для параўнаньня: бюджэт Беларусі на 2003 г. прадугледжвае сукупныя выдаткі на культуру, мастацтва і кінэматограф у маштабах цэлай краіны ў памеры 21 млн даляраў.

Словы беларускага прэзыдэнта пра якіясьці праблемы з бэрлінскімі тэатрамі выкліканыя вось чым. Летась сэнатар па справах адукацыі, навукі ды культуры бэрлінскага муніцыпалітэту Томас Флірль абвясьціў, што запазычанасьць гораду перад фэдэральным бюджэтам вырасла і адзіны спосаб яе ліквідаваць — скараціць выдаткі, у тым ліку і бюджэт опэрных тэатраў, з 123 млн даляраў у год да 112,5 млн. Для параўнаньня: бюджэт Беларусі на 2003 г. прадугледжвае сукупныя выдаткі на культуру, мастацтва і кінэматограф у маштабах цэлай краіны ў памеры 21 млн даляраў.

Скарачэньне субсыдыяў азначала ліквідацыю 220 працоўных месцаў — 10% ад іхнае агульнае колькасьці. Тром тэатрам — «Deutsche Staatsoper Unter der Linden», «Komische Oper» і «Deutche Oper» — прапанавалі аб'яднаць вытворчыя цэхі, адміністрацыйныя службы, балетныя трупы. Балет цяперака не карыстаецца вялікім попытам (нават квіткі каштуюць у 2—3 разы таньней). Гэтая апэрацыя ніяк не пагражала творчай незалежнасьці тэатраў, але адміністрацыйны замах выклікаў пратэсты з боку музычных і культурных дзеячоў усяго сьвету.

І чатыры опэрныя тэатры ў Парыжы па-ранейшаму жывуць спакойна. «Opera Bastille», якая паўстала ў 1989 г. намаганьнямі Франсуа Мітэрана, штомесяц дае 14 спэктакляў з удзелам найлепшых сьпевакоў Эўропы. Усе 2700 месцаў у залі звычайна занятыя, хоць квіток каштуе пад 100 даляраў. У «Opera Bastille» спачатку перанесьлі былі опэрныя праекты парыскай «Grande Opera», а ў старым будынку пакінулі толькі балетныя спэктаклі. Аднак з 1996 г. на старой сцэне прыйшлося ўзнавіць і опэру, каб задаволіць попыт з боку аматараў і турыстаў.

Сукупны опэрны бюджэт «Grande Opera» і «Opera Bastille» на 60% складаецца зь дзяржаўных інвэстыцыяў (прыкладна 80 млн эўра ў год), на 30% — з прыбыткаў ад продажу квіткоў і арганізацыі экскурсіяў, на 10% — з спонсарскіх ахвяраваньняў.

У Парыжы даўно адмовіліся ад рэпэртуарнай сыстэмы: салістаў і дырыжораў запрашаюць на асобныя пастаноўкі. Новы спэктакль ідзе 10—20 разоў, потым дэкарацыі трапляюць у сховішча альбо здаюцца ў арэнду правінцыйным тэатрам. Удалыя пастаноўкі паўтараюць праз год. У парыскім музычным тэатры «Шатле» паводле гэткай схемы з канца студзеня да пачатку траўня прайшлі «Дэман» Рубінштэйна, «Яўген Анегін» Чайкоўскага, «Кароль Рогер» Шыманоўскага і інш. А ў «Opera Comique» цьвіком сэзону былі «Казкі Гофмана» Афэнбаха.

У рымскім «Teatro dell'Opera» і флярэнтыйскім «Teatro Communale», пра якія таксама згадаў беларускі прэзыдэнт, жыцьцё па-ранейшаму кіпіць. У рымскай Опэры рознага кшталту імпрэзы адбываюцца амаль штодня. Спэктаклі, сольныя канцэрты выдатных сьпевакоў (Марчэла Альварэс, Марыэла Дэвія, Алена Абразцова), сымфанічныя вечары. У флярэнтыйскім «Teatro Comunale» бесьперапынна адбываецца фэст «Флярэнтыйскі музычны травень». Ад назваў на афішах стракацее ўвачы. А Флярэнцыя ж ніколі, па-за кароткім пэрыядам на пачатку XVII ст., не была опэрнай сталіцай, і толькі ў апошнія дзесяцігодзьдзі, дзякуючы намаганьням энтузіястаў, стала прыцягваць увагу «опэрных турыстаў».

Калі б адзін з згаданых А.Лукашэнкам гарадоў зьвярнуўся ў Гаспадарчы суд, кіраўніку дзяржавы цяжка было б даказаць справядлівасьць сваіх словаў. Эўрапейскай культуры да заняпаду далёка.

Юлія Андрэева

Крытыка як жаночая справа

Кісьліцына Ганна. <blonde attack>. — Менск, 2003. — 143 с.

Кніга Ганны Кісьліцынай сталася для мяне чакаляднай цукеркай, знойдзенай у мяшэчку з прыкрымі ірыскамі.

На белым фоне вокладкі зьмешчаны фотакаляж: Кісьліцына ў руковым касьцюме зайчыка. Упрыгожаная заечымі вушкамі, яна выклікае пэўныя асацыяцыі з гульлівай playmate з імпэрыі дзядулькі Х'ю Гефнэра (каханьне, сэкс, супрацьстаяньне полаў у беларускай літаратуры — асноўныя тэмы кнігі; ружовы колер касьцюму — ня проста так), аднак чаму гэтак журботна апушчаныя долу тыя мяккія вушкі? Ці не ў прадчуваньні вялікіх цяжкасьцяў на шляху заплянаванага пераўтварэньня жыцьця й літаратуры? Канцэптуальная і арыгінальная вокладка.

Зборнік складаецца з трох частак («Эсэ, артыкулы», «Партрэты, рэцэнзіі», «Інтэрвію»). Ён укладзены з тэкстаў, напісаных цягам апошняга дзесяцігодзьдзя. Шкада толькі, што ў першых дзьвюх частках пад імі нямашака датаў. Крытыка ўсё-такі пішацца не для «вечнасьці», а адлюстроўвае хуткаплыннае літаратурнае жыцьцё (гэта асабліва тычыцца рэцэнзій).

Кісьліцына не імкнецца прыхаваць свае літаратурныя прыхільнасьці і карпаратыўную прыналежнасьць. Яна шмат піша пра дарагіх сэрцу Разанава і Глёбуса, адкрыта сымпатызуе «бумбамлітаўцам» і «тэвээлаўцам». Аднак, калі апошнія дапускаюць мастацкія пралікі, Кісьліцына рэагуе імгненна. Дый сама аўтарка можа ствараць як узоры літаратурнай крытыкі («Апошні цьвік»), так і нуднавата распавядаць у інтэрвію пра беларускі постмадэрнізм альбо казаць банальнасьці: «Як і кожная сапраўдная кніга, «Апошнія вершы» Леаніда Галубовіча выклікае думкі ня толькі аб асаблівасьцях таленту паэта, але і аб сутнасьці самой паэзіі, чарговы раз ставячы пытаньне пра яе месца і ролю ў сучасным сьвеце». Кісьліцына — жывы чалавек, які перажывае творчыя ўзьлёты й падзеньні. Яе артыкулы маюць характэрныя для крытыкі адзнакі руціннасьці, канвэрнасьці. Нарэшце, супярэчлівасьці.

Кісьліцына любіць ствараць літаратурныя міты (артыкулы «Раіса Баравікова як сэкс-сымбаль беларускай літаратуры», «Іван Шамякін — апостал мадэрнізму»). Але колькі ні ўчытвайся ў бэлетрыстыку Шамякіна, акром «добрага» і «дрэннага» сакратароў райкаму дый іншых камуністых зь іх думкамі і жыцьцём навідавоку, дарэмна шукаць там мадэрноваські, патаемных намёкаў і алюзій, як заклікае да таго крытык. А наконт сэксу… Нашая літаратура апошнімі гадамі значна памаладзела, папрыгажэла і пагарачэла. Цнатлівасьць, прыстойнасьць і традыцыйныя сэксуальныя пазыцыі цяпер шукайма ў туркменскім слоўным мастацтве.

Гэтая кніга перадусім створана жанчынай, якая жадае, каб беларускія літаратары-мужчыны выразна заявілі аб сваёй полавай прыналежнасьці. Яшчэ Кісьліцына спрабуе зразумець, чаму ў беларускай літаратуры багата разумных і таленавітых пісьменьніц, але «хранічна адсутнічае больш-менш цікавая любоўная гісторыя». Погляд на беларускую літаратуру праз гендэрную «прызму» дужа эфэктыўны: ён пазбаўляе крытыку адарванасьці ад жыцьця, культуры паводзін у літаратуры надае цывілізаваны выгляд, а адносіны ў трохкутніку «пісьменьнік — крытык — чытач» робіць больш інтымнымі.

Павал Абрамовіч

Гісторыя яго вачыма

Пройдзеныя шляхі-пуцявіны. Запіскі, успаміны, аўтабіяграфія. — Горадня, 2003.

Кніга 93-гадовага Апанаса Цыхуна мае назоў «Пройдзеныя шляхі-пуцявіны».

У новым зборніку ён пазначае асноўныя вехі свайго жыцьця. Пачынае аповед з роднай вёскі Кунцаўшчына, дае гістарычную рэтраспэктыву. Адзначае, што ў гэтых мясьцінах бывала Элаіза Ажэшка і на падставе тамтэйшых падзеяў напісала аповесьць «Дзюрдзі».

Апанас Цыхун ведае свой радавод да чацьвёртага калена. Гісторыя ягонай сям'і мае свае драмы. Ягоны стрыечны брат Казімер Рагачэўскі быў пры Польшчы вядомым у Заходняй Беларусі падпольшчыкам. І, каб ня трапіць у рукі паліцыянтаў, знайшоў мужнасьць застрэліцца…

З такіх успамінаў і запісак складзены ўвесь зборнік. Уласная біяграфія шчодра населеная ня толькі людзьмі роднымі і блізкімі, але й незнаёмымі, якія пакінулі сьлед у памяці Апанаса Пятровіча. У Лашанскай пачатковай польскай школе ўпершыню даведаўся, што тут калісьці працаваў настаўнікам бацька акадэміка Яўхіма Карскага.

Спадар Апанас — добры апавядальнік. Яго памяць выдатна захавала імёны і прозьвішчы, драбнюткія падзеі. Аўтар распавядае пра выступленьне ў мястэчку Алекшыцы лідэра БСРГ Браніслава Тарашкевіча, якога сяляне не далі арыштаваць паліцыянтам. Кірмаш у мястэчку Лунна — яшчэ адна жывая карцінка «з натуры». Цікава, што прадавалі і як таргаваліся пакупнікі, якія тавары карысталіся попытам…

Апанас Цыхун удзельнічаў у нямецка-польскай вайне 1939 г., бараніў Варшаву, трапіў у палон да гітлераўцаў. Паводле савецка-нямецкага пагадненьня польскіх салдат, якія нарадзіліся на далучанай да СССР тэрыторыі, вярталі саветам. Калі Цыхун пачуў, што вязуць зноў у лягер, цяпер ужо савецкі, то ўцёк з эшалёну. Баец-вартавы не страляў.

Як настаўніка, на вайну сп.Апанаса не ўзялі. А вось брат Іван вярнуўся з-пад Кёнігсбэргу без нагі, зусім слабы. Але не было спакою і Апанасу. Спэцслужбісты Шаляпін і Іваноў арыштавалі яго як шпіёна, якога нібыта скінулі на парашуце. У 1967 г. Апанаса Пятровіча зноў наведалі работнікі КДБ. Ён, бачыце, на курсах падвышэньня кваліфікацыі ў Менску запатрабаваў выкладаць пабеларуску. Нехта хуценька зрабіў данос у «кампэтэнтныя органы».

Апанасу Цыхуну шанцавала на знаёмства з добрымі людзьмі. Гэта пісьменьнікі Васіль Быкаў і Юрка Голуб, мастак Аляксандар Ліпень, навуковец Аляксей Пяткевіч. Янка Брыль дагэтуль лістуецца з гарадзенскім дасьледчыкам мінуўшчыны.

Калі перагорнута апошняя старонка кнігі, адчуваеш, што дакрануўся да мінулага, уначавідкі пабачыў тое, аб чым піша Апанас Цыхун — чалавек таленавіты і назіральны, які добра ведае патрабаваньне мэмуарнай літаратуры: толькі праўда праз уласнае «я».

Антон Лабовіч, Горадня

НОВАЕ КІНО

Філязофія «Перазагрузкі»

Аднойчы, па дамоўленасьці зь мясцовымі ўладамі, у Сыднэі на чатыры гадзіны быў перакрыты дарожны рух. Неўзабаве ў небе над горадам зьявіўся гелікоптэр. Пад пільнай увагай кінакамэраў ён на вельмі малой вышыні зрабіў колькі віражоў паміж сыднэйскімі хмарачосамі (зь якіх, вядома ж, былі эвакуяваныя людзі). Абышлося без здарэньняў.

Так прайшоў яшчэ адзін ардынарны здымачны дзень стужкі «Матрыца-2: Перазагрузка». Чарговы матэрыял адправілі ў мантаж.

...Перазагрузка Матрыцы доўжыцца толькі трое сутак. Акурат столькі, паводле падлікаў падземных партызанаў, спатрэбіцца ўсёмагутнаму кампутару, каб дасягнуць апошняй апоры чалавецтва, Зэёну.

Але змагары за волю Нэо, Трыніці ды Морфіюс працягваюць кіраваць паўстаньнем людзей супраць кампутараў. Каб зьнішчыць сыстэму прыгнёту й эксплюатацыі плянэтарнай біямасы, яны вымушаны карыстацца ня толькі неабсяжным арсэналам фантастычнай зброі, але й уласнымі звычкамі. Удзел у місіі па выратаваньні людзей ад зьнішчэньня прыносіць ім больш глыбокае разуменьне канструкцыі Матрыцы і ўсьведамленьне цэнтральнай ролі Нэо ў лёсе чалавецтва, і... to be continued!

Керы-Эн Мос, 35-гадовая канадзкая акторка, у жыцьці зусім не падобная да сваёй гераіні — нязломнай Трыніці, лічыць «Матрыцу» самым філязофскім фільмам апошніх гадоў. «Шмат хто бачыць у «Матрыцах» толькі круты звыштэхналягічны баявік, але гэтыя стужкі шмат глыбейшыя, — гаворыць яна. — Гэта сапраўды духоўнае кіно. Наколькі рэчаісна тое, што адбываецца з намі ў жыцьці? Ці ёсьць хто-небудзь, хто кантралюе нашыя думкі? Сёньня мы практычна вольныя фізычна. Але ўнутраная свабода — гэта іншая рэч. Яна не пасьпявае за вонкавай. І фільм пранікае менавіта ў гэтую шчылінку».

Падыход да спэцэфэктаў, за якія, уласна, і паважаюць «Матрыцу» ва ўсім сьвеце, таксама філязофскі. Паводле словаў Джона Гаэты, адказнага за спэцэфэкты, іх віртуальныя здымкі адштурхоўваюцца ад сапраўднасьці: «Мы выкарыстоўвалі пяць лічбавых камэраў, якія дазвалялі браць у кадар нават самыя дробныя дэталі абліччаў актораў. Потым уся запісаная камэрамі інфармацыя заганялася ў кампутар, дзе складаны альгарытм вылічваў выгляд актораў з усіх астатніх вуглоў. Вынікам такой апрацоўкі было стварэньне віртуальнай копіі, якую мы маглі прымусіць рабіць усё, што заўгодна. Напрыклад, біцца».

Якіх конікаў выкідаюць віртуальныя копіі Кіяну Рыўза, Керы-Эн Мос і Лоўрэнса Фішбарна, вы пабачыце ў кінатэатрах. Усе ўжо чакаюць трэцюю частку фільму, сусьветная прэм'ера якой павінна адбыцца ў лістападзе 2003 г. Застаецца толькі спадзявацца, што, падшукваючы кінафэстываль для чарговай прэм'еры, маркетолягі з «Warner Bros.» спыняцца на нашым «Лістападзе». Гэта была б сапраўдная «Рэвалюцыя».

Павал Сьвярдлоў

Конкурс выдавецкіх праектаў

Беларускі рэспубліканскі фонд фундамэнтальных дасьледаваньняў абвяшчае конкурс выдавецкіх праектаў з мэтай фінансавай падтрымкі выданьня манаграфіяў на актуальныя праблемы сусьветнай і айчыннай навукі ды падставовыя пытаньні эканамічнага і культурнага разьвіцьця Беларусі. На спабор прымаюцца заявы на выданьне: кнігаў у беларускай або расейскай мовах (перавыданьні не фінансуюцца); манаграфіяў навукоўцаў — грамадзянаў Беларусі (а таксама іх прац, зробленых у суаўтарстве з навукоўцамі-замежнікамі).

Заява павінна зьмяшчаць: ліст-абгрунтаваньне арганізацыі, што зьяўляецца ініцыятаркай выданьня, з адзначэньнем памеру патрэбных сродкаў; рукапіс манаграфіі; выпіску з пратаколу паседжаньня навуковае рады арганізацыі, у якой было выкананае дасьледаваньне (мусіць зьмяшчаць хадайніцтва аб падтрымцы выданьня); водгукі рэцэнзэнтаў. Падчас разгляду праектаў будзе ўлічвацца актуальнасьць і арыгінальнасьць тэматыкі выданьня, навуковая кваліфікацыя аўтара, навуковая і практычная значнасьць вынікаў дасьледаваньня. Заявы на конкурс разглядаюцца штоквартал цягам усяго году.

Матэрыялы прымаюцца па адрасе: пр.Скарыны, 66-414, 220072, Менск.

Падрабязная інфармацыя на сайце http://fond.bas-net.by/.

Эўрапейская афіша

Улетку ўся Эўропа выходзіць на вуліцы. Нямеччына прымае вулічных музыкаў, Чэхія — вулічныя тэатры, Францыя аддаецца эпосе Рэнэсансу, Гішпанія аб'яжджае коней… Куды паехаць адпачываць?

Аўстрыя

З 21 па 25 чэрвеня ў Інсбруку пройдзе фэстываль царкоўных спеваў. Кульмінацыяй сьвята будзе выкананьне Моцартавага «Рэквіюму» Зальцбурскім

Інсбрук ляжыць у маляўнічых гарах

аркестрам. А 23 чэрвеня ў тым самым Інсбруку, відаць, каб разбавіць сур'ёзную атмасфэру, пачнецца летні фэстываль танцаў, які працягнецца да сярэдзіны ліпеня. Танчыць будуць самыя вядомыя калектывы сьвету, чакаюцца майстар-клясы знакамітых харэографаў і дзіцячая праграма. Вы зможаце ўбачыць амаль усё: ад расейскага балету (фэстываль распачнецца «Гамлетам» Барыса Эйфмана) да шалёных танцаў Бразыліі.

Вялікая Брытанія

Каралеўскія скачкі ў **Аскоце**, што пройдуць з 17 па 20 чэрвеня, — гэта ня толькі спартовае спаборніцтва, але і падзея ў сьвеце высокай моды. Аскот дае велікасьвецкім пані рэдкую магчымасьць прадэманстраваць вытанчаныя строі, у першую чаргу — капелюшы. І невядома яшчэ, што больш прыцягвае ўвагу публікі: ці тыя ўборы, ці скакуны, што спаборнічаюць у бегу безь перашкодаў і стыпл-чэйзе.

У **Вімбарне** (паўднёвая Англія, графства Дарсэт) 13—15 чэрвеня адбудзецца галоўны фольк-фэст краіны. Штогод у засені тамтэйшае катэдры пачынаецца гэтая кульмінацыйная сустрэча танцораў і актораў. Задача фэсту — сабраць найлепшых выканаўцаў традыцыйнай музыкі. Асаблівая ўвага надаецца кельцкім

матывам з абодвух берагоў Ірляндзкага мора.

А ў шатляндзкім **Тарбэрце** да 7 чэрвеня будзе доўжыцца фэстываль морапрадуктаў. Яшчэ можна пасьпець! Карнавал, жывая музыка і марскія стравы, якія ў дні фэстывалю можна ня толькі паспытаць проста на вуліцы, але й навучыцца самому гатаваць. Адначасова з фэстывалем у маляўнічай Тарбэрцкай бухце адбываюцца лодачныя спаборніцтвы.

Галяндыя

12 чэрвеня адкрываецца выстава **«Гаагская скульптура-2003».** Тэма сёлета — «Ідэальная жанчына». Спэктар інтэрпрэтацыяў вобразу шырокі: маці, абраз, хатняя гаспадыня, алегорыя Славы… На выставе будуць працы як знакамітых (Сэзара, Сальвадора Далі), так і маладых аўтараў. Адбудзецца й конкурс, натхнёны мітам пра Пігмаліёна: скульптары будуць ляпіць свае творы проста на месцы, стваравочы ідэальны вобраз жанчыны XXI ст. Пераможцу абвесьцяць на балі скульптураў 29 жніўня, а закрыецца выстава 7 верасьня.

5 чэрвеня ў **Амстэрдаме** пачнецца вялікі Галяндзкі фэст, які працягнецца да 29-га. Ад 1947 г. фэстываль культывуе наватарскія дасягненьні ў драматычным мастацтве, музыцы, опэры, харэаграфіі, спалучаючы традыцыю з экспэрымэнтам. Гледачы будуць зьдзіўленыя нябачанымі раней камбінацыямі розных мастацтваў. Фэстываль імкнецца таксама зламаць штучную мяжу паміж «высокай» і «нізкай» культурамі, таму праграма ўключае, сярод іншага, поп-музыку ды эстраду.

А ў **Наардэне** да 22 чэрвеня працуе фотафэстываль — адзін з найбуйнейшых у Эўропе.

Гішпанія

У горадзе **Пантэвэдра** (Галісія) першыя тыдні чэрвеня аб'яжджаюць коней. Гэта сапраўдная дэманстрацыя «мачызму»: на ўзгорку Ля-Гроба натоўп сьвішча і пляскае рызыкантам, якія змагаюцца зь дзікімі жывёлінамі: голымі рукамі валяць на зямлю, таўруюць, абразаюць грывы ды хвасты і нарэшце вядуць у пастаўнік. Гэты фэст з больш чым двухсотгадовай гісторыяй прысьвечаны мясцоваму патрону — сьвятому Ляўрэну. Той, згодна зь легендай, клапаціўся аб жывёлах, калі Галісію спусташала чума.

Санар — міжнародны фэстываль сучаснай музыкі і мультымэдыйных мастацтваў — пройдзе ў **Барсэлёне** з 12 да 14 чэрвеня. Тры дні і тры ночы будуць доўжыцца канцэрты, выступы ды-джэяў, кінапаказы, канфэрэнцыі. У праграме — каля шасьцідзесяці твораў ва ўсіх мультымэдыйных фарматах. Госьці фэсту маюць магчымасьць адкрыць для сябе самыя наватарскія і дзівосныя ўзоры электроннай музыкі розных краінаў.

Італія

Міжнародны фэст камэдыі і кірмашовых тэатраў Дэль Артэ адбудзецца 5—9 чэрвеня ў **Равэне**. Наведнікі пабачаць традыцыйныя тэатральныя і музычныя выступы, спэктаклі, імправізацыі, кірмаш на плошчы Каціньёлы.

А ў **Пэзара**, на беразе Адрыятыкі, 20—28 чэрвеня пройдзе кінафэстываль, які з моманту заснаваньня быў акном у новае кіно. Некалі ён сабраў фільмы «новай хвалі», што ахапіла ў 60-я і 70-я ўвесь сьвет. Фэстываль вывеў у людзі многіх рэжысэраў, быў месцам сустрэчаў і дыскусіяў з знакамітымі гасьцямі, сярод якіх — Ралян Барт, Умбэрта Эка. Сёлета ў цэнтры ўвагі будзе сучаснае французкае кіно. Прэзэнтуецца аж сорак стужак, створаных за апошнія пяць гадоў. У сэкцыі андэрграўнднага й экспэрымэнтальнага кіно — працы маладых рэжысэраў-постсюррэалістаў. Кіно будуць паказваць вечарамі проста на галоўнай плошчы Пэзара, і гледачы галасаваньнем абяруць найлепшы фільм.

Мальта

1, 8 і 22 чэрвеня ў форце Сьвятога Эльма, што ў **Валеце**, адбудзецца традыцыйны касьцюмаваны вайсковы парад «На варце». 90 афіцэраў і салдатаў у гістарычных касьцюмах прадэманструюць на пляцы зьмену каравулу, ружэйныя прыёмы, страявы парад, гарматны салют.

З 2 па 7 чэрвеня на Мальце адбудуцца **10-я гульні** малых эўрапейскіх дзяржаў. Спартоўцы з Андоры, Кіпру, Ісьляндыі, Ліхтэнштэйну, Манака, Сан-Марына і Мальты будуць спаборнічаць у атлетыцы, баскетболе, дзюдо, плаваньні, пінг-понгу, тэнісе, яхт-спорце і інш.

Фэст сьвятых Пятра і Паўла завецца на Мальце **Мнар'я** — ад слова «люмінар'я», г.зн. ілюмінацыя. Бо некалі Мдына, сярэднявечная сталіца Мальты, асьвятлялася вогнішчамі ў сьвяты. Увечары 28 чэрвеня на яе вуліцах пачынаюцца фольк-канцэрты, выставы дасягненьняў народнай гаспадаркі і традыцыйных рамёстваў. Назаўтра пад вечар — скачкі на конях.

Нарвэгія

Міжнародны тэатральны фэстываль пройдзе ў **Порсгруне** 13—21 чэрвеня. За дзевяць гадоў існаваньня ён пашырыў сваю аўдыторыю ад дзьвюх да трыццаці тысяч чалавек. У праграме — паказы ў тэатрах і на вуліцах, майстар-клясы, дзіцячыя спэктаклі… Сёлета споўнілася 175 гадоў з дня нараджэньня Генрыка Ібсэна. І на фэстывалі пакажуць аж чатыры вэрсіі ягонага «Пэра Гюнта». Аднастайнасьці ня будзе: тэатар — мастацтва вялікіх магчымасьцяў, а тэкст твору дае надзвычайную прастору для інтэрпрэтацыі.

Нямеччына

Міжнародны фэстываль вулічных музыкаў пройдзе 6—8 чэрвеня ў **Людвігсбургу** (Бадэн-Вюртэмбэрг). 50 вулічных музыкаў выступяць у парках барочнага гарадка. Музыка — ад фольку і клясыкі да року і попу, часам нават з элемэнтамі клаўнады. Пераможца атрымае залаты капялюш.

Ад 14 да 21 чэрвеня ў **Ляйпцыгу** абвешчаны Габрэйскі тыдзень. Чакаецца вялікая колькасьць канцэртаў, выставаў, кінапаказаў, публічных лекцый і сэмінараў.

Аматараў року зацікавіць грандыёзны фэст «Гарыкайн», што пройдзе ў **Шэсэлі** — між Гамбургам, Брэмэнам і Гановэрам. З 20 па 22 чэрвеня паблізу места разьбіваецца намётавы гарадок, дзе трое сутак не перапыняюцца вечарніцы і канцэрты. Штогод, пачынаючы з 1997 г., тут зьбіраюцца тысячы музыкаў, што граюць рок, поп, джаз, альтэрнатыўную музыку. Сярод іх — «Radiohead», «Coldplay», «Guano Apes»…

Фінляндыя

11—14 чэрвеня ў **Лявіісе** ў дзясяты раз адбудзецца фэстываль Сыбэліюса, тэмай якога стане сёлета музыка фінскіх кампазытараў — уласна Сыбэліюса і іншых. Чатырохдзённае сьвята музыкі зьбярэ мноства выканаўцаў зь Фінляндыі і суседніх краінаў.

12—18 чэрвеня адбудзецца фэстываль танцу ў **Куопіё**. У праграме — танцоры з Ізраілю, Партугаліі, Швэцыі, франка-расейска-фінскі балет. Заплянаваны таксама міжнародны сэмінар па танцавальнай пэдагогіцы. Выступы можна пабачыць ня толькі ў спэцыяльна прыстасаваных залях, але й проста на плошчы, а 40 тыс. гасьцей фэсту будуць танчыць на кожным рагу.

Францыя

З 2 да 7 чэрвеня ў **Ансі** пройдзе першы міжнародны фэстываль, прысьвечаны мастацтву анімацыі. У праграме, сярод іншага, — «Маленькі чараўнік» Хаяа Мізаякі. Гэты фільм выйшаў на экраны ў 1989 г. і ніколі не дэманстраваўся за межамі Японіі. А «цьвіком» будуць эратычныя мульцікі, якія летась карысталіся ў Ансі гучным посьпехам.

У Брэтані, у гарадку **Сэн-Брыёк**, 6—8 чэрвеня пройдзе фэстываль «Арт-Рок». На тры дні горад на беразе Ля-Маншу ператворыцца ў экспэрымэнтальную лябараторыю авангарднага мастацтва. Фэстываль зьмешвае розныя музычныя (рок, рэп, фанк...) і мастацкія жанры: мультымэдыя, танец, цырк.

25 чэрвеня «пры двары караля Францыска», у замку **Амбуаз**, пачынаюцца прадстаўленьні. Усё лета —

кожную сераду і суботу — у гэтай гістарычнай рэзыдэнцыі французкіх каралёў будуць праходзіць маляўнічыя спэктаклі, гучаць музыка эпохі Адраджэньня, страляць фаервэркі, нагадваючы пра часы, калі краіна, залячыўшы раны Стогадовай вайны, аддалася атмасфэры раскошы і вечнага сьвята. Кароль Францыск запрасіў на службу літаратараў і мастакоў, у іх ліку й Леанарда да Вінчы, які дажыў у замку век. Спэктакль, прыдуманы і ўвасоблены жыхарамі Амбуаз, якія граюць сваіх продкаў з энтузіязмам аматараў, карыстаецца нязьменным посьпехам.

Чэхія

Міжнародны інстытут марыянэтак запрашае лялечныя тэатры і гледачоў з усяго сьвету на фэстываль лялек, які пройдзе ў **Празе** 2—8 чэрвеня. У праграме — паказы на любы густ: для дзяцей і дарослых, традыцыйныя і наватарскія. Журы прысудзіць узнагароды віртуозным лялькаводам, найлепшым спэктаклю, мастаку-лялечніку, сцэнару, музычнаму суправаджэньню і г.д.

Прага сустракае лета і Міжнародным фэстывалем сучаснага танцу. Ад 9 да 28 чэрвеня там будуць выступаць ансамблі і танцоры-салісты. Праграма разнастайная: танец як такі й тэатралізаваныя прадстаўленьні, танец у дыялёгу зь іншымі відамі мастацтва, з аўдыторыяй, з рознымі эпохамі.

Швэцыя

Рок-фэстываль у **Хультсфрэдзе**, які праходзіць 12—14 чэрвеня, — найбуйнейшая музычная падзея Швэцыі. Яго гасьцямі былі «Black Sabbath», Б'ёрк, Нік Кейв, «The Prodigy», «Garbage», Мэрылін Мэнсан… Сёлета ў праграме — пад сто сорак выканаўцаў. А гедлайнэрамі будзе гурт «Radiohead».

Як мы назавём абласных начальнікаў

«Я даўно чытаю Вашую газэту і паважаю Вашую пазыцыю. Але мне няўцям, чаму Вы кіраўнікоў абласных адміністрацыяў называеце губэрнатарамі. Ці ўжо Беларусь увайшла сваімі шасьцю абласьцямі ў «саюз»? Вы ж не «Беларусь сегодня», а «Наша Ніва»! Давайце лепей тады называць абласных начальнікаў ваяводамі, чым расейскім тытулам, што вяртае Беларусь у часы Паўночна-Заходняга краю. З павагай, сталы чытач «НН» Уладзіслаў Грабавы, tut.by». Такія самыя заўвагі нам робяць Алесь К. зь Вільні, Зінаіда Паўлючык зь Менску.

Сапраўды, слова на старонцы 13 №17 ад 12 траўня ўжытае нягожа. Тым больш што ў 2001 г. сама «НН» ужо зьвяртала ўвагу на недарэчнасьць такога каляніяльнага назову.

У Расеі ёсьць вобласьці й губэрнатары, ва Ўкраіне — вобласьці й кіраўнікі аблдзяржадміністрацый, у Польшчы — ваяводзтвы і ваяводы, у Літве — сянюніі й старосты, а ў гарадох — мэры. Нават афіцыйныя СМІ адчуваюць, што тытул «старшыня аблвыканкаму» гучыць анахранічна, дый сам «выканкам» ужо даўно не падпарадкоўваецца «савету народных дэпутатаў». От і калькуюць непрымальнае для беларусаў расейскае «губэрнатар», паціху прывучаючы да яго ўсіх. На пачатку 90-х у Беларусі апазыцыя прапаноўвала адміністрацыйную рэформу, пры якой вобласьці былі б падзеленыя на драбнейшыя паветы. У Вялікім Княстве паветамі кіравалі старосты. Карыстаючыся нагодай памылкі, задаём пытаньне нашым чытачам: а як, па-Вашаму, мусілі б называцца кіраўнікі мясцовых адміністрацый у краіне? Вобласьцяў, раёнаў, эвэнтуальных паветаў?

Рэдактар

СЛОЎНІЧАК

Койданаўскі слоўнічак

Апараніцца — рана ўстаць;
Аплянаваць — сплянаваць;
Базэрства — сэкс, любошчы, наагул марнатраўства;
Веснаваць — выяўляць полавую актыўнасьць (пра жывёл асабліва);
Выперадак — выскачка;
Выплываны — першыя грыбы, каласавікі;
Гнуцца як сьвіны татка — заціскацца, тушавацца;
Ездалы — паездкі;
Збэрсаць — раскідаць, парушыць парадак;
Згінуць, як маскалі пад Воршай — у дзяржаўных навучальных установах расказваюць пра швэдаў пад Палтавай;
Здрабантаваць — здратаваць;
Злосьнік — той, хто злуецца (на дзіця наравістае кажуць);
Зьбяглец — уцякач;
Зьяда — зьедлівы, грызотны чалавек;
Кулёма — капуха, марудлівая жанчына;
Лусьпіны — лушпайкі, шалупіньне;
Любовае (мяса) — нятлустае;
Панская лустачка — танюсенькая лустачка хлеба, бо мужыкі кроілі тоўстыя лусты, каб наесьціся;
Палыкаць — глытаць;
Раструханец — абы-як, у лахманы апрануты;
Рэўцень — той, хто плача;
Самасейка — хораша называюць у нашым народзе дзіця, народжанае бяз бацькі;
Сьлепанда — кажуць на таго, хто ня бачыць ці не знаходзіць нечага;
Сьлявенда — разява;
У дзьве рэдзі (складаць) — у дзьве столкі;
Усходы — прыступы болю, колікі. «Жывот усходамі баліць».

Склала Ганна Матусэвіч, Койданава

Ня час глядзець адным вокам

Рубрыка «Правым вокам — левым вокам», як я зразумеў, заклікана паказаць наяўнасьць уласнай, нацыянальнай палітычнай разнастайнасьці са сваімі фракцыямі, альянсамі, блёкамі і спэктрам. Гэта бачна з таго, што ўсе рознагалосьсі аб'ядныя рамкамі неасымілявaных. Калісьці яно так і будзе, але цяпер гэта заўчасна і гэта ілюзія. Па-за рамкамі ж застаюцца такія ж беларускія палітыкі, для якіх нашыя каштоўнасьці непрынцыповыя ці наагул варожыя. Адносна іх мы якраз мусім быць аб'яднанымі. А так адбываецца засяроджаньне на ўнутраных супярэчнасьцях, самаізаляцыя і варка ва ўласным соку. Гэтая праблема ў палітыцы перасьледуе нас даўно. Ня час, бо нам пакуль трэба замацаваць у Беларусі тое, у чым мы едныя.

Віталь Станішэўскі, Менск

Без сцэнару ня могуць

Нядаўна ў Слуцку ладзіўся конкурс на званьне найлепшага настаўніка году. Аўдыторыя сабралася даволі шматлюдная, вяла рэй настаўніца беларускай мовы і літаратуры з СШ №10. Але размаўляла яна... па-расейску. Ня дзіва, што і бальшыня выступоўцаў падладжвалася пад «тамаду». Калі прысутны на конкурсе журналіст з райгазэты заўважыў чыноўніцы з аддзелу адукацыі, што нягожа вядучай, якая выкладае беларускую мову, весьці рэй на чужой, тая адказала: «У яе не было пад рукамі падрыхтаванага сцэнару». Можна ўявіць узровень ведаў, павагі да роднай мовы той настаўніцы, калі без паперкі яна двух словаў ня можа зьвязаць па-беларуску. Невыпадкова пераможцай конкурсу стала настаўніца расейскай мовы і літаратуры з той жа 10-й школы, дзе ўжо два гады як няма ніводнай беларускамоўнай клясы, хоць раней яны былі.

Мне ж прыгадалася выказваньне Язэпа Лёсіка пра 1-ы зьезд настаўнікаў Меншчыны ў траўні 1917 г.: «Сыны народу, сьветачы вясковай цемры, адракліся ад бацькаўшчыны сваёй, адцураліся мовы бацькоў сваіх і на ўвесь сьвет выславілі, што яны ненавідзяць усё роднае, беларускае і рады і надалей цягнуць ярмо маскоўшчыны і нацыянальнага ўціску. Рабы былі і рабамі засталіся».

Міхась Кутнявецкі, Слуцак

Навагодні зварот ад Старшынькі

Да надыходу Новага году яшчэ задалёка, але хацелася б вось што сказаць.

Апошнімі дзевяцьцю гадамі мы вымушаныя (тут хто як, у залежнасьці ад трываласьці нэрвовай сыстэмы альбо ад ступені нажытага за гэтыя дні цынізму) глядзець або не глядзець навагодняе віншаваньне ад кіраўніка дзяржавы праз нацыянальную тэлевізію. Сустракаючы 2003 год, я цынічна падумаў: «Дзякуй Богу, што хоць гэты, а не які маскоўскі дзядзька». (Пасьля мінулага лета, мяркую, так думаў не адзін я!) Гімн у рэжыме «караоке» патапіў мяне ў роспачы.

Нараніцу да галавы прыйшло: як было б файна, каб вельмішаноўная старшынька Рады БНР спадарыня Івонка Сурвілла зьвянулася да суродзічаў празь відэазапіс! Гэта ж ня цяжка і, напэўна, ня дорага — вырабіць пяці-сямігхвілінныя відэакасэты ды распаўсюдзіць сярод тых, каму гэта трэба. Цяпер жа відэа амаль ва ўсіх ёсьць.

Перапрашаю за наіўнае пражэктарства. Ці яшчэ ня час парупіцца?

Siaržuk, Бабруйск

Міхалеўскаму — 80 гадоў

18 траўня нарадзіўся наш знакаміты зямляк, навуковец Серафін Міхалеўскі. Раньняе дзяцінства і маладосьць правёў ён у Росахах на Пружаншчыне. Там скончыў пачатковую школу, а ў 1939 г.— гімназію імя А.Міцкевіча ў Пружане. У 1941 г. вывезены з бацькамі ў Сібір. Там ён вучыўся ў Новасібірскім пэдінстытуце, мабілізаваўся ў Войска Польскае. Да Бэрліна дайшоў камандзірам батарэі 44-міліметровак. Тры разы быў цяжка паранены.

У мірны час працягнуў сваё навучаньне, працаваў у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве, у Інстытуце матэматычных вылічальных машынаў і Бібліятэцы Польскай Акадэміі навук. Усё сваё жыцьцё Серафін Міхалеўскі займаецца дасьледчай працай. Абсяг яго зацікаўленьняў — ад кітайскага іерагліфічнага пісьма да караімскіх кніжак і ёгі. Піша вершы, выдаў некалькі зборнікаў уласных афарызмаў па-польску. Ён зьбірае матэрыялы па гісторыі Пружаншчыны, перапісваецца з многімі культурнымі дзеячамі краіны. Хацелася б пажадаць Серафіну Міхалеўскаму далейшых творчых посьпехаў, плёну і здароўя.

Юрась Зялевіч, Пружана

ПАД СПОДАМ

Плястыкавыя патрыёты

Прайшло няшмат часу з тае пары, як дзьве праўрадавыя моладзевыя арганізацыі зьліліся ў адзіную структуру пад супольным назовам БРСМ. Не пасьпелі актывісты новага СэМу ачомацца пасьля пасьпешлівага аб'яднаньня, як «камсамольскія» правадыры і правадырчыкі распачалі актыўныя захады па вэрбоўцы ў свае шэрагі недасьведчаных юнакоў. Нельга было чакаць, што моладзь масава праявіць «грамадзянскую сьвядомасьць» і кінецца штурмаваць мясцовыя гаркамы БРСМ, усёй душой прагнучы займець адмысловы плястыкавы білет, які б пераканаўча сьведчыў пра твой патрыятызм і шчырую любоў да ўлады. Таму кіраўнікі мазырскага камітэту вышэйзгаданай арганізацыі адразу ўзялі быка за рогі і, карыстаючыся падтрымкай мясцовае вэртыкалі, пачалі ціснуць на гарадзкія навучальныя ўстановы. Схема дастаткова простая: адміністрацыі школ, атрымаўшы загад зьверху, ва ўльтыматыўнай форме заяўляюць вучням пра жыцьцёвую неабходнасьць запісацца ў БРСМ. Распавесьці, што гэта такое і з чым яго ядуць, абяцаюць пасьля ўступленьня. Маўляў, ты спачатку запішыся, а там усё патлумачаць.

Ня ў лепшым становішчы апынуліся і студэнты Мазырскага пэдуніверсытэту, адзінай у горадзе ВНУ. БРСМаўская навала не абышла й іх. Асабліва не пашэнціла тым, хто жыве ў студэнцкім інтэрнаце: за адмову далучыцца да агульнай масы «патрыётаў» з крывава-зялёнымі пасьведчаньнямі пагражаюць высяленьнем. Калі ўлічыць, што ў правілах пражываньня замацаваны суровы, амаль казарменны рэжым, дастаткова любога нязначнага парушэньня, каб страціць дах над галавой. То бок знайсьці падставу для выгнаньня непаслухмянага студэнта зусім няцяжка.

Агіткампанія праходзіць у найлепшых традыцыях савецкага часу. БРСМаўскія кіраўнікі пляскаюць у ладкі ад захапленьня, марачы пра прасоўваньне па службовай лесьвіцы за «рэзультацыўную работу з маладзёжжу». Хоць вынікі іхнай працы даволі сумнеўныя. БРСМ папаўняецца абсалютна безыдэйнай моладзьдзю, якая ў выпадку чаго й пальцам не варухне ў падтрымку сучаснага рэжыму.

Абурае нахабства, зь якім улада цісьне на моладзь. Вядома, што глум з чалавечае асобы — даволі тыповая для нашай рэчаіснасьці зьява. Але што замінае маладым людзям праігнараваць захады рэжыму, накіраваныя на ўсталяваньне татальнага кантролю над навучэнцамі, і не ісьці паслухмяна, як тыя авечкі, на БРСМаўскім павадку?

Янка Мазырскі

Палітычны расклад–2003 і пэрспэктывы–2006

Працяг са старонкі 7.

Дарма што прыход да ўлады апазыцыі найбольш імаверны акурат у выбарах «без Лукашэнкі», якраз такія выбары найхутчэй справакуюць імкненьне асобных плыняў у яе лягеры да выкананьня вузкапартыйнага мінімуму. Вырашыўшы, што галоўная мэта (скіданьне Лукашэнкі) ужо дасягнутая, апазыцыя можа адразу ж дэзінтэграваццa, спрабуючы прыстасавацца з максымальнай выгадай да новых палітычных рэаліяў. Замест барацьбы за ўладу — зоймуцца барацьбой за ўдзел у ёй. Максымум, што тады чакае Беларусь, — яшчэ больш звыродлівая версія расейскай ці ўкраінскай «кіраванай дэмакратыі».

Нарэшце, выбары з удзелам Лукашэнкі ў 2006 г. — найдраматычнейшы сцэнар разьвіцьця падзеяў. У ім ня будзе месца намэнклятуры: як паказалі выбары-2001, любы апаратчык, які насьмеліцца кінуць выклік галоўнаму і адзінаму кандыдату ад улады, аўтаматычна пераходзіць у шэраг былых. Удзел у выбарах адзінак, якія спрабуюць замяніць сваімі амбіцыямі адсутнасьць палітычных і арганізацыйных рэсурсаў, беспэрспэктыўны, і гэта, як і ўлетку 2001 г., хутчэй за ўсё скончыцца ўжо на стадыі рэгістрацыі кандыдатаў. А значыць, такія выбары найхутчэй пройдуць па мадэлі супрацьстаяньня «ўлада—апазыцыя». Барацьба пойдзе на выжываньне, а стаўкай будзе не прэзыдэнцкі фатэль, а лёс палітычнага рэжыму.

Ці абгрунтаваныя спадзевы, што выбары ў фармаце «Лукашэнка супраць апазыцыі» прывядуць да кардынальнай зьмены палітычнага раскладу ў краіне? У сацыяльным кантэксьце, што складаецца ў Беларусі, такое разьвіцьцё падзеяў цалкам магчыма. Аднак такая магчымасьць будзе рэалізаваная толькі тады, калі апанэнты ўлады канчаткова зразумеюць: выбары, што адбываюцца пад патранажам рэжыму, не выконваюць ролі рэкрутаваньня і зьмены палітычных элітаў, што пазбаўляе сэнсу вузкапартыйны ці пэрсанальны фармат удзелу ў іх.

Апазыцыя можа дзейсна выкарыстаць выбары паводле лукашэнкаўскіх правілаў толькі ў двух выпадках: калі падчас удзелу ў іх робіцца акцэнт на інфармацыйнай кампаніі дзеля пашырэньня ўплыву ў грамадзтве або калі выбары выкарыстоўваюцца як першапачатковая стадыя мабілізацыі грамадзтва дзеля актыўнага вулічнага палітычнага ўзьдзеяньня (як у Сэрбіі ў 2000 г.). Апанэнты ўладаў ня здолеюць дасягнуць ніводнай мэты кампаніі ў выпадку, калі іх удзел у выбарах будзе суправаджацца ўнутрыапазыцыйнай канкурэнцыяй. На жаль, кіраўніцтва асобных партыяў пакуль схіляецца акурат да такога фармату ўдзелу ў будучых парлямэнцкіх ды прэзыдэнцкіх выбарах. Гэта нясе пагрозу таго, што і наступныя выбарчыя кампаніі стануць чарговым практыкаваньнем правінцыйнага аўтарытарызму, якому апанэнты ўлады ня здолеюць супрацьстаяць. Альтэрнатывай такому самагубнаму для апазыцыі варыянту паводзінаў можа быць толькі рэанімацыя брэнду «дэмакратычная апазыцыя» як увасабленьня рэальнай альтэрнатывы аўтарытарнай уладзе.

Сяргей Астравец

Друкарка

«Фантамас» на мяне адназначна зрабіў уплыў. Днямі глядзеў крыху прызабытую стужку. Мне ўжо ў маленстве вельмі падабаўся журналіст. І ягоная бляндынка. Спрытны, моцны, файны журналіст. Які нічога не баіцца. Загарэлы і элеганцкі. Праўда, пінжакоў і гальштукаў, як ён, я апошнімі часамі амаль не нашу. Аддаю перавагу адзеньню і вопратцы крыху ў стылі military, крыху safari. Колеру хакі, розных адценьняў зелянковага, карацей green-mix. Хаця цьвідавыя рэчы ў ягоным стылі мне таксама па-ранейшаму падабаюцца.

Прыгожы несавецкі Парыж, Рым, Шатляндыя, замак сапраўдны! Люблю замкі. Гэта таксама, між іншым, зрабіла ўражаньне. Неўзабаве я на свае вочы ўбачыў файныя гарады і мястэчкі. Пастаяў насупраць Брандэнбурскай брамы, жыў у доме пад дахоўкай, сьцены якога зарасьлі плюшчом. І сёньня жыву ў нягоршым горадзе, найменей савецкім. Я стаў журналістам і ажаніўся з бляндынкай. Такія мае вынікі. Хоць нельга сказаць, што я ставіў сабе мэты ды імкнуўся іх дасягнуць. У жыцьці гэта выглядае трошкі інакш. Мэта, хутчэй нават мара, а дакладней — жаданьне, памкненьне сьпеліцца ў табе, брыняе, як зерне ў прадчуваньні прадвесьня, сяўбы.

Першую сваю газэту я выпусьціў у трэцяй ці чацьвертай клясе. Тыя два гады наша кляса месьцілася на першым паверсе, ад уваходу — налева, вокнамі ў двор. Гэта была старая нямецкая школа, якую калісьці наведвалі дзеткі будучых асаў люфтвафэ. Ад яе недалёка было да вайсковага аэрадрому. Пры адсутнасьці ў мяне цягі да публічнасьці я міжволі зрабіў першы крок менавіта ў гэтым напрамку. Першая мая газэта была насьценнай. Задума і ажыцьцяўленьне належалі асабіста мне. Ніхто не даручаў. Кляснай настаўніцы хапіла разуменьня і талерантнасьці, каб дазволіць мне прышпіліць да сьцяны нікім не плянаваны рукапісны орган.

Седзячы на ўроках, я, павярнуўшы галаву, мог разглядаць свой твор. Не выключаю, што настаўніца магла параіцца з маёй мамай — яна таксама працавала ў школе і яе кабінэт быў у правым крыле. Мама навучала нас старажытнай гісторыі: Бабілён, Эгіпэт, паветраныя сады Сэміраміды, Хамурапі, піраміда Хеопса, сьфінксы. Гліняныя таблічкі зь пісьмёнамі, папірусы. Нас перавялі на другі паверх у правае крыло. Глядзець на вуліцу, ды яшчэ зьверху, цікавей, чым на задворкі. Я працягваў рабіць сваю газэтку, настаўнік маляваньня ставіў мне пяцёркі.

Затым мы пераехалі. Новы дом, новая школа, кляса. Мая новая газэта была пра паштовыя маркі. Яна таксама вісела на сьцяне ў клясе, якая была выцягнутая, як кішка, парты стаялі толькі ў два шэрагі. У мястэчку не было самалётаў, у ім месьцілася калісьці сухаземная стаўка вэрмахту. На ўроках мы перасылалі адзін аднаму лісты з васковымі пячаткамі. Адбывалася гульня ў часы, калі яшчэ не існавала газэт. Але ў мястэчку выходзіла газэтка «Воздушный часовой», рэдакцыя — побач з школай. Сын рэдактара быў маім аднаклясьнікам. Запомніўся маленькім, прышчавым, шпэтным малдаванінам. Даволі га...істы, вельмі ганарыўся сваім бацькам, любіў выхваляцца. Даўся мне ў знакі. Я аднойчы яму з злосьцю сказаў: што мне твой бацька, я, можа, сам стану рэдактарам, калі захачу. Хоць я ім ужо быў.

Савецкі кінафільм «Журналіст» на мяне асаблівага ўражаньня не зрабіў. Глядзеў яго, седзячы на ровары, каб не стаяць. Лавак на ўсіх не хапала. Цёмны-цёмны і вельмі цёплы знівеньскі вечар, у чорным небе малочны прастакутнік экрану, жоўты конус дрыготкага сьвятла з кузуркамі, пылам і тытунёвым дымам. Рэзкія мэталёвыя галасы, якія далёка чутно ўначы. Неабмежаваныя сьценамі залі эмоцыі гледачоў. Асабліва калі журналісту пашанцавала трапіць некуды ў Стакгольм і ў закусачнай, жуючы стэйк, ён кідаў манэткі ў шчыліну аўтамата з стрыптызэркай.

Мы зноўку зьмянілі месца жыхарства. Горад зь іншай мовай, з гатычным касьцёлам з высознай званіцай. Вельмі падобны да Фары Вітаўта. Адрозна ад яе, ён захаваўся. Людзі захавалі. Назва мясцовай газэты гучала па-замежнаму, але ў перакладзе была звычайнай савецкай. Сваю газэтку я назваў інакш. Мы рабілі яе зь сябрам, які меў мянушку Белы. Дакладней, сталай назвы не было. Мне падабалася зьмяняць шыльды. «Стальное вымя» і ў гэткім жа духу. Мы сядалі ззаду і рабілі газэтку на ўроках, а затым пускалі яе па партах. Пазьней я даведаўся, што нашыя дзяўчаты адразу вырашылі: быць мне журналістам.

Хаця сам я тады ня ведаў, што мне болей падабаецца. Я слухаў музычныя праграмы радыё «Люксэмбург» і некаторыя іншыя. Я хацеў быць дыск-жакеем, як Майк. Зачытваць лісты з усяе Эўропы і ставіць «Far far away» і «Bohemian rhapsody». Гэта было немагчыма. Я пісаў свае, абавязкова сьмешныя тэксты і запісваў на магнітафонную стужку ўласныя радыёпраграмы, як і належыць — з музычнымі ўрыўкамі. І я заўсёды марыў аб друкарцы. Нічога іншага я не хацеў так, як толькі мець яе. Прачытаў з зайздрасьцю ў Агаты Крысьці пра ейную друкарку.

У войску быў выбар наконт сувязі — нэрваў арміі. Выбраў тэлеграф, каб навучыцца друкаваць. Цяжкія няўклюдныя гаргары з клявіятурай і шпуляй з папяровай стужкай пры баку. У падземным бункеры адбівалі радкі лічбаў, наклейваючы на тэлеграфныя бляшкі. Паведамлялі пра рух паветраных цэляў. Разам з прыяцелем пачалі выпускаць ротную насьценгазэту. Стаў друкавацца ў армейскай. Паступіў на журналістыку ва ўнівэрсытэт. Маленькі выкладчык з захапленьнем тлумачыў, што лінатып — нагэтулькі разумная машына, што, каб трапіла да афрыканскіх тубыльцаў, яны б конча маліліся ёй, як боству.

Купляў розныя газэты — ад югаслаўскіх «Борбы» і «Палітыкі», польскіх «Жыцця Варшавы», «Трыбуны Люду» да «Дэйлі Ўокер» і «Юманітэ-Дыманш». «Прафэсія: рэпарцёр» Антаніёні, якую мы праходзілі, уразіла. Часова меў антыкварны рэмінгтон. Пры канцы набыў югаслаўскую друкарку. Якая, на жаль, цяпер на пэнсіі. Напісаў дыплёмную пра няўлоўную газэту «Свабода». Марыць пра якую не выпадала. Адно ў далёкай вёсцы адшукаў дом, дзе яе маглі нават не надрукаваць — адбіць на шапірографе. На вайсковых зборах выпускаў па-беларуску ўзводны баявы лісток, пачак зь яго накладам таямніча зьнік з казармы.

Трапіў у горад, дзе калісьці, яшчэ ў каралеўскія часы выходзіла першая газэта. «Газэта Гродзеньска» на тагачаснай дзяржаўнай мове. Я прыглядаўся, прыслухоўваўся да старых муроў. З друкарняй таямніцаў не было, яна месьцілася за высокім, сёньня турэмным мурам. Саму газэту ўявіць было цяжэй. Знаёмства з навінамі, чытаньне сьвежага нумару — з гэтым, наадварот, прасьцей. Я ўяўляў магната з газэтным паасобнікам за ранішняй кавай, газэту ў аўстэрыі, абмеркаваньне сьвецкіх і палітычных навінаў у салёне за картамі. Сам кароль даваў парады рэдактару — пра што лепей не пісаць.

У мяне ў суседнім пакоі сядзеў сапраўдны цэнзар. Яны зьмяняліся, але мелі аднолькавае аблічча бульдогаў. Жыцьцё і праца складаліся з абмежаваньняў. Часьцей негалосных. Хоць самі цэнзары мелі зашмальцаваныя грасбухі зь пералікам забаронаў — пра што не пісаць. Бяз цэнзарскай пячаткі ніякі рэдактар ня здолеў бы падпісаць да друку нумар. Ніякі друкар ня ўзяўся б яго матрыцаваць і друкаваць. Што там каралеўскія часы! Газэта ганарліва выводзіла свой радавод ад «Освобождённого Белостока». У друкарні па-ранейшаму надзейна працавала машына з даваеннай эпохі, зь лічбамі выпуску, здаецца, «1935».

Каралеўская газэта, ды «Мужыцкая праўда», ды «Свабода» — думкі аб іх выклікалі рамантычны настрой. Неспадзявана надышоў час Пагоні і бел-чырвона-белага сьцяга. І рашэньня зьмяніць газэтную шыльду. І мастак намаляваў яе, прыбраўшы савецкі ордэн. Атрымалася ў стылі брытанскіх штодзённікаў. А-я-яй, залямантаваў вялікі начальнік, «Праўда» — вышэй за ўсё, безь яе нельга! А менавіта гэтае здэвальванае слова з шыльды хацелі выкінуць, вярнуўшы назву каралеўскіх часоў. Не атрымалася. А начальнік потым загінуў. Абараніўшы «праўду».

Час «Свабоды», «Пагоні» з конным рыцарам ды іншых маіх газэт. Усе яны ў архіве, усе забароненыя. Мой газэтны канвэер спынены. Свабода слова зноўку стала падазроным словазлучэньнем. Засталася адно нібы-«праўда». Ты марыў стаць журналістам, каб увесь «Парыж» зачытваўся тваімі паведамленьнямі, ты марыў аб газэтным канвэеры абавязкова з каляровымі выданьнямі, бяз чорна-белых і шэрых. Вазьмі паглядзі яшчэ раз «Фантамаса».

Газэта Тызэнгаўза

Сябры Гарадзенскай філіі Беларускай асацыяцыі журналістаў адзначылі свой Дзень друку. 23 траўня 1776 г. у Горадні пачало выдавацца першае друкаванае выданьне на тэрыторыі Беларусі — «Gazeta Grodzieńska».

Выходзіла яна па-польску раз на тыдзень (у чацьвер) на дзьвюх старонках памерам 20x15 см. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі нават даслаў з нагоды газэты незадаволенае пісьмо тагачаснаму гарадзенскаму старосту Антонію Тызэнгаўзу. Заўважыў, што трэба пазьбягаць «дрэннага пісаньня», і рэкамэндаваў вызначыць асобу, «якая мела б абавязак складаць кожны нумар і потым паказваць газэту Вяльможнаму Пану перад друкам». Бюлетэнь пераказваў палітычныя навіны з усяго сьвету, паведамляў пра жыцьцё каралеўскага двара ў Варшаве, зьмяшчаў урадавыя аб'явы, адлюстроўваў мясцовыя падзеі.

Пра гэта, а таксама пра справы журналісцкія згадвалі 23 траўня на паседжаньні Павал Мажэйка, Анджэй Пісальнік, Мікола Маркевіч, Валеры Задаля, Ніна Палуцкая, Сяргей Астраўцоў.

Антон Лабовіч, Горадня

Ні абвестак, ні жартаў...

...ня будзе, калі Вы не падпішацеся на «Нашу Ніву». бо «Наша Ніва» — незалежная газэта, Ваша газэта — выходзіць толькі на Вашы грошы. Кошт падпіскі не павялічыўся. Гэта 2043 рублі на месяц звыклым чынам і 1360 рублёў пры падпісцы на шапік «Белсаюздруку» для менчукоў. Сярод падпісчыкаў на 2-е паўгодзьдзе праводзіцца розыгрыш каштоўных прызоў. Галоўны прыз — падарожжа на Балтыйскае мора. Дасылайце копіі сваіх падпісных абанэмэнтаў (на ўсё паўгодзьдзе). Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. Апошні дзень падпіскі — **20 чэрвеня**. Розыгрыш прызоў — **1 ліпеня**.

Падпісны індэкс **63125**. Дык падпісвайся!

Адказы на пытаньні крыжаванкі, зьмешчанай у №19.

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 9. Парадокс. 10. Курапаты. 11. Партыя. 12. Пуп. 13. Гідрыд. 14. Парк. 15. Барытон. 17. Кіно. 18. Нафталін. 20. Рызыкант. 22. Пазытрон. 25. Гарэлава. 27. Шарм. 29. Сусьвет. 30. Мыта. 31. Уганда. 33. Дар. 34. Бэнзын. 35. Прысмакі. 36. Эстэтыка.

ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1. «Панарама». 2. «Тартак». 3. Доля. 4. Асьпірын. 5. Скіпэтар. 6. Круг. 7. Сподак. 8. Стрыхнін. 15. «Беларус». 16. Назарэт. 19. Тры. 21. Кол. 23. Авангард. 24. Наседкін. 25. Гувэрнэр. 26. Вытрымка. 30. Манэта. 32. Апал. 34. Бэта.

СТАРАЖЫТНЫ ГУМАР

* * *

У антычнай Грэцыі Сакрат быў вядомы як чалавек, што вельмі паважае веды, навуку. Аднойчы спаткаўся яму знаёмы і сказаў:

— Сакрат, маю паведаміць нешта пра твайго сябра.

— Пачакай, — адказвае Сакрат, — перш ты мусіш прайсьці Трайны фільтравальны тэст.

— Трайны фільтравальны тэст?...

— Так, — працягвае Сакрат. — Першы фільтар завецца Ісьціна. Ці ты абсалютна ўпэўнены, што тваё паведамленьне ёсьць ісьціна?

— Не, — адказвае знаёмы. — Я толькі чуў пра гэта і...

— Дык ты дакладна ня ведаеш, ці гэта ісьціна, ці не. Тады возьмем другі фільтар пад назваю Дабро. Ці ёсьць тое, што ты хочаш распавесьці пра майго сябра, добрым?

— Не, наадварот...

— Ага, — працягвае Сакрат, — ты хочаш сказаць мне нешта благое пра яго, але ня ўпэўнены, ці праўда гэта. Трэці фільтар завецца Карыснасьць. Тое, што ты зьбіраешся мне сказаць, зьяўляецца карысным?

— Ды не.

— Ну і нашто мне тады гэта ведаць? — падсумаваў Сакрат.

Гэта паказвае, чаму Сакрат быў гэткім выдатным філёзафам. Гэта паказвае таксама, чаму Сакрат гэтак ніколі і не даведаўся, што ягоная жонка здраджвае яму з найбліжэйшым сябрам.

* * *

Аднойчы да мудрага цара Салямона прыйшлі дзьве кабеты, цягнучы з сабою хлопца. Адна кажа: «Вось гэты маладзён абяцаў ажаніцца з маёй дачкою». Другая: «Не! Ён абяцаў маёй дачцэ!»

Яны пачалі сварыцца, цягнучы хлопца кожная да сябе, аж пакуль цар не запатрабаваў цішыні: «Прынясеце мне найвастрэйшы меч, і я расьсяку яго на дзьве паловы. Кожная з вас атрымае сваё». — «Так, гэта будзе справядліва», — кажа адна з жанчын. Але другая папрасіла: «О, Ваша Наймудрэйшая Мосьць! Ня дайце праліцца нявіннай крыві! Хай бярэ яго дачка той жанчыны».

Мудры цар Салямон не вагаўся ні хвіліны. «Хлопец павінен ажаніцца з дачкою першай кабеты!» — абвесьціў ён. «Але ж гэтая жанчына пагадзілася, каб яго пасеклі на кавалкі!» — закрычалі прыдворныя.

«Дакладна, — пагадзіўся мудры Салямон. — Гэта даказвае, што яна — выдатная цешча!»

Пераклаў з эспэранта Зьміцер Лапцёнак

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

● ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ ●

ЛЕТНІК

Запрашаем летам у найлепшы археалягічны летнік «Палятыда». Незабыўны адпачынак. Т.: 8-029-646-90-99. E-mail: palatida@mail.ru

Шукаю паважанае таварыства на вандроўку ў канцы чэрвеня па паўночна-заходняй Беларусі. Т.: 8-029-626-59-96

Маладафронтаўцы! Заяўкі на ліпеньскі летнік можна дасылаць у Менск праз www.mfront.org

ВІТАНЬНІ

Любую жонку і ласкавую матулю Галінку Кулікоўскую віншуем з Днём народзінаў! Зычым моцнага здароўя і выдатнага настрою! Ты ў нас самая лепшая! Сяргей, Якімка і Кастусік

Зьміцер Дашкевіч, ты сапраўдны маладафронтавец! 14 траўня — гэта было крута. Горад наш! МФ

КАНТАКТЫ

Мянчук (41/170/55) з в/а, бяз шк/зв, пазнаёмлюся з жанчынай бяз шк/зв для стварэньня беларускамоўнай сям'і. А/с 6, 220012, Менск

Навуковая канфэрэнцыя БГТ «Праблемы тэрміналёгіі беларускай навукі» адбудзецца 31.05—1.06 на гістфаку БДУ

30 траўня, у чацьвертую гадавіну катастрофы на Нямізе, а 19-й адбудзецца імша ў Чырвоным касьцёле — у памяць аб ахвярах. Калі ласка, прыходзьце крыху раней

Бацькі, якія хочуць павесьці сваіх дзяцей у беларускамоўную пачатковую клясу, тэлефануйце. Т.: 288-23-52 (з 12.00 да 18.00), 288-68-91 (Ігар), 215-84-09 (Алесь, пасьля 20.00)

Кожны дзень у 17.30 і кожную нядзелю а 15-й у Горадні ў Фарным касьцёле адбываецца беларуская імша

Уніяцкае набажэнства ў Горадні — кожную нядзелю а 10.00 на вул.Кірава, 32а (каля Кірава, 10)

Увага! Месца збору Менскага Маладога Фронту мяняецца. Т.: 239-65-26 (Павал, Аляксей), 232-54-58 (Зьміцер)

Ці плянуе «NRM» наведаць Слуцак? Піт, мы цябе чакаем на Радзіме. Случчакі

Стварайма беларускі сайт заўзятараў «AC Milan». Найлепшы клюб у сьвеце павінен мець найлепшы сайт у сьвеце. Дзе вы, вэб-майстры-аднадумцы? Ужо даўно трэба нешта рабіць. E-mail: baradziedd@tut.by

Запрашаем да супрацоўніцтва. Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі — БНФ. А/с 15, Горадня, 230006

Адкрыў спосаб дзяленьня на нуль. Аматараў матэматыкі прашу адгукнуцца. Буду рады абмяняцца думкамі. Т.: 245-57-62

КНІГІ, МУЗЫКА

Уся гарадзенская сцэна, касэты і кампакты беларускіх гуртоў на сайце http://michelson.by.ru. Замова ў Горадні: а/с 62, 230003, Горадня-3. Т.: 8-029-640-46-36, пэйдж. (у Горадні): 73-00-00, аб.127302

Беларускія кнігі, часопісы, аўдыёкасэты, CD у Наваполацку. Т.: 52-93-57

Навіны Гарадзенскай музыкі, касэты і кампакты, кашулькі і кніжкі. Гэта http://michelson.by.ru. Замаўляй і чытай! У Горадні: а/с 62, Горадня-3, 230003. Пэйдж. 273-00-00, аб. 127302

Беларускія кнігі, CD, аўдыё і відэа можна набыць у Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзеля да 13.00

Куплю кнігу Дж.Бэрдшоў «Эканоміка. Ч.1. Мікраэканоміка» (беларускі варыянт). Т.: (01515) 21-3-43

Pradam «Narodny Albom». Т. (у Магілёве): 45-54-50

ПРАДАМ

Якасныя жаночыя туфлі 36-га памеру, б/к, чорныя, закрытыя, абцас 9 см. Нядорага. Т.: 8-029-689-87-65

Новую пральную машыну «МАРА СМ-25». Т.: 236-43-08 (вечар), 8-029-636-43-08. Вольга

Клей для пліткі, кіт, тынкоўку, рубэройд. Т.: 224-75-21, 8-029-756-45-78

● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ ●

Ажэшка Э. Над Нёманам: Раман / Пераклад з польск., камэнт. А.Бутэвіча; Прадм. У.Казьберука. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 444 с.: іл.

У рамане, напісаным Элізай Ажэшкай у 1887 г. у Горадні, гучыць водгульле паўстаньня Каліноўскага. На беларускую мову твор перакладзены ўпершыню. Цана выданьня — 2850 руб.

Арлоў У. Ордэн Белай Мышы: Аповесьці, апавяданьні. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 301 с.: іл. Наклад — 2500 ас.

Зборнічак прозы Ўладзімера Арлова склалі новыя й ужо вядомыя чытачу творы з цыклу «Полацкія апавяданьні», а таксама «Сібірская аповесьць», «Маша й мядзьведзі», «Краявід з мэнтолавым пахам», «Genius loci» ды вострасюжэтны «Ордэн Белай Мышы», паводле якога названая кніга. У афармленьні выданьня скарыстаныя працы Аляксея Марачкіна.

Выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусі 24 скліканьня: Факты й камэнтары / Аўт.-склад. А.Бяляцкі, В.Стэфановіч, У.Лабковіч. — Менск, 2003. — 140 с.: іл. Наклад — 299 ас.

Гэтае выданьне створанае на падставе матэрыялаў, што сабралі назіральнікі з рэгіянальных аддзяленьняў Праваабарончага цэнтру «Вясна».

Жывапіс барока Беларусі: Альбом / Аўт.-склад. Н.Высоцкая. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя, 2003. — 304 с.: іл.

Выдатна афармленае вялікафарматнае выданьне знаёміць з творамі беларускага барочнага жывапісу — карцінамі ды іконамі, што захоўваюцца сёньня ў музэях Беларусі й іншых краінаў. Як стылістычны кірунак барока праіснавала на беларускіх землях з канца XVI да канца XVIII ст. і сталася адным з найбольш яркіх этапаў у разьвіцьці нацыянальнага жывапісу. Менавіта з пэрыядам барока зьвязанае фармаваньне самабытнай школы беларускага іканапісу. На кожны з пададзеных у кнізе твораў прыводзяцца каталёжныя зьвесткі, дзе-нідзе з кароткімі гісторыка-мастацтвазнаўчымі заўвагамі. Выданьне зьмяшчае слоўнік жывапісцаў XVI—XVIII ст., слоўнік тэрмінаў ды сьпіс выставаў старажытнага мастацтва Беларусі 1919—2003 г. Прыдбаць альбом можна ў «Цэнтральнай кнігарні», «Сьветачы», «Кнігарні пісьменьніка», «Акадэмкнізе». Цана — 50 тыс. руб.

Запісы-26 / Беларускі інстытут навукі й мастацтва. — New York—Менск, 2003.

БІНіМаўскі пэрыёдык існуе ўжо болей за паўстагодзьдзя. З гэтае нагоды 26-ы выпуск выданьня друкуе поўны зьмест «Запісаў» за 1955—2001 г., з дапамогай якога можна прасачыць кірункі дзейнасьці Інстытуту і праблематыку ўзьнятых за 50 гадоў беларусазнаўчых пытаньняў. У рубрыцы «Тэксты» публікуюцца дасьледчыя матэрыялы Віркінні Шыманец, прысьвечаныя драматургіі Францішка Аляхновіча, ды артыкул Лявона Юрэвіча «Сьмерць у люстэрку беларускай літаратуры». Гістарычна-аналітычная частка часопісу пададзеная публікацыямі пра беларускае школьніцтва на Віленшчыне (Анатоль Трафімчык), дзейнасьць Лява Акіншэвіча па вывучэньні беларускага казацтва (Генадзь Сагановіч) і інш. У рубрыцы «Літаратура» — апавяданьне Янкі Юхнаўца «Летні адпачынак».

Синчук И. Клады Беларуси: Законодательство и практика. — Менск: РУП «Менсктыпраект», 2003. — 56 с.

Аўтар брашуры разглядае прававую базу ды існае ў краіне становішча з паступленьнем скарбаў на дзяржаўнае захаваньне. Асобныя старонкі выданьня прысьвечаныя «юрыдычна-прававой» гісторыі скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі ў XIX—XX ст. У дадатку зьмяшчаюцца вытрымкі з асноўных заканадаўчых дакумэнтаў, датычных адносінаў паміж шчасьлівым скарбазнаходнікам ды прадстаўнікамі дзяржавы. Наклад выданьня — 500 ас.

Шульман А. Остров Релеса. Віцебск: УПП «Віцебская абласная друкарня», 2003. — 96 с. Наклад 116 ас.

Нарысы рэдактара віцебскага часопісу «Мишпоха» выдадзеныя да 90-гадовага юбілею найстарэйшага габрэйскага паэта Беларусі Гірша Рэлеса. Там зьмешчаныя таксама вершы Г.Рэлеса ў перакладах Р.Барадуліна, Д.Сімановіча і інш. У кнізе багата здымкаў і памылак друку. Паэт Генах Шведзік названы «Генрыхам» і г.д.

Ryszard Radzik. Kim są Białorusini? – Toruń: Wydawnictwo Adam Marszałek, 2002. – 244 s.

Люблінскі прафэсар-беларусіст сабраў пад адной (чырвона-зялёнай з арнамэнтам) вокладкай тэксты, пісаныя ў 1995—2002 г. Пераважна яны датычаць Беларусі, беларускасьці й беларусаў у XX ст. і разьбіраюць праблемы беларускай нацыянальнай і дзяржаўнай сьвядомасьці, культурных арыентацый.

Тацяна Вабішчэвіч

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Сяргей Ёрш
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3514.

Нумар падпісаны ў друк 28.05.2003.

Замова № 2752.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а